Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 24 (4519) 26 чэрвеня 2009 г.

У нумары:

Пасланнікі міру

У свеце некалькі сярэдніх школ маюць ганаровае званне «Школа Міру». Ёсць такая і ў Мінску!

Стар. 3

Вызвалялі не толькі беларускую зямлю

Творчыя лёсы пісьменнікаў-франтавікоў з Гомельшчыны сталі вызначальнымі для літаратуры.

Стар. 13

Такі народ — нераможны

Партызанская мастацкая самадзейнасць — гістарычная з'ява, якой таксама варта ганарыцца.

Стар. 14

Выклік, агонь і задор

Яшчэ адзін вайной забіты паэтычны талент.

Стар. 15

І мастацтва ваявала

Партызанскія мастакі стварылі цэлыя летапісы подзвігаў народных мсціўцаў.

Стар. 16

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

З ліпеня — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Фота Віктара Кавалёва

Квітней, мой край!

Дзень вызвалення ў памяці людзей
Не знікне, не пагасне аніколі.
Мы адзначаем сёння юбілей
У сэрцах нашых
з невыказным болем.

Стаіць ля абеліска ветэран,
Аб перажытым сведчаць яго скроні,
На твары — боль яго душэўных ран,
Што праступае сцішана сягоння.

А недзе ў парку музыка гучыць,
У вальсе кружаць маладыя пары,
Ім выпала часінай вольнай жыць
Без гора, жахаў і вайны пажараў.

Спявае песню векавечны гай,
Нясе у далеч тую песню рэха.
Жыві без гора, мой дзівосны край,
Праменься і квітней дзіцячым смехам!

Мікола СТАРЧАНКА

Пункцірам

● У Віцебскай абласной бібліятэцы імя Леніна адкрылася мастацкая выстаўка "Салдат Перамогі", прысвечаная Васілю Быкаву. У бібліятэцы прадстаўлены творы ўдзельнікаў Быкаўскага пленэру, які раз на два гады праходзіць на радзіме пісьменніка ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна. Гэта карціны як вядомых мастакоў, так і маладых творцаў. Адкрыццё выставы прайшло ў межах літаратурнага вечара, прысвечанага 85-годдзю з дня нараджэння Васіля Уладзіміравіча.

● Замак у Лідзе будзе адбудаваны. Згодна з Дзяржаўнай праграмай узнаўлення помнікаў гісторыі і архітэктуры, ён павінен прыняць выгляд абарончай пабудовы XV стагоддзя. Замак быў пабудаваны ў 1330-х гадах па загадзе князя Гедыміна для абароны ад крыжакоў. Падчас Паўночнай вайны ў 1702 годзе шведы ўзарвалі яго вежы. З таго часу пабудова пачала занепадаць. У адноўленым замку мяркуецца стварыць музей сярэдневяковых традыцый і мастацтва. Таксама будуць узведзены дом старосты, казармы, кузня, калодзежы.

● У Віцебску прайшоў першы этап XIX Міжнародных Шагалаўскіх дзён. Была адкрыта выстава мастака з Масквы Барыса Бамштэйна "Сцэны і персанажы да твораў М. В. Гогаля. Тэатральныя эскізы і графіка". Тут таксама былі выстаўлены ілюстрацыі Марка Шагала да "Мёртвых душаў" Гогаля. Пасля распачаліся чытанні. З дакладамі выступалі старшыня Шагалаўскага камітэта Давід Сімановіч, дырэктар Шагалаўскага музея ў Віцебску Людміла Хмяльніцкая і яго супрацоўніца Юлія Сцепанец. Спецыяльным госцем быў Алівер Лодэ з Таліна, які распавёў пра Шагала ў Нарве. Затым адбылося грамадскае абмеркаванне праекта па стварэнні на вуліцы Пакроўскай і яе ваколіцах квартала Марка Шагала. Удзел у абмеркаванні прыняў і аўтар праекта Леанід Левін. Другі этап Шагалаўскіх дзён чакаецца ў ліпені.

● Рэгіянальны фестываль-конкурс "Адна зямля" сёлета пройдзе ў Смаргоні. Прымеркаваны ён да Дня моладзі. Пра гэта паведаміў адзін з сузаснавальнікаў конкурсу рэдактар "Рэгіянальнай газеты" Аляксандр Манцэвіч. Удзельнікі "Адной зямлі" — гэта выканаўцы з Маладзечанскага, Вілейскага, Смаргонскага, Мядзельскага, Астравецкага, Ашмянскага, Валожынскага раёнаў ва ўзросце да 30 гадоў. Конкурс існуе адзінаццаць гадоў і ладзіцца сумесна з аддзеламі культуры райвыканкамаў пералічаных раёнаў. Мерапрыемства носіць закрыты характар.

● Свет пабачыла кніга ўдзельніка гурта "Стары Ольса" Зміцера Сасноўскага пад назвай "Гісторыя беларускіх музычных уплываў". Кніга прысвечана ўплыву беларускай музыкі на музычнае мастацтва іншых краін, а таксама яе прысутнасці ў свеце. Разглядаецца творчасць кампазітараў беларускага паходжання за мяжой і іх еўрапейскае прызнанне, уключэнне беларускіх народных мелодый у творы вядомых кампазітараў. Кніга ўтрымлівае багаты ілюстрацыйны матэрыял.

● У пасольстве Беларусі ў Аргенціне прайшла сустрэча з прадстаўнікамі беларускай дыяспары з гарадоў Берыса і Сан-Марцін. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні рэалізацыі ў 2009 годзе ў правінцыі Буэнас-Айрэс мерапрыемстваў, прысвечаных Году роднай зямлі і Дню Незалежнасці Беларусі. Вырашалася таксама магчымасць правядзення ў аргенцінскай сталіцы канферэнцыі па праблеме беларускай дыяспары ў гэтай краіне.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Наступны нумар газеты "Літаратура і мастацтва" выйдзе 10 ліпеня 2009 года.

Не горш, як у Грэцыі

Выстаўкі

У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага адкрылася унікальная выстава абразоў. Гэта персанальная выстава ўдзельніцы народнага аматарскага аб'яднання майстроў народнай творчасці "Гарадзенскі каларыт" Галіны Курносавай. Майстар — адна з нямногіх у Беларусі, хто працуе ў тэхніцы залатнога правага шыцця. Гэтая тэхніка вядомая з часоў старажытнасці. Яна існавала ў Грэцыі і Візантыі, у Сярэдняй Азіі і Заходняй Еўропе.

Выставы Галіны Курносавай праходзілі не толькі ў Гродне, але і за межамі краіны. І ўсюды мелі станоўчыя водгукі.

Галіна Пятроўна прымае ўдзел у многіх духоўных выстаўках, якія прысвячаюцца праваслаўным святам. Наведнікаў уражвае найперш светапоглядам — чысцінёй, дабрынёй, адкрытасцю, любоўю да бліжняга. Гэта чалавек, які не толькі верыць у Бога, але і гэтую веру ўкладае ў працы. Усе іконы Галіны Пятроўны — вышытыя па тканіне. На працягу дзесяці гадоў, што займаецца вышыўкай, майстар засвоіла розныя тэхнікі, выкарыстоўвае розныя матэрыялы: шматколерныя ніткі, бісер, жэмчуг, каштоўныя камяні. І ў кожнай рукатворнай карціне — нешта адметнае, таму кожная з іх — унікальная. Але самае галоўнае — за гады сваёй творчасці Галіна Пятроўна засвоіла тэхніку вельмі складанага залатнога правага шыцця — залатымі і сярэбранымі ніткамі. Яно выкарыстоўваецца, каб падкрэсліць контуры — у дадзеным выпадку святасць адлюстраваных на карціне выяў.

Галіна Пятроўна вышыла многія вядомыя на Беларусі абразы Прасвятой Багародзіцы. Так, Маці Божая Каложская лічылася цудатворнаю і захоўвалася ў гродзенскай Каложскай царкве. На сёння арыгінал Каложскай іконы страчаны, але вышываная копія захоўваецца ў храме. На выставе Маці Божая Вострабрамская, Маці Божая Замілаванне, Жыровіцкая, іншыя — усе яны носяць адбітак глыбокапсіхалагічнага падыходу аўтара да ўвасаблення рэлігійнай тэмы. Менавіта з прыняццем хрысціянства на нашы землі прыйшоў унікальны від сакральнага мастацтва — ікона, у якім складваліся адпаведныя каноны. На прыкладзе ікон Галіны Курносавай можна прасачыць, як і ў якія часы пранікалі гэтыя каноны ў наша жыццё, з улікам якіх асаблівасцей пісаліся абразы, якія з іх першымі з'явіліся ў Беларусі, якія існуюць і найбольш шануюцца цяпер.

Калекцыя налічвае 25 абразоў, яна з'яўляецца сапраўдным шэдэўрам народнага мастацтва Беларусі.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: абразы Г. Курносавай; Маці Божая Каложская.

Фота аўтара

Толькі факт

Ад удзячных нашчадкаў

У Полацку будзе адноўлены помнік героям Айчыннай вайны 1812 года. Такое рашэнне прыняў урад Саюзнай дзяржавы.

Цяпер ужо гістарычны помнік героям Айчыннай вайны 1812 года ў Полацку быў разбураны ў гады Другой сусветнай вайны. Аднак засталіся сведчанні, як ён выглядаў, і цяпер пры падтрымцы Саюзнай дзяржавы вядзецца праца па яго ўзнаўленні. Менавіта на старажытнай Полацкай зямлі французская армія атрымала першае сур'ёзнае паражэнне.

Дарэчы, у Смаргоні таксама пры падтрымцы Саюзнай дзяржавы будзе ўзведзены мемарыяльны комплекс — на лініі процістаяння расійскай і кайзераўскай армій у 1915—1917 гг. падчас Першай сусветнай вайны.

Абодва праекты яднае агульная мэта — увекавечанне слаўных старонак нашай мінуўшчыны, дзе лёсы людзей былі падпарадкаваны святой ідэі абароны сваёй Айчыны.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

За падзеяй

Перамог...Напалеон Орда

На VI Міжнародным конкурсе «Мастацтва кнігі» дзяржаў-удзельніц СНД, які праходзіў у Маскве, Беларусь атрымала найбольшую колькасць узнагарод — 7 дыпломаў.

Усяго на конкурс было прадстаўлена 140 выданняў з 9 краін СНД — Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Украіны, а таксама з Эстоніі.

Кансультант Міністэрства інфармацыі Беларусі Валерый Рагалевіч падкрэсліў: "*Конкурс набыў свае характэрныя рысы, на ім паказваецца самае лепшае з выдадзенага апошнім часам. Тут важна і тэма, і мастацкае афармленне. Кніга на такім конкурсе, каб перамагчы, павінна стаць падзеяй, адкрыць новыя грані ў працэсе працы нашых сучаснікаў над друкаваным фаліянтам. І выдатна, што праца беларускіх кнігавыдаўцоў належным чынам ацэнена*".

Конкурс праходзіў па васьмі асноўных намінацыях: «Гран-пры», «Наш сучаснік», «Арткніга», «Мая краіна», «Кніга — для дзяцей і юнацтва», «Надрукавана ў Садружнасці», «Садружнасць», «Перамога».

Выдаўцы Беларусі прадставілі кнігі па ўсіх намінацыях (да пяці кніг у кожнай). 32 кнігі палепшанай якасці, 19 з якіх выдадзены дзяржаўнымі выдавецтвамі, належным чынам ацаніла прафесійнае журы. У выніку ў нашай скарбонцы — Гран-пры за кнігу «Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны» (выдавецтва «Мастацкая літаратура», дызайн Вячаслава Паўлаўца). Мы маем таксама тры дыпломы I ступені: «Православная икона России, Украины, Беларуси» (выдавецтва «Беларуская Праваслаўная Царква», дызайн Ігара Рэзько), «Голоса ушедших деревень» (выдавецкі дом «Беларуская навука», дызайн Аляксандра Кулажанкі), «Чароўны свет. З беларускіх міфаў, паданняў і казак» (выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», мастак Валерый Славук); два дыпломы II ступені: Ю. Фамін «Человек из легенды» (выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», дызайн Сяргея Саркісава), Г. Карцаў "Беловежская пуща" — выдавецтва "Мастацкая літаратура", надрукавана ААТ "Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа"; дыплом III ступені — за кнігу «Отче наш. Молитва Господня» (выдавецтва «Беларуская Праваслаўная Царква», надрукавана ў РУП "Мінская фабрыка каляровага друку"). Дарэчы, дзве апошнія згаданыя кнігі атрымалі дыпломы ў так званай паліграфічнай намінацыі. На конкурсе іх традыцыйна дзве. Так што мы маем чым ганарыцца: і змест, і паліграфічнае выкананне беларускіх кніг на належным — вельмі высокім узроўні.

І. Т.

Персанажы — быццам жывыя

Прэзентацыі

Прэм'ера кнігі беларускіх міфаў, паданняў і казак "Чароўны свет", якая выйшла ў 2008 годзе ў выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі", адбылася ў літаратурна-мастацкай гасцёўні "На ростанях" дзіцячай бібліятэкі № 1 г. Мінска.

У госці да чытачоў бібліятэкі завітаў адзін са стваральнікаў кнігі, вядомы мастак Валерый Славук. Удзельнікі мерапрыемства з цікавасцю слухалі расповед мастака аб працы над кнігай, задавалі яму пытанні аб творчасці. У бібліятэку Валерый Пятровіч прыйшоў не з пустымі рукамі — ён прынёс эскізы сваіх малюнкаў, якія ствараліся да кнігі. Атрымаўся невялікі вернісаж. В. Славук вобразна і цікава расказаў дзецям пра сваё бачанне персанажаў беларускіх міфаў і казак, адказаў на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сустрэчы.

Казачная тэматыка кнігі, цудоўныя, быццам бы жывыя, персанажы міфаў і паданняў, створаныя мастаком, добрае паліграфічнае выкананне — усё гэта зрабіла кнігу сапраўдным творам мастацтва.

Святлана ЛАТОШ,
вядучы бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі № 1 г. Мінска

На службе Айчыне

Навідавоку

"Сабакі на службе Айчыне" — так называецца сумесны праект, распрацаваны Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Кіналагічным цэнтрам Узброеных Сіл Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Сорак тысяч год сабака жыве побач з чалавекам. У ваенных мэтах сабаку выкарыстоўвалі яшчэ ў старажытнасці як пільнага вартаўніка і абаронцу.

Да Вялікай Айчыннай вайны сабак рыхтавалі па наступных відах служб: ездавыя сабакі, сабакі-мінашукальнікі, сабакі сувязі, сабакі-знішчальнікі танкаў, санітарныя сабакі, сабакі разведвальнай службы, вартавыя сабакі, сабакі каравульнай службы і інш. Вядома, што за вайну ездавыя сабакі вывезлі з поля бою каля 700 тысяч параненых і падвезлі на перадавую больш як 5000 тон боепрыпасаў, а асобныя «рэкардсмены» з ліку сабак-мінашукальнікаў знайшлі да 12000 мін. У 1943 годзе на чыгуначным перагоне Полацк—Дрыса сабака Дзіна знішчыла эшалон з баявой тэхнікай і жывой сілай праціўніка. Дзіна прайшла ўсю вайну і валодала трыма баявымі спецыяльнасцямі: сабака-разведчык, сабака-дыверсант і сабака-мінашукальнік. Яна пакідала ўзрыўчатку на чыгункі і паспявала знікнуць. У канцы вайны змагла яшчэ двойчы праславіцца пры размініраванні горада Полацка, дзе аднойчы знайшла ў ложку нямецкага шпіталя мінусюрпрыз.

Пра гэтыя і многія іншыя цікавыя факты з гісторыі службовага сабакаводства часоў Вялікай Айчыннай вайны расказвае супрацоўнік музея наведвальнікам штотыднёвага мерапрыемства «Сабакі на службе Айчыне». А супрацоўнікі Кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Міністэрства абароны дзеляцца інфармацыяй пра сучасныя дасягненні службовага сабакаводства ў нашай краіне, а таксама прапануюць паказальныя выступленні кінолага са службовым сабакам.

На думку арганізатараў, мерапрыемства дасягае сваёй галоўнай выхаваўчай мэты — умацоўвае цікавасць маладога пакалення да вайсковай службы, выхоўвае патрыятычныя пачуцці, гонар за мінулае сваёй краіны і веру ў яе будучыню.

Тамара КУРГАНАВА,
загадчык аддзела эканомікі і развіцця Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Ім ганарацца беларусы, яго ведае ўвесь свет

Памяць

На магіле народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава на Усходніх могілках у Мінску адбылося ускладнанне кветак. 85-годдзе з дня нараджэння сусветна вядомага празаіка сталася яшчэ адной нагодай ушанаваць яго памяць.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чарцінец адзначыў, што асоба Васіля Быкава — найперш прыклад сапраўднага Чалавека. Ён заўсёды быў сумленным, сціплым, адкрытым. "Цяжка пераацаніць зробленае ім у літаратуры, — падкрэсліў Мікалай Іванавіч. — А колькі народаў свету праз пераклады ягоных твораў спазналі Беларусь!"

Анатоль Сульянаў згадаў свае незабыўныя сустрэчы з Васілём Уладзіміравічам. Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазняк прачула гаварыў пра выключнае значэнне творчасці В. Быкава для духоўнага ўдасканалення не толькі нашых сучаснікаў, але і наступных пакаленняў. Выступілі таксама паэты Уладзімір Мацвеенка і Вадзім Спрынчан.

***

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ сумесна з упраўленнем культуры аблвыканкама, аддзелам культуры і аддзелам адукацыі Ушацкага райвыканкама ў межах абласнога свята паэзіі да 85-годдзя з дня нараджэння пісьменніка правяло шэраг мерапрыемстваў ва Ушацкім раёне — на яго радзіме. Пісьменнікі Віцебшчыны і дэлегацыя СПБ наведалі музей Васіля Быкава ў Бычках, дом-музей Петруся Броўкі ў Пуцілкавічах, родную вёску паэтэсы Еўдакіі Лось, 80-годдзе з дня нараджэння якой адзначаецца сёлета, а таксама мемарыяльны комплекс "Прарыў". Галоўным мерапрыемствам, якое завяршыла дзень, стаў літаратурны вечар у раённым Доме культуры. Адбыўся таксама прагляд фільмаў па творах Васіля Быкава.

Першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Праўдзін за прапаганду беларускай літаратуры і захаванне памяці народнага пісьменніка Васіля Быкава і народнага паэта Петруся Броўкі ўручыў музеям В. Быкава і П. Броўкі дыпломы Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Станіслаў МІКАЛАЕЎ

На здымку: падчас ускладання кветак на Усходніх могілках.

Фота Віктара Кавалёва

З-пад пяра

У Доме дружбы адбыўся літаратурны вечар "Час цемры і святла", прысвечаны Добрыцу Чосічу — вядомаму сербскаму пісьменніку канца XX — пачатку XXI стагоддзя, аўтарытэтнаму грамадскаму дзеячу.

Старшыня таварыства "Беларусь — Сербія" прафесар І. Чарота выклаў сваё бачанне і разуменне "апазнавальных знакаў" гэтага творцы, мысляра — светаадлюстраванне эпічна-трагічнага складу, засяроджанасць на ўсіх складаных "вузлах" гісторыі свайго народа, які прайшоў неймаверна жорсткія выпрабаванні, а таксама — глыбокая заклапочанасць лёсам усяго чалавецтва. Адсюль і універсальнасць яго твораў, якія, безумоўна, заслугоўваюць таго, каб іх ведалі ва ўсім свеце.

Д. Чосіча як Грамадзяніна з вялікай літары прадставіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь доктар Срэчка Джукіч, між іншым, таксама пісьменнік. Была магчымасць непасрэдна пазнаёміцца і з творамі Д. Чосіча. Фрагменты іх на мове арыгінала і ў перакладах прачыталі студэнткі сербскага аддзялення БДУ Вольга Маркаўцова, Ксенія Курчыч, Віялета Сузько і Алена Гіро. Сказаў прывітальнае слова і галоўны рэдактар часопіса "Полымя" Мікола Мятліцкі.

А. І.

Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Омара Сенон Медзіна Кінтэра ў прысутнасці кіраўнікоў дыпламатычных місій і прадстаўнікоў грамадства перадаў у дар Нацыянальнай бібліятэцы збор твораў нацыянальнага героя Кубы і вечнага правадыра кубінскага народа Хасэ Марці «Крытычнае Выданне» (1853—1895). Спадар Кінтэра адзначыў, што кубінцы з дзяцінства знаёмяцца з асобай Хасэ Марці: *«У кожнай школе і навучальнай установе ёсць яго партрэты і творы. Хасэ Марці быў заўсёды блізкі да славянскіх народаў, нават пісаў пісьмы Льву Талстому. Вышэйшай узнагародай Кубы з'яўляецца ордэн Хасэ Марці, якім узнагароджаны прэзідэнты многіх краін свету, у тым ліку і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка»*.

Збор твораў Хасэ Марці (у 28-і тамах) з рук пасла прыняў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, які адзначыў: *«Ніводнае электроннае выданне не заменіць кнігі. Не параўнаць ні з чым тое адчуванне, калі бярэш у рукі арыгінальнае выданне таленавітага чалавека»*.

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Віктар Кураш выказаў шчырую падзяку кубінскаму народу і паведаміў, што на сённяшні дзень заключана амаль два дзесяткі разнастайных пагадненняў з Рэспублікай Куба, якія спрыяюць развіццю двухбаковых адносін.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

На пачатку чэрвеня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы быў прадстаўлены канцэрт-прытча "Жыццё ідзе" паводле пазаабрадавай лірыкі Палесся і твораў Янкі Купалы ў выкананні музыкаў фальклорнага ансамбля "Весялосць" кафедры беларускай народнай песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (мастацкі кіраўнік — Тацяна Пладунова).

Ул. інф.

Пасланнікі міру

Маяк

У рамках сацыяльна-культурнага праекта да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Чалавек нараджаецца, каб жыць...» у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры праходзіць выстава «Пасланнікі міру ўчора і сёння». На выставе прадстаўлены матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і архіва Беларускага фонду міру, старшынёй якога з'яўляецца Пасол свету Марат Ягораў.

Супрацоўніцтва музея і Марата Ягорава пачалося летась, калі Марат Фёдаравіч прынёс каштоўныя матэрыялы і фотаздымкі творцаў: Азгура, М. Танка, І. Мележа, К. Крапівы, С. Савіцкай, П. Панчанкі і многіх іншыя.

— Пасля службы ў войску, я скончыў журфак, працаваў у ваеннай газеце, адначасова супрацоўнічаў з радыё, тэлебачаннем. Потым мяне запрасілі працаваць у бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў — арганізоўваць выступленні пісьменнікаў, выступаць самому. Заўсёды з сабой быў фотаапарат. Фіксаваў падзеі, і ў хуткім часе ў мяне назапасіўся вялікі архіў фотаматэрыялаў. Я прапанаваў работнікам музея паказаць гэтыя фатаграфіі сваім наведвальнікам. Далей ідэя пашырылася — расказаць пра міратворчы рух, і ў выніку атрымалася такая выстава, — распавёў Марат Ягораў пра гісторыю ўзнікнення выставы.

На цырымоніі адкрыцця выставы "Пасланнікі міру ўчора і сёння" прысутнічала Ганна Пушкарэвіч, настаўніца школы № 97 г. Мінска, якая носіць ганаровае званне "Школы Міру".

— Мы адзіная "Школа Міру" ва ўсёй Рэспубліцы Беларусь, — распавядае Ганна Сяргееўна. — Усяго ў свеце існуе 51 "Школа Міру". Наша — не толькі праводзіць розныя акцыі, але і прымае ўдзел у міжнародным злётным руху.

Ілона КУПРЭЙЧЫК

На здымку: Марат Ягораў з суворацамі і навучэнцамі "Школы Міру".

Фота аўтара

Слова — сведку тых падзей

Сустрэчы

Нядаўна Уздзенская ЦРБ імя П. Труса правяла творчую вечарыну "З успамінаў аб днях векапомных" з удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнікам Васілём Гурскім. Месцам правядзення стала Уздзенская санаторная школа-інтэрнат, дзе цяпер адпачываюць хлопчыкі і дзяўчынкі з Мінскай вобласці.

У светлай утульнай актавай зале сабраліся вучні, каб пачуць ад сведкі тых трагічных падзей, былога партызана, расповед пра ваеннае ліхалецце, пра жыццё ў партызанскім атрадзе, пра баявых сяброў, пасляваенны час. Нямала выпрабаванняў выпала на долю Васіля Рыгоравіча: скончыў сем класаў Магільнянскай школы, тры гады вучыўся ў Мінску на настаўніка. Заставалася здаць толькі апошні экзамен і атрымаць накіраванне на працу, як на трэці дзень вайны над будынкам педвучылішча завыялі самалёты з крыжамі на крылах. З верасня 1942 года Васіль Рыгоравіч стаў партызанам атрада імя Чапаева, быў стралком, разведчыкам, кулямётчыкам, падрыўніком, памочнікам камандзіра атрада імя Дунаева. За баявыя заслугі партызан узнагароджаны двума ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны II ступені і дзесяццю медалямі.

На літаратурную сцежку ён ступіў у даволі сталым узросце. Першая кніжка выйшла ў 1974 годзе, за шмат гадоў выдаў ужо 25 кніжак, яшчэ адна знаходзіцца ў выдавецтве, у 1997 годзе Васіля Гурскага прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Расказаць пра свайго старэйшага сябра прыйшоў і Дзмітрый Вінаградаў, аўтар біяграфічнага нарыса "Время в самом себе", які прысвечаны В. Гурскаму.

Госці падарылі бібліятэцы і школе свае кнігі, а мы спадзяёмся, што і надалей будзем актыўна падтрымліваць сувязь з пісьменнікамі.

Аксана ДРАЧАН,
дырэктар Уздзенскай ЦБС

Неакадэмічная лекцыя

На сустрэчы з моладдзю БНТУ акадэмік Уладзімір Гніламёдаў расказаў пра сваё першае каханне і растлумачыў, чаму не імкнецца пісаць мадэрнова.

У. Гніламёдаў падзякаваў выкладчыцы, якая пачала сустрэчу з узнёслага расповеда яго біяграфіі, але крытычна заўважыў: "У вас атрымалася жыціе святога, а я святога не нагадваю ні знешне, ні ў сваіх творах". Распавёў, што нарадзіўся ў маленькай вёсачцы Кругель Камянецкага раёна, у юнацтве марыў стаць геолагам, але пайшоў услед за іншым сваім захапленнем — літаратурай і паступіў на філфак у Брэсцкі педагагічны інстытут, працаваў завучам у дзіцячым доме, настаўнікам у школе. Але студэнтаў цікавіла іншае. "Якім было ваша першае каханне?", — прагучала пытанне, і зала ажывілася. Уладзімір Гніламёдаў не збянтэжыўся: "Упершыню я закахаўся ў сваю настаўніцу. Пасля вайны да нас у вёску на практыку прыязджалі вельмі прыгожыя настаўніцы — яны фарбавалі вусны, завівалі валасы і падабаліся вучням, многія з якіх былі ўжо дарослымі, бо не маглі вучыцца падчас вайны. Я таксама быў закаханы, і на выпускным вечары нават намагаўся зрабіць прызнанне".

Пра настрой, у якім пішуцца творы, госць распавёў: "Раней было натхненне, а цяпер я проста саджуся перад аркушам і адчуваю сябе добра. Я не імкнуся пісаць мадэрнова — трэба мець асаблівы талент, каб быць эксперыментатарам. Жыццё настолькі цікавае, што яго можна апісваць такім, якое яно ёсць, простымі словамі". Пісьменнік таксама падзяліўся ўспамінамі пра ваеннае дзяцінства, з якога згадваецца самае моцнае пачуццё — страх. Былі пытанні пра будучыню беларускай мовы, цікавіла студэнтаў і на якой мове размаўляў Уладзімір Гніламёдаў у дзяцінстве: "У нашай вёсцы размаўлялі па-беларуску, але адчуваўся моцны ўплыў польскай і ўкраінскай. Сёння калі са мной гавораць па-руску, то я магу адказаць таксама на рускай мове, гэта проста ветлівасць". Спыталі акадэміка і пра паэзію. "Калі я быў малады і закаханы, то пісаў вершы. Але хто ведае, можа, я яшчэ моцна закахаюся і зноў пачну пісаць. Чалавек у любым узросце здольны на пачуцці", — хітравата адказаў Уладзімір Васільевіч, зноў скіраваўшы гутарку ў вясновае рэчышча.

"Ці ёсць у вас унукі, і якую літаратуру вы б раілі ім чытаць?", — прыйшла цыдулка з залы. "Унукаў яшчэ не дачакаўся. Хацеў бы, каб яны чыталі тое, што і я — класіку".

Саша ДОРСКАЯ

Мінск, па якім блукаў класік

Урбаністычныя матывы ніколі не былі ўласцівыя творчасці Янкі Купалы. Няспешны рух тагачаснага горада прыцягваў яго менш, чым маляўнічая пышнасць беларускай прыроды — бо "як не любіць гэта поле, і бор і зялёны садок, і крыклівую гусь...". Мінск цяжка назваць натхняльнікам паэта, а, хутчэй, творчай майстэрняй, дзе ім створаныя больш як сто вершаў і некалькі паэм.

Але, без сумнення, горад стаў родным домам, добрым сябрам і неад'емнай часткай жыцця беларускага песняра. Менавіта тую сталіцу 20-х – 40-х гадоў, якую ведаў і любіў класік, адлюстроўвае выстава "Мінск — сталіца, гордасць наша...", што праходзіць у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы да 15 верасня 2009 года.

Асабістыя рэчы Янкі Купалы.

Новая унікальная экспазіцыя, складзеная з матэрыялаў фонду музея, прысвечана 90-годдзю пераезду Янкі Купалы ў Мінск на сталае жыхарства. Выстава праводзіць гледача па ўсіх пяці мінскіх адрасах паэта: у 1919 годзе ён пасяліўся ў доме па вуліцы Юр'еўскай, пасля пераехаў на вуліцу Кашарова (сучасная Чырвонаармейская), затым — на Захар'еўскую (прыкладна туды, дзе сёння стаіць Дом-музей І з'езда РСДРП), некаторы час жыў на Правіянцкай (цяпер — вуліца Захарава). Цікава, што у двух апошніх месцах жыхарства суседам Янкі Купалы быў Змітрок Бядуля. І нарэшце паэт набыў уласнае жыллё — "дом пад таполей", як празвалі яго мінчане, на тагачаснай вуліцы Кастрычніцкай, дзе сёння знаходзіцца музей класіка.

А ўпершыню Янка Купала пабачыў горад нашмат раней, у маленстве — у 1890-м яго сям'я пераехала ў сталіцу і жыла тут на працягу года. Менавіта ў Мінску вершы паэта сталі дасягненнем грамадскасці — 15 мая 1905 года ў мінскай рускай газеце "Северо-Западный край" быў у першы раз апублікаваны на беларускай мове ягоны верш "Мужык", падпісаны "Я.Купала". Ён згадваў Мінск яшчэ ў сваіх ранніх творах — "Водклік з 29 кастрычніка 1905 года ў Мінску" і "Бабулька — прадаўшчыца зёлак", які ўвайшоў у зборнік "Жалейка", а па п'есе "Тутэйшыя" можна аднаўляць карту Мінска 20-х гадоў.

Экспазіцыя дэманструе самыя розныя выявы сталіцы — унікальныя фотаздымкі вуліц старога горада, карціны сучаснікаў Янкі Купалы, паштоўкі, накіды мастака Дзмітрыя Полазава — блізкага сябра паэта і аўтара яго першых прыжыццёвых партрэтаў. Своеасаблівай музейнай вітрынай стала нават акно музея — у ім экскурсаводы паказваюць месца, дзе знаходзілася тая самая таполя, шаты якой атулялі Купалаў дом. Калі падчас вайны ў хату трапіла бомба, адзінае, што тут засталося — абгарэлае дрэва. Сёння на яго месцы — сімвалічны камень.

Галоўнай кропкай выставы супрацоўнікі музея называюць рукапісы твораў паэта, створаныя ў Мінску. Тут, сярод іншых, напісаныя рукой класіка вершы "Шляхам гадоў", што быў прымеркаваны да 20-годдзя яго творчай дзейнасці, і "О, так! Я — пралетар!..", перададзены музею з Нью-Йорка Беларускім інстытутам навукі і літаратуры.

А мне найбольш цікавым падаўся раздзел выставы, які дэманструе асабістыя рэчы Янкі Купалы — бо заўсёды хочацца пабачыць класіка жывым і чалавечным, разгледзець за вялікай постаццю генія беларускай літаратуры простага гаспадара дома, са сваімі звычкамі і побытавымі клопатамі, з натуральным імкненнем захаваць утульнасць родных сцен. Вось ён увечары вяртаецца дахаты, пакідае макінтош на вешалцы, прытуляе да сцяны кіёчак, змяняе пантофлі на хатнія тапачкі, дапамагаючы сабе ражком для абутку фірмы "Salamander", які прывёз калісьці з Чэхаславакіі. Гэта проста ўявіць, бо ўсе пералічаныя рэчы прадстаўленыя на выставе. Акрамя таго, тут — акуляры паэта, вышываныя паясы, запінкі, алоўкі, тэлефонны даведнік 1939 года, сервіз, які Янка Купала падарыў сям'і хірурга Бобрыка, ды іншыя — усяго, як сведчаць музейшчыкі, гэткіх рарытэтных рэчаў засталося не так і шмат. Экспануюцца і дакументы паэта, самы адметны з якіх — пашпарт, выдадзены Івану Луцэвічу ў 1907 годзе ў Мінскай мяшчанскай управе, а таксама паперы на закупку "дома пад таполей" і на аўтамабіль шэўрале — дарэчы, на той час адзіны ў Мінску (сама машына сёння экспануецца ў філіяле музея ў Ляўках). Выстава дае магчымасць сапраўды наблізіцца да класіка — пабачыць рэшткі ягонай дзесяцітысячнай бібліятэкі, ад якой пасля вайны засталіся толькі чатыры кнігі, даведацца пра ўдзел Янкі Купалы ў стварэнні беларускага тэатра, "пагартаць" яго сямейны альбом, дзе прадстаўленыя малавядомыя здымкі (на якіх паэт разам з жонкай Уладзіславай Францаўнай, з навучэнцамі бабруйскай школы, за шахматамі з Якубам Коласам ды шмат іншых), паглядзець на апошні прыжыццёвы партрэт класіка, зроблены ў 1941 годзе мастаком Давідовічам. Заключным экспанатам выставы стала сціплая валіза — падобная да тых, з якімі Янка Купала ад'ехаў на пачатку вайны ў сваім шэўрале ў эвакуацыю, пакідаючы родны Мінск назаўсёды.

Саша ДОРСКАЯ

Скарбы роднай прыроды

У сталічнай бібліятэцы № 10 імя М. Мінковіча, якая нядаўна гасцінна адчыніла свае дзверы пасля рамонту, адбылася прэзентацыя "Малой дзіцячай Чырвонай кнігі" пісьменніка Віктара Гардзея. Яна пабачыла свет у выдавецтве "Беларусь". Гэта — яркае, адметна ілюстраванае літаратурна-мастацкае выданне. Сярод "герояў" кнігі — звяры, рыбы, жукі, матылі... і, канечне ж, рэдкія віды птушак: юрок, ціркушка стэпавая, саракуш шэры, рэмез звычайны, прасянка, шулёнак ды іншыя.

Як зазначыла бібліятэкар Ларыса Аляксандровіч, прэзентацыя адбылася ў рамках бібліяпраекта па экалагічным выхаванні "Каб не знікнуў цуд прыроды". На сустрэчу з пісьменнікам былі запрошаныя навучэнцы пятых класаў СШ № 79. Увогуле, гэта была першая сустрэча такога кшталту ва ўстанове пасля абнаўлення.

Выхоўваць з маленства высокую экалагічную культуру — справа складаная і не простая, але ганаровая і патрэбная, таму што кожны чалавек сёння асабіста адказны перад светам за скарбы сваёй роднай прыроды. "Малая дзіцячая Чырвоная кніга" можа стаць карысным практычным дапаможнікам на ўроках па прыродазнаўстве. Ў займальнай і дасціпнай форме, часта з усмешкай і гумарам, Віктар Гардзей апавядае пра біялогію рэдкіх і знікаючых відаў фауны Беларусі, прычым праз цеснае спалучэнне верша і празаічнай замалёўкі дасягаецца найбольш поўны вобраз таго ці іншага "чырвонакніжніка". Для зручнасці ў кнізе выкарыстаны алфавітны прынцып падачы матэрыялу, а назвы жывёл і птушак прыведзены ў адпаведнасці з сучаснай іх навуковай класіфікацыяй.

Віктар Канстанцінавіч расказаў дзятве пра сваю творчасць, гісторыю напісання некаторых твораў, чытаў вершы, шмат жартаваў. Пры канцы мерапрыемства Віктар Гардзей падпісаў і падарыў бібліятэцы выданні і паабяцаў зноў завітаць у госці пасля выхаду новай кнігі.

В. К.

Срэбныя струны

Адбылася прэзентацыя калектыўнага зборніка літаратараў Піншчыны «Струменя» серебряные струны». Прадстаўлялі яго чытачам кандыдат філалагічных навук Валянціна Локун і рэдактар газеты «Пінскі веснік» Марыя Ляшук. «Струмень», — распавядае М. Ляшук, — не толькі назва адной з пінскіх рэк. Так у свой час назвалі літаратурную старонку ў газеце «Пінскі веснік». Спачатку яе вёў паэт Анатоль Шушко, затым — Наталля Прыступа. Пасля за гэтую справу ўзяўся Валерый Грышкавец».

У літаб'яднанне «Струмень» уваходзяць настаўнікі і работнікі культуры, студэнты, пенсіянеры і нават школьнікі. Большасць сяброў аб'яднання захапляюцца паэзіяй, хоць, зразумела, ёсць і свае празаікі, а таксама тыя, хто піша для дзяцей. У зборнік увайшлі творы чатырнаццаці аўтараў. Гэта Тамара Кейта-Станкевіч, Таццяна Бяленка, Жанна Завацкая, Ніна Енбулаева, Вольга Ткачук, Раіса Азарка, Лідзія Кучынская, Ніна Нарывончык, Юлія Водчыц.

У гэтым жаночым сузор'і не губляюць свайго голасу Васіль Якімовіч, Міхаіл Башчук, Мікалай Крышталь, Сяргей Баран. Самы ж малады аўтар зборніка Алесь Каляда. Ён нарадзіўся ў 1993 годзе ў Пінску, цяпер вучыцца ў гімназіі № 12 горада Мінска.

Ідрак МІРЗАЛІ-ЗАДЭ

Выхаванне тэатрам

У брэсцкай сярэдняй школе № 12 імя К.Л.Губарэвіча дзейнічае тэатральны музей, аналагаў якому ў вобласці (ды, напэўна, і ва ўсёй рэспубліцы) няма.

"Да нядаўняга часу наша навучальная ўстанова мела тэатральна-харэаграфічны напрамак, — расказвае дырэктар школы Анатоль Пятровіч Булава. — Стварэнне музея "Брэст тэатральны" — заканамерны этап у рабоце па эстэтычным выхаванні дзяцей. Цяпер, нягледзячы на адсутнасць профільнай назвы ўстановы, сутнасць работы педкалектыву не змянілася. У яе аснове па-ранейшаму вялікая ўвага ўдзяляецца дысцыплінам культуралагічнага кшталту, якія фарміруюць цікавасць да мастацтва ва ўсіх яго праявах".

"Музей не толькі знаёміць школьнікаў з тэатральным мастацтвам увогуле і роднага горада ў прыватнасці, але і развівае ўменне бачыць прыгажосць вакол сябе, паважаць гісторыю, імкнуцца быць высокаадукаванай асобай, — гаворыць дырэктар музея, кіраўнік гуртка па гісторыі тэатра Ганны Піліпаўна Кавалёва. — Акрамя таго, гэта добрая прафарыентацыя з тэатральным ухілам. І няхай у далейшым многія не стануць тэатральнымі крытыкамі, рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі, бутафорамі, мастакамі-дэкаратарамі, заняткі ў музеі ўсё роўна не пройдуць дарэмна, бо дапамогуць лепш разбірацца ў пэўных з'явах культурнага жыцця".

У аснове музейнай экспазіцыі, якая налічвае звыш трох тысяч экспанатаў, ляжыць уласная калекцыя Ганны Кавалёвай. "Мае бацькі працавалі ў Брэсцкім абласным тэатры драмы і музыкі, — расказвае Ганна Піліпаўна. — Яшчэ з дзяцінства, якое праходзіла сярод дэкарацый і акцёраў, я моцна палюбіла тэатр. З 1965 года пачала збіраць фотаздымкі, афішы, рукапісы і праграмы спектакляў, інфармацыю аб тэатральных калектывах, што бывалі на гастролях у Брэсце. З цягам часу назапасілася ўнушальная калекцыя, якая пры падтрымцы дырэктара школы афармілася ў адпаведны музей, дзе праведзены ўжо звыш 150 экскурсій, прычым як для жыхароў горада над Бугам, так і для замежных гасцей".

Музей размешчаны ў трох залах. Асноўная знаходзіцца ў асобным памяшканні і прысвечана гісторыі тэатра драмы. Астатнія месцяцца ў вучэбных класах: у адным створаны мемарыяльны пакой вядомага беларускага драматурга Кастуся Губарэвіча, а ў другім расказваецца аб гісторыі тэатраў лялек нашай краіны. Сёлета плануецца адкрыць і чацвёртую залу, прысвечаную міжнароднаму тэатральнаму фестывалю "Белая вежа", які штогод ладзіцца ў Брэсце.

У асноўнай зале добра прадстаўлена гісторыя тэатральнага жыцця драматычнага тэатра з XVI стагоддзя да сучаснасці.

"Першым тэатрам у Брэсце стаў школьны тэатр пры езуіцкім калегіуме, які дзейнічаў на працягу 1630—1760-х гадоў. У ім было пастаўлена звыш 10 спектакляў на лацінскай і польскай мовах. У калегіуме вучыўся і вядомы асветнік, педагог і грамадска-палітычны дзеяч Казімір Лышчынскі. Летапіс расказвае аб яго актыўным удзеле ў школьным тэатры.

У XIX стагоддзі ў Брэсце пастаяннага тэатра не было. На гастролі прыязджалі тэатральныя групы і антрэпрызы Расіі, Польшчы і Украіны. У 1885 годзе было арганізавана

музычна-драматычнае таварыства аматараў тэатра, на літаратурных вечарынах якога яго ўдзельнікі знаёміліся з вершамі і апавяданнямі рускіх класікаў. Гасцінны Брэст прадастаўляў 9 сцэнічных пляцовак для гастралюючых тэатраў: толькі ў 1929 годзе ў горадзе выступілі 28 калектываў. Захаваліся і некаторыя тэатральныя будынкі — Зімняга тэатра і тэатра Сарвера", — распавядае Ганна Кавалёва.

На працягу ўсяго свайго існавання брэсцкі тэатр актыўна працаваў і над сцэнічным увасабленнем твораў беларускай драматургіі, глыбока і ўсебакова паказваў гісторыю народа, праблемы сучаснікаў. Сярод адметных пастановак — "Раскіданае гняздо" Янкі Купалы, "Хто смяецца апошнім" К. Крапівы, "І змоўклі птушкі" і "Сэрца на далоні" І. Шамякіна. На брэсцкай сцэне ставіліся амаль усе п'есы А. Макаёнка. Сёння калектыў працуе з сучаснымі беларускімі драматургамі А. Дударавым ("Купала", "Цыганскі кароль") і С. Кавалёвым ("Карнаваль, што за дзіўная назва", "Саламея Русецкая").

Са стэнда "Ажыўшая легенда" можна даведацца, што сапраўдным творчым узлётам для трупы стаў спектакль "Брэсцкая крэпасць" паводле п'есы Кастуся Губарэвіча. Перажыўшы некалькі рэдакцый і акцёрскіх складаў, гэтая пастаноўка стала знакавай для тэатра. Спектакль быў паказаны 935 разоў, а ў 1967 годзе адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

Вялікую цікавасць выклікаюць у школьным музеі касцюмы і дэкарацыі, прадастаўленыя абласным акадэмічным тэатрам драмы, з якім наладжана цеснае супрацоўніцтва. Сярод каштоўных экспанатаў — жаночы карсет з пласцінамі з кітовага вуса канца XIX стагоддзя (да сярэдзіны 1960-х гадоў актрысы насілі пад касцюмамі карсеты), а таксама касцюмы са спектакляў, пастаўленых у 1950-я.

"Тое, што дзве музейныя залы месцяцца непасрэдна ў вучэбных класах пачатковай школы, мае вялікае выхаваўчае ўздзеянне, — лічыць Ганна Кавалёва. — Такім чынам дзеці змалку далучаюцца да свету прыгожага, вучацца любіць і шанаваць харство, якое ляжыць у аснове любога мастацтва".

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

На здымках: у музейнай зале, прысвечанай лялечным тэатрам.

Фота аўтара

У будынку навукова-даследчых інстытутаў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзілася рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя. Яе тэма — "Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі". Адкрыў пленарнае пасяджэнне ўступным словам дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, прафесар Аляксандр Лукашанец.

Адлюстраванне рэчаіснасці

Правядзенне навуковых канферэнцый у акадэмічным Інстытуце мовы і літаратуры стала ўжо добрай традыцыяй, якая не спыняецца, нягледзячы на не заўсёды спрыяльныя знешнія абставіны. Гэта могуць быць цяжкасці з арганізацыйнымі праблемамі і звязаныя з аб'яднаннем дзвюх самастойных навукова-даследчых устаноў у адну... Аднак ніякія знешнія абставіны, як паказвае сусветны гістарычны вопыт, не могуць спыніць творчы пошук навуковай думкі. Сама назва канферэнцыі сведчыць пра яе актуальнасць для сучаснага літаратурнага жыцця нашай краіны. Сапраўды, радыкальныя змены ў жыцці нашага грамадства на рубяжы стагоддзяў абумовілі і істотныя змены ў літаратурным працэсе. Бо нацыянальная літаратура як феномен духоўнага жыцця народа і як спецыфічны сродак мастацкага адлюстравання рэчаіснасці вельмі аператыўна і востра рэагуе на рэаліі знешняга жыцця. Так было на рубяжы XIX і XX стагоддзяў, калі менавіта беларуская нацыянальная літаратура адыграла выключна важнае значэнне ў духоўным аб'яднанні нацыі, у абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларускага народа, што стала адным з галоўных фактараў афармлення беларускай дзяржаўнасці і пашырэння беларускай мовы ў афіцыйнай сферы выкарыстання. Так было і ў 20-я гады XX стагоддзя, калі на літаратурную арэну выйшла цэлая плеяда маладых таленавітых айчынных пісьменнікаў, якія сваёй творчасцю, у тым ліку і эксперыментальнай, узнялі беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень.

Аляксандр Лукашанец зазначыў, што сёння з улікам новых фактаў пашырылася гістарычная кампетэнцыя нашага грамадства, а значыць, і дыяпазон яе мастацкага ўвасаблення. З'явіліся новыя жанры мастацкай творчасці, незвычайна пашырыліся тэхнічныя магчымасці распаўсюджвання літаратурных твораў, скараціліся і спрасціліся шляхі да чытача. Дзякуючы электронным сродкам масавай інфармацыі і камунікацыі стаў магчымым непасрэдны дыялог паміж пісьменнікам і чытачом. У сённяшніх умовах незвычайна ўзрастае роля менавіта нацыянальнай мастацкай літаратуры ў падтрыманні і захаванні нацыянальнай свядомасці ды адметнасці народа і краіны. Апошняе асабліва актуальнае для нашай рэчаіснасці на сучасным этапе дзяржаўнага будаўніцтва. Задача літаратуразнаўцаў — асэнсаваць гэтую ролю, паказаць значэнне духоўных нацыянальных каштоўнасцей для развіцця беларускага грамадства. Сучасная беларуская літаратура багатая і новымі творчымі здабыткамі, і эксперыментальнымі пошукамі. Але для таго, каб належным чынам ацаніць і ўсвядоміць гэта, неабходны час. Толькі з пэўнай часавай адлегласці можна аб'ектыўна зноў-такі ацаніць і разгледзець тое, што робіцца цяпер у сучаснай беларускай літаратуры. І дадзеная

Задача літаратуразнаўцаў — асэнсаваць і паказаць значэнне духоўных нацыянальных каштоўнасцей для развіцця беларускага грамадства. Сучасная беларуская літаратура багатая і новымі творчымі здабыткамі, і эксперыментальнымі пошукамі. Але для таго, каб належным чынам ацаніць і ўсвядоміць гэта, неабходны час. Толькі з пэўнай часавай адлегласці можна аб'ектыўна зноў-такі ацаніць і разгледзець тое, што робіцца цяпер у сучаснай беларускай літаратуры. І дадзеная канферэнцыя — асэнсаваць і паказаць значэнне духоўных нацыянальных каштоўнасцей для развіцця беларускага грамадства. Сучасная беларуская літаратура багатая і новымі творчымі здабыткамі, і эксперыментальнымі пошукамі. Але для таго, каб належным чынам ацаніць і ўсвядоміць гэта, неабходны час. Толькі з пэўнай часавай адлегласці можна аб'ектыўна зноў-такі ацаніць і разгледзець тое, што робіцца цяпер у сучаснай беларускай літаратуры. І дадзеная канферэнцыя — адзін з першых крокаў на шляху гэтага асэнсавання.

Сёлетняя канферэнцыя знакавая. Па-першае, працягвае акадэмічныя традыцыі Інстытута літаратуры, бо без навуковага абмеркавання і палемікі ў прынцыпе немагчымы навуковы пошук. Па-другое, праходзіла яна напярэдадні святкавання Дня славянскага пісьменства. Па-трэцяе, у гэтым годзе адзначаецца 65-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а гэта тэма ў нацыянальнай літаратуры і пасёння вельмі актуальная. Па-чацвёртае, праходзіць у год 80-гадовага юбілею аб'яднанага сённяшняга Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі...

З дакладам на тэму "Сацыяльны статус беларускай літаратуры і грамадскія практыкі" выступіў загадчык аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі доктар філалагічных навук Міхась Тычына. Ён падкрэсліў, што традыцыйна высокі сацыяльны статус беларускай літаратуры ў пачатку нашага стагоддзя радыкальна пераасэнсоўваецца. І адна з асноўных прычын — літаратурацэнтрызм беларускай культуры і звязаны з ім завышаны крэдыт даверу ў нацыянальнай чытацкай аўдыторыі. Міхась Аляксандравіч зрабіў экскурс па гісторыі беларускай літаратуры, творах пісьменнікаў-класікаў пачатку XX стагоддзя і сучасных літаратараў і дадаў, што ў сферы сацыяльных і гуманітарных навук літаратуразнаўства займае сваё унікальнае месца. А галоўная задача гісторыкаў, тэарэтыкаў, літаратурных крытыкаў, прадстаўнікоў дапаможных адгалінаванняў літаратурнай навукі заключаецца ў адкрыцці і інтэрпрэтацыі духоўнага і эстэтычнага патэнцыялу сучаснай беларускай літаратуры...

Пра пошукі стылёва-жанравай свабоды распавёў галоўны навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX і XXI стагоддзяў Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі доктар філалагічных навук Васіль Жураўлёў, а пра рэфармацыю прынцыпаў класічнай паэзіі ў новым тысячагоддзі — загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны прафесар Іван Штэйнер.

Загадчык кафедры беларускай літаратуры БДПУ імя М. Танка дацэнт Галіна Адамовіч агучыла даклад "Сістэмны аналіз як актуальная парадыгма міждысцыплінарных даследаванняў", а яе калега з МДЛУ Пятро Васючэнка выступіў на тэму "Выдаткі рэпрадуктыўнага засваення студэнтамі ведаў па беларускай літаратуры".

Увогуле, у канферэнцыі бралі ўдзел супрацоўнікі інстытутаў мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы ды філасофіі НАН Беларусі, а таксама прадстаўнікі вядучых вышэйшых навучальных устаноў краіны. Пасля пленарнага пасяджэння распачалася праца ў сямі секцыях: "Тэорыя літаратуры і літаратурная практыка", "Літаратура і грамадскія практыкі", "Беларуская класіка ў святле сучаснасці", "Прыярытэты сучаснай літаратуры", "Тэкст і яго сучасная рэцэпцыя", "Мова даўняй і новай літаратуры" і "Мова сучаснай літаратуры". А сярод дакладчыкаў былі прафесар кафедры рускай і замежнай літаратур МДУ імя А. Куляшова Віктар Люкевіч ("Эстэтычная метадалогія Якуба Коласа ў трылогіі "На ростанях"), вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі Уладзімір Конан ("Вобразы і матывы роднай зямлі ў паэзіі Н. Гілевіча"), выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ Ганна Мятліцкая ("Майстэрства адухаўлення ў лірыцы Яўгеніі Янішчыц"), выкладчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры БДУКіМ Соф'я Тычына ("Матыў "пакрыўджанага дзіцяці" ў творчасці Я. Баршчэўскага"), дацэнт кафедры беларускай мовы ГрДУ імя Янкі Купалы Алена Садоўская ("Фразеалагізмы ў мове сучаснай літаратуры")...

А на другі дзень ладзіўся "круглы стол" на тэму "Стратэгіі навуковага пошуку літаратуразнаўства", адбылося заключнае пленарнае пасяджэнне і былі прыняты рашэнні навукова-тэарэтычнай канферэнцыі.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Дубровенскія гадзіннікі — праца шведа Нардштэйна

Цяпер, калі цікавасць Швецыі да нашай краіны з кожным годам расце, самы час знаёміць беларусаў з гэтай скандынаўскай дзяржавай і яе народам. З пачатку года наш карэспандэнт Сяргей Макарэвіч распачаў друкаваць серыю матэрыялаў пра малавядомыя старонкі з гісторыі шведска-беларускіх сувязяў. У адным з папярэдніх артыкулаў ён пісаў пра датычнасць манапаліста са Швецыі Івара Крэйгера да запалкавай прамысловасці ў Заходняй Беларусі. Сёння журналіст распавядае пра гадзіннікавую прамысловасць на тэрыторыі Беларусі, да стварэння якой спрычыніўся таксама швед.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай на далучаных да Расійскай імперыі беларускіх землях граф Рыгор Пацёмкін арганізаваў гадзіннікавую фабрыку-школу. Было гэта ў Дуброўне ў 1784 годзе. Паслужыла гэтаму тое, што ў Расіі гадзіннікі выраблялiся выключна асобнымі майстрамі. А спроба імператрыцы Кацярыны II наладзіць выраб гадзіннікаў у Маскве і Пецярбургу ў 1769 годзе пацярпела фіяска. Фабрыкі пасля некалькіх гадоў працы спынілі сваё існаванне. Сітуацыяй і вырашыў скарыстацца граф Пацёмкін.

Рыгор Пацёмкін у свой маёнтак Дуброўна наняў на службу гадзіннікавага майстра "з прыродных шведаў Нардстэйна" (Пётра Нардштэйна), які да гэтага пры імператарскай Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу ўзначальваў спецыяльны клас. Ёсць звесткі, што дубровенскай фабрыкай кіраваў і яшчэ адзін майстар, швед па нацыянальнасці, Олер. У школе пры фабрыцы гадзіннікавай справе навучаліся 33 чалавекі, якія, асвоіўшы гэты занятак, і займаліся ў далейшым вытворчасцю. У "Матэрыялах да гісторыі мануфактуры на Беларусі" (Мінск, 1935) прыводзіцца спіс масцеравога люду з дубровенскай фабрыкі. Узрост працаўнікоў складаў ад 18 да 24 гадоў. Жылі яны ў асноўным у Дуброўне. Рыгор Іваноў прыходзіў на працу з мястэчка Ляды, Павел Міронаў — з вёскі Дамінікава, Сямён Ягораў і Андрэй Якаўлеў — з сяла Свінное. На дубровенскай фабрыцы выраблялiся кішэнныя, насценныя, вялікія баявыя гадзіннікі. Дэталі да гадзіннікаў штукаваліся на 33 спецыяльных станках па мануфактурным прынцыпе — раздзяленні працы. Гісторык Андрэй Кіштымаў сцвярджае, што такой адладжанай працы не было ў той час нават у Швейцарыі.

У 1791 годзе памёр граф Рыгор Пацёмкін. Праз тры гады фабрыку выкупіла ў яго нашчадкаў імператрыца Кацярына II. Па яе загадзе вытворчасць перавезлі ў Маскву, а затым у спецыяльна пабудаваны будынак у Купаўне Маскоўскай губерні. Але ў 1804 годзе фабрыка спыніла сваё існаванне. У Маскву вярнуўся і Пётр Нардштэйн.

Вырабы дубровенскай фабрыкі ў асноўным ішлі на патрэбы імператарскага двара. І толькі нязначная частка трапляла ў Заходнюю Еўропу. Вядома, што ў фондах Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу захоўваюцца тры экземпляры гадзіннікаў з Дуброўны. Гэта кішэнныя гадзіннікі ў адкрытых сярэбраных карпусах з белымі эмалевымі цыферблатамі. Андрэй Кіштымаў зазначае, што на цыферблаце і задняй плаце аднаго экземпляра ёсць надпіс: "Фабрыка Дубровенская". Другі гадзіннік падпісаны Х. Вінбергам. Трэці — невядомым аўтарам. Цяпер рыхтуецца першы выпуск каталога калекцыі гадзіннікаў, які будзе прысвечаны расійскай хранаметрыі. Павінны там быць і беларускія вырабы. На жаль, у Дуброўне сёння няма музея. Працуе, праўда, група па яго стварэнні. Мо ім удасца адшукаць новыя звесткі пра гадзіннікавую фабрыку ў сваім горадзе. А разам з тым і з'явяцца дадатковыя звесткі пра шведа Пятра Нардштэйна.

Сяргей МАКАРЭВІЧ
На здымку: граф Рыгор Пацёмкін.

Па-свойму, адметна

Мастацкія творы, што расказваюць пра будні салдат і афіцэраў сённяшняй арміі, на жаль, амаль не з'яўляюцца. Вядома, перш за ўсё маюцца на ўвазе раманы і аповесці, хоць і з малымі жанрамі — апавяданнямі, навеламі, як кажуць, не надта густа. Тым больш, калі гэта тычыцца перавыхавання юнакоў, якія за розныя правіннасці трапілі ў дысцыплінарны батальён. Бадай, галоўная прычына адсутнасці падобных твораў — слабае веданне, а хутчэй за ўсё — няведанне пісьменнікамі падобных бакоў армейскага жыцця.

Тым большая магчымасць адкрываецца перад тымі літаратарамі, якія службе ў войску аддалі ўсё сваё жыццё, добра ведаюць ягоныя праблемы. А гэта найперш генерал-маёр авіяцыі, вядомы пісьменнік Анатоль Сульянаў — аўтар шэрагу кніг, якія людзьмі ваеннымі (і не толькі ваеннымі!) зачытваюцца, так бы мовіць, да дзірак. Невыпадкова творчую пуцёўку Анатолю Канстанцінавічу ў вялікую літаратуру даваў менавіта сам Васіль Быкаў. Каментарыі ў дадзеным выпадку, несумненна, лішнія.

І вось перада мной новая кніга А. Сульнава (з серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі"), што складаецца з ягонага рамана "Черный "Мерседес" с правительственным номером", апавядання "В кабине истребителя... посторонний предмет", а таксама некалькіх мастацка-публіцыстычных твораў.

Галоўная мастакоўская ўдача — раман "Черный "Мерседес" с правительственным номером", у якім акурат і расказваецца пра жыццё аднаго з дысцыплінарных батальёнаў. Праўда, паводле аўтарскай задумы, гэта адбываецца не сёння, а некалькі гадоў таму. Пры гэтым пісьменнік выкарыстоўвае прыём супастаўлення. У самым пачатку твора сяржант Васіль Базілевіч за бездакорнае нясенне службы атрымлівае кароткачасовы водпуск. Па прыездзе дамоў у яго адбываецца гаворка з родным братам Валерыем, які свой воінскі абавязак выконваў значна раней:

"— Тебе, брат, повезло! — вздохнул Валерка. — В наше время совсем по-другому проходила служба.

— Как по-другому? Расскажи, Валера!"

Раман і пабудаваны на рэтраспекцыях. Але аповед вядзецца не ад першай асобы, і гэта слушна. Тым самым аўтар, выступаючы апавядальнікам, можа паглядзець на тое, што адбылося з Валерыем Базілевічам, у іншым ракурсе і разам з тым на адлегласці пэўнага адрэзку часу. Адным словам, пісьменнік не толькі расказвае, але і стараецца даць сваю, накольк гэта магчыма, аб'ектыўную ацэнку як паводзінам галоўнага героя, так і жыццю дысбата ў цэлым. Яно ж, жыццё гэтае, такое, што і ворагу не пажадаеш.

Асабліва псіхалагічна-глыбока А. Сульянаў раскрывае характары двух персанажаў. Зразумела, самога Валерыя і нейкага Шчацінскага, які найчасцей прахадзіць не пад сваім сапраўдным прозвішчам, а пад клічкай Пан.

Валерый і Пан — антыподы. Мала таго, нават адбываючы пакаранне, Базілевіч не страчвае чалавечнасці, імкнецца ва ўсім і заўсёды заставацца чалавекам. Шчацінскі ж, наадварот, узненавідзеўшы людзей з маленства (бацька п'янстваваў, адзіным ягоным выхавальнікам стала вуліца), азлобленасць ператварыў у норму сваіх паводзін. Адбываючы пакаранне, перавыхоўвацца не жадае. Больш за тое, імкнецца ўсіх падначаліць сабе.

У адным нельга адмовіць Пану. Пры ўсіх сваіх негатыўных якасцях, ён, разам з тым, неблагі псіхолаг. Разумеючы, што Валера — не з тых, каго лёгка паставіць на калені, Шчацінскі ідзе іншым шляхам, стараючыся наблізіць яго да сябе. Аднаго не разумее, што людзі, падобныя Базілевічу, ніколі не бываюць разменнымі пешкамі ў чужой гульні. Дый быць імі не жадаюць.

Адмова дапамагчы, а па сутнасці стаць на шлях злачынства, дорага каштавала Базілевічу... Да месца заўважыць, што ўсё гэта перадаецца з такімі падрабязнасцямі, што выглядае празмерна натуралістычна. Бадай, аўтару трэба было ў дадзеным эпізоде дый у іншых, дзе Шчацінскі праяўляе сваю неўтаймаваную мужчынскую страсць, не забываць пра пачуццё меры. Але гэта між іншым...

У рамане наступае кульмінацыйны момант. Пан, зневажаючы Валеру, безумоўна, як і заўсёды, разлічваў на сваю беспакаранасць, бо меркаваў, што Базілевіч, апынуўшыся ў падобным становішчы, сцішыцца, як тая мыш пад венікам. Але памыліўся. Валера прылюдна, на вачах усёй роты ўдарыў яго. Падобнае, безумоўна, не магло не дайсці да начальства. А калі Шчацінскім зацікавіўся пракурор, той зразумеў, чаго гэта будзе каштаваць, таму і вырашыў уцякаць з дысцыплінарнага батальёна.

Пасля гэтага адразу і наступае развязка. Як у самім рамане, так і ў жыцці Шчацінскага, які не паспеў далёка адбегчы, бо яго напаткала куля вартавых. Апошнім, каго ўбачыў ён, быў Валера, які бег да яго, быццам мог яшчэ ўратаваць. Як апошняе імгненне, прамільгнула ў свядомасці Пана: "Ты, Валера, был единственным человеком в моей искалеченной жизни, который по-настоящему хотел помочь мне освободиться от всей этой грязи и жестокости. А я был жесток к тебе! Зачем я это сделал? Не знаю. И сегодня ты пытался помочь мне, дураку набитому. Прости, Валера, за все мои пред тобой грехи! прости! Сволочь я перед тобой!"

Сяму-таму з чытачоў, магчыма, падобныя развагі закаранелага злачынцы пададуцца надуманымі. Ды рэч у тым, што яны вынікаюць з самой логікі разгортвання характару Шчацінскага. А. Сульянаў, уважліва раскрываючы ўнутраны свет гэтага літаратурнага персанажа, далёкі ад думкі падаваць яго аднабакова, толькі ў адмоўным плане. Логіка разгортвання характару Шчацінскага пераканаўча сведчыць на карысць таго, што ў паводзінах, якімі кіруецца Пан, ёсць не толькі ягоная віна, а і бяда. Бяда ў тым, што і сапраўды так няўдала склалася яго жыццё, а сам ён, паплыўшы па ягонай плыні, не заўважаў (дый, бадай, не хацеў заўважаць), што выносіць яго не да тых берагоў.

Прыемнае ўражанне робіць апавяданне "В кабине истребителя... посторонний предмет". Найперш таму, што пісьменніку ўдалося праўдзіва перадаць адчуванне лётчыка, калі той узнімаецца ў паветра. Хоць гэта і зразумела: А. Сульянаў расказвае пра тое, сведкам чаго і сам быў неаднойчы, калі ў гады сваёй маладосці служыў у авіяцыі.

Сюжэт апавядання — напружаны, дынамічны. Аўтар як бы прапануе чытачу свайго роду кардыяграму паводзін галоўнага героя, а гэта прыводзіць да псіхалагічнай праўдзівасці і пераканальнасці.

У астатніх творах, што ўвайшлі ў яго новую кнігу, А. Сульянаў рухаецца ў двух накірунках: як празаік, які здатны пісаць так, што ў асобных выпадках нават дух захапляе — настолькі па-майстэрску ён будуе сюжэт, і як даследчык, бо ўзнаўляе малавядомыя, а то і зусім невядомыя старонкі гісторыі. Гэта ў аднолькавай ступені тычыцца і падзей больш даўніх, і тых, што на памяці сённяшняга пакалення.

Прынамсі, А. Сульянаў дае сваё бачанне трагедыі вядомага паэта ("Владимир Маяковский и его любимые женщины"), пераканаўча асэнсоўвае тое, што прывяло да гібелі першага ў свеце касманаўта ("Взлет и трагедия Юрия Гагарина"). Заслугоўвае ўвагі, шмат у чым новы падыход у асэнсаванні падзей Вялікай Айчыннай вайны, пра што сведчаць мастацка-публіцыстычныя творы "Так начиналась война", "В ночи глухой под Могилевом", "Рыцарь неба Алексей Маресьев". Яны цікавыя і тым, што ў сюжэтную канву ўплятаюцца аўтабіяграфічныя моманты. У гэтым сэнсе асабліва прывабліве спасціжэнне А. Сульянавым "сапраўднага чалавека" Аляксея Марэсьева, з якім яму даводзілася неаднойчы сустракацца.

На завяршэнне ж кнігі прапануецца "Разговор писателя с художником о человеческом духе" пра народнага мастака Міхася Савіцкага.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Мелодыі не атрымалася

Міні-рэцэнзія

Магілёўскі абласны цэнтр народнай творчасці і культасветработы выпусціў невялічкую кніжку вершаў "Мелодия надежды" Аляксандра Казекі, які часам друкуецца на старонках газет Магілёва. Піша А. Казека на дзвюх мовах. У "Мелодии надежды" сабраны вершы на рускай.

Першае ж знаёмства са зборнікам выклікае расчараванне. Возьмем, напрыклад, грамадзянскую лірыку аўтара. У кніжцы яна займае пэўнае месца. Пералічым назвы некаторых вершаў: "А что есть тьма? А что есть свет?", "Ода любви", "Мы за дела свои в ответе", "Довольно зла, довольно лести", "От дьявола брачных чертогов", "На стыке двух тысячелетий", "За тленом временных сует". Прачытаўшы гэтыя назвы, верыш, што аўтара хвалюе тое, што адбываецца ў свеце. А вось выказаць свае хваляванні А. Казека не змог. Вершы — чыстай вады дэкларацыя, няведанне жывой рускай мовы:

Довольно темноты!
Пусть мира Свет
Сольёт лампады душ
в единства меру,
И мы тогда прозрев, найдём ответ
В источнике Добра, Любви и Веры.

Гэта плакат альбо лозунг. Ды і нічога новага аўтар не сказаў. Ён проста прадэкларуе тое, што вядома ўсім, прытым стаў у позу праведніка, які звяртаецца да грэшнікаў. Ёсць тут і парушэнне логікі. Калі душы — лампады, калі ёсць іх святло, то выраз "И мы тогда, прозрев, найдём ответ" — неўпапад. Ды і нельга зліць лампады ў адзінае святло, можна зрабіць адзіным іх гарэнне. А што гэта за "единства мера"? Такой меры няма. Непісьменнасць яўная. Яна назіраецца няўзброеным вокам.

У зборніку ёсць і вершы аб прыродзе. І зноў жа іх губяць штампы:

А за окном по-прежнему дождит, —
Расплакалось тоскливостью
ненастье,
Подолами туманов шелестит
Осенней грусти шелковое платье.

Аб тым, што дождж плача, пісалі многія паэты, але ў кожнага з іх было штосьці сваё:

"Проплясал, проплакал дождь осенний..."
С. Ясенін

Возьмем цяпер выраз:

Подолами туманов шелестит
Осенней грусти шёлковое платье.

Калі аўтар параўнаў шаўковую сукенку з туманамі, то трэба заўважыць, што ў яе толькі адзін падол. І наогул, вобраз вельмі туманны. І ў іншых вершах А. Казекі восень "тихо плачет от тоски".

Чытае раней бачым мы ў вершы "Стоял у леса дуб могучий". Уся магутнасць гэтага дрэва заключаецца, па словах аўтара, у тым, што дуб разганяе галінкамі хмары і трымае неба на сваіх плячах. Нічога новага, нічога свайго. Вобраза няма. Тут варта ўспомніць верш вядомага рускага паэта мінулага стагоддзя Пятра Камарова:

Словно часовой,
в широкой пойме
Он стоит, оберегая рожь,
И недаром на патрон в обойме
Каждый жёлудь у него похож.

Вось вобраз дуба! Ясны, моцны, суцэльны! У вершы чатыры радкі. Усё сказана ў іх пра дуб.

Адным словам, тое, што прадстаўлена ў зборніку "Мелодия надежды", нагадвае практыкаванні ў вершаскладанні пачаткоўца, а аўтар жа знаходзіцца ў сталым узросце, калі, як сказаў класік, "лета к суровой прозе клонят". У кніжцы няма свежых метафараў, эпітэтаў, параўнанняў, якія з'яўляюцца інструментамі паэзіі. Ёсць рыфмаваныя радкі і пэўная рытміка. Для сапраўднай паэзіі гэтага вельмі мала.

Іван ПЕХЦЕРАЎ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Беларусь" выйшаў у свет альбом *"Повязь часоў — беларускі ручнік"*, які знаёміць з выдатнай з'явай нацыянальнай культуры Беларусі — традыцыйнымі і сучаснымі ручнікамі. Каляровыя фотаздымкі 220 ручнікоў канца XIX—XX стагоддзяў са збораў 11 музеяў Беларусі дэманструюць высокія мастацкія дасягненні беларускіх сялянак у ткацтве, вышыўцы, карункапляценні. Прадстаўлены 44 лакальныя тыпы ручнікоў усіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі — Заходняга Палесся, Усходняга Палесся, Падняпроўя, Цэнтральнай Беларусі, Паазер'я, а таксама пазнейшыя вышываныя ручнікі, якія адлюстроўваюць працэс разбурэння і нівеліроўкі этнічнай спецыфікі ў традыцыйным народным мастацтве.

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніжка выбраных вершаў паэта з Глыбокага, лаўрэата віцебскай абласной прэміі імя У. Караткевіча **Алеся ЖЫГУНОВА** *"Ля цяплыца зары"*. Падставай для выбранага былі папярэднія зборнікі "Матчына вышыванка", "Мая Тройца" і "Пагавары са мною восень...". Да ўсяго дадаўся цыкл новых вершаў.

У выдавецтве "Беларусь" выйшла кніга **Яўгена САХУТЫ** *"Беларуская выцінанка"*. Апошнім часам у нацыянальных культурах выявілася шмат в і д а ў народнай творчасці, да якіх праяўляецца ўсё большы інтарэс у свеце. Гэта адносіцца і да выцінанкі. У кніжцы абагулены і гісторыя, і сучасны стан, і мастацкія своеасаблівасці, і нацыянальныя прыкметы беларускай выцінанкі.



У "Віцебскай абласной друкарні" выйшаў зборнік апавяданняў на рускай мове **Барыса БЕЛЕЖЭНКІ** *"Сны и дороги"*. Гэта дзесятая па ліку кніга літаратара. Яна складаецца з сапраўдных падзей жыцця, але не без сінтэзу рэальнага і прыдуманага. Ёсць таксама спроба скарэкціраваць загадкавыя сны на пэўныя жыццёвыя здарэнні. Разлічана на шырокае кола чытачоў.



Да 600-годдзя ўсталявання запаведнага рэжыму Белавежскай пушчы выдавецтва "Беларусь" выпусціла ў свет фотаальбом *"Белавежскае дзіва"*. У выданні распавядаецца пра гісторыю запаведнага кутка Беларусі, шырока прадстаўлены фотаздымкі прыгожых краявідаў, а таксама раслінны і жывёльны свет Белавежскай пушчы. Укладальнікі і аўтары тэксту **І. БЫШНЁЎ і М. ЧЭРКАС**. Выкарыстаны таксама дакументальныя фота з Беларускага дзяржаўнага архіва.

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў серыі "Скарбы роднай прыроды" пабачыла свет ілюстраванае выданне **Святланы ГУК** *"Бабраня на Бузянцы"*. Пра разнастайны і вялікі раслінны свет і яго насельнікаў баброў, што ў Бярэзінскім біясферным запаведніку, распавядаецца ў гэтай арыгінальнай кнізе. Фота І. Бышнёва. Афармленне Н. Барай. Для малодшага школьнага ўзросту.

Гісторыя культуры ў канспектах

Забеспячэнне навучальнага працэсу па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла ў сучасных умовах уяўляецца надзвычай складанай справай. Трэба браць у разлік і змяненне адукацыйных стандартаў, і дынаміку сацыякультурных працэсаў у эпоху постмадэрна, і вельмі шырокія магчымасці студэнтаў атрымліваць інфармацыю. Усё гэта было ў дастатковай меры ўлічана аўтарамі канспекта лекцый па асновах культуралогіі, падрыхтаваным на кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка (Мінск, "Асар", 2008). Дадзенае вучэбнае выданне напісалі доктар гістарычных навук, прафесар С. Снапкоўская, кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. Вараб'ёва, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт В. Іўчанка, старшы выкладчык гэтай кафедры Н. Здановіч.

У кнізе "Асновы культуралогіі" перш за ўсё вызначаецца месца культуралогіі ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў. Аўтары выразна паказваюць, што "многія навуковыя дысцыпліны даследуюць культуру са сваіх спецыфічных пазіцый, асаблівасцей прадмета даследавання" і, у прыватнасці, бачаць спецыфіку культуралогіі ў тым, што яна "разглядае культуру як самастойны аб'ект даследавання, вывучае яе комплексна, цэласна, інтэграцыйна, сістэмна".

Чытачы маюць магчымасць атрымаць веды пра гісторыка-культурны працэс. Аўтары знаёмяць іх як з крытэрыямі тыпалогіі культуры, так і з той воссю, на якую нанізваюцца культурна-гістарычныя канцэпцыі.

У канспекце лекцыі змешчаны даволі ўдалы варыянт блочнай падачы гісторыі сусветнай культуры. Ён дазволіў выразна паказаць квінтэсенцыю культурнай спадчыны першабытнага грамадства, старажытнаўсходніх цывілізацый, антычнасці, заходнееўрапейскага сярэднявечча, эпохі Адраджэння, Новага часу (XVII ст.), эпохі Асветніцтва, Заходняй Еўропы XIX ст., еўрапейскай культуры XX ст.

Аўтары прасочваюць асноўныя этапы гісторыі айчыннай культуры. Паказваючы беларускую культуру ў еўрапейскім інтэр'еры, яны дэманструюць выдатнае разуменне дыялектычнага адзінства агульнага і асаблівага. Адносна агульнага цікава было даведацца, што "ўсе еўрапейскія культуры, у тым ліку і культура Беларусі, маюць шэраг агульных элементаў:

1. Лацінскі алфавіт пісьмовай мовы (у нас у дадатак да кірыліцы).

2. Лацінскія карані ў многіх словах нацыянальных моў.

3. Агульнаеўрапейскія мастацкія стылі (ад раманскага да разнастайных кірункаў постмадэрна)".

Звяртаючыся да унікальнасці беларускага рэгіёна, С. Снапкоўская, В. Вараб'ёва, В. Іўчанка, Н. Здановіч пераканаўча даказалі, што "культура Беларусі — сінтэз усходне- і заходнееўрапейскай культур", што "тэрыторыя Беларусі — [...] унікальная тэрыторыя з захаванай аўтэнтычнай (традыцыйнай) культурай", "рэгіён, без якога не вырашыць глабальныя навуковыя праблемы сучаснай Еўропы".

У кнізе абагульнена культурная спадчына першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Аўтары сістэмна разбіраюць адпаведныя археалагічныя культуры, пераканаўча даказваюць іх этнічную прыналежнасць, рупліва прасочваюць іх сацыяльнае вымярэнне.

Цікава распавядаецца пра культуру Беларусі эпохі зямель і дзяржаўкнястваў (IX — сярэдзіна XIII ст.). Аўтары, безумоўна, маюць рацыю, калі сцвярджаюць, што "у IX — XI стст. на тэрыторыі Беларусі складваўся асаблівы тып культуры ў рамках хрысціянскай цывілізацыі ў працэсе фарміравання дзяржавы". У падручніку дэталёва паказаны "яе характэрныя рысы да сярэдзіны XIII ст." Разам з тым, аўтары ніяк не ўзгадваюць пра культуру Смаленскага княства. Добра вядома, што Смаленшчына — спрадвечна беларуская зямля. Беларускі характар культуры Смаленскага княства (IX — сярэдзіна XIII ст.) даўно даказаны аўтарытэтнымі спецыялістамі.

Бездакорнай у навуковым і метадычным планах атрымалася характарыстыка культуры Беларусі часоў станаўлення цэнтралізаванай дзяржавы (сярэдзіна XIII—канец XV ст.). Чытач падводзіцца да высновы аб тым, што "галоўным вынікам цывілізацыйнага развіцця ад пачатку XIII да канца XV ст. стала фарміраванне новай сацыякультурнай прасторы, завяршэнне этнічнай кансалідацыі і паступовая інкультурацыя ў цэнтральнаеўрапейскі рэгіён".

Аўтарам удалося вылучыць найбольш адметныя рысы культуры часоў Адраджэння і рэфармацыйнага руху ў Беларусі (XVI—30-я гг. XVII ст.). Яны зусім абгрунтавана паказваюць беларускае Адраджэнне як адну з разнавіднасцяў паўночна-еўрапейскага Адраджэння, ацэньваюць першы этап Рэфармацыі на Беларусі як умераны, другі — як радыкальны, а адносна трэцяга адзначаюць, што менавіта тады "акцэнты перамяшчаюцца з крытыкі сацыяльных асноў грамадства на крытыку пануючага рэлігійна-філасофскага светапогляду".

Вычарпальна раскрыты стан і тэндэнцыі развіцця культуры Беларусі сярэдзіны XVII—XVIII ст. З кнігі можна даведацца, што "гэта вельмі супярэчлівы перыяд. З аднаго боку, да сярэдзіны XVII ст. культура развівалася на хвалі руху Адраджэння ў рэчышчы заходнееўрапейскай культуры. З другога — пачынаецца працэс замаруджвання развіцця беларускага этнасу па шэрагу знешне- і ўнутрыпалітычных прычын". С. Снапкоўская, В. Вараб'ёва, В. Іўчанка, Н. Здановіч падрабязна раскрылі дыферэнцыяцыю культуры, асаблівасці развіцця грамадска-палітычнай і прававой думкі, унутраныя і знешнія дэтэрмінанты адукацыйных працэсаў, праявы стылю барока і класічнага стылю ў мастацкай культуры на ўказаным этапе гістарычнага развіцця.

У кнізе дадзена агульная ацэнка беларускай культуры ў перыяд знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Аўтары выявілі новыя тэндэнцыі ў развіцці архітэктуры, скульптуры, жывапісу, тэатральнай і музычнай культуры, мастацкай літаратуры, беларускай мовы ў той час.

Ацэньваючы культуру БССР, навукоўцы праяўляюць поўную адсутнасць ангажаванасці, максімум аб'ектыўнасці. Яны даюць збалансаваныя ацэнкі беларускай савецкай культуры. Са зместу падручніка вынікае, што ў яе спадчыне маюцца як станоўчыя, так і негатыўныя моманты. Называюцца мноства імёнаў дзеячаў беларускай савецкай культуры, маштаб якіх падаецца вельмі значным і ў XXI стагоддзі. Разам з тым, аўтары паказваюць, што ідэалагічная зашоранасць, выпустошванне агульначалавечых каштоўнасцяў, сістэматычнае ўмяшальніцтва з боку партыйнай наменклатуры нанеслі істотную шкоду развіццю беларускай культуры.

Аўтары разглядаюць постсавецкую айчынную культуру як у беларускім, так і глабальным інтэр'ерах. Пры гэтым акцэнт зроблены на паказ арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага і практычнага аспектаў дзяржаўнай культурнай палітыкі. Прыведзена мноства фактаў, якія дазваляюць прасочваць пэўную дынаміку па кожным з пералічаных аспектаў.

У плане забеспячэння навучальнага працэсу па культуралогіі даволі каштоўнымі ўяўляюцца тры дадаткі да рэцэнзуемай працы.

Першы дадатак уяўляе сабой храналагічную табліцу па культуры Беларусі. Практычна няма ніводнай істотнай падзеі ў гісторыі айчыннай культуры, якая не была б улічана ў гэтай табліцы.

Другі дадатак змяшчае персаналіі па сучасным мастацтве Беларусі. Трэці ж дадатак уключае асноўныя культуралагічныя паняцці. Ён вельмі зручны для падрыхтоўкі экзаменацыйных і заліковых пытанняў і заданняў.

Аўтары выкарысталі 137 крыніц, што ў суме змяшчаюць велізарны факталагічны масіў, які і быў па-майстэрску абагульнены ў кнізе.

"Асновы культуралогіі", такім чынам — каштоўнае выданне, якое будзе карысным і для студэнтаў, і для выкладчыкаў ВНУ.

Міхаіл СТРАЛЕЦ,
доктар гістарычных навук

Ацэньваючы культуру БССР, навукоўцы праяўляюць поўную адсутнасць ангажаванасці, максімум аб'ектыўнасці. Яны даюць збалансаваныя ацэнкі беларускай савецкай культуры. Са зместу падручніка вынікае, што ў яе спадчыне маюцца як станоўчыя, так і негатыўныя моманты. Называюцца мноства імёнаў дзеячаў беларускай савецкай культуры, маштаб якіх падаецца вельмі значным і ў XXI стагоддзі. Разам з тым, аўтары паказваюць, што ідэалагічная зашоранасць, выпустошванне агульначалавечых каштоўнасцяў, сістэматычнае ўмяшальніцтва з боку партыйнай наменклатуры нанеслі істотную шкоду развіццю беларускай культуры.

Ад эмоцыі да пачуцця

Чалавечы лёс поўніцца шэрагам супадзенняў, якія, безумоўна, больш значныя для нас, чым мноства стэрэатыпных і таму зразумелых, прадказальных падзей. Магчыма, таму гэтыя хаатычныя, нечаканыя імпульсы ў шэрай рэчаіснасці быцця і прыводзяць да руху людскія пачуцці, становяцца крыніцай невычарпальнай па сваёй сутнасці духоўнай энергіі жыцця.

Аб такім чароўным патэнцыяле выпадковасці і магчымых яе наступствах кніга "Луны печали" маладой гомельскай паэткі Марыі Маліноўскай:

Ты умер мной. Спустя почти три года
Я родилась. Тобой.
Как я пишу твоей небесной Нотой,
Ты пел моей Стопой.

Певец — Поэт. Совпало:
Поэт — Певец.
Как я — твое Начало,
Ты мой Конец.

На старонках невялікага па памерах выдання — складаная палітра эмоцый (нярэдка супрацьлеглых, алагічных), у якой паступова нараджаюцца сапраўды шчырыя, непадробныя, трывалыя пачуцці. Аналізуючы навакольны свет, аўтарка прапускае кожную яго праяву праз сваё ўспрыманне, што выклікае няспынны ланцужок самарэфлексій. Каханне, якое перапаўняе душу юнай паэткі, абвастрае ў ёй пачуццё прыгожага і ператварае выпадковае здарэнне (мімалётны погляд, мімаходзь кінутае слова) у Падзею, якая здольна назаўсёды застацца ў кампазіцыі жыцця М. Маліноўскай. Менавіта таму зноў і зноў вяртаецца лірычная гераіня паэткі да вобраза Каханага, змяняючы яго, развіваючы, па-рознаму разумеючы сваё месца побач з ім ("Я предана ему...", "Я счастлива, будучи Вашей женой...", "Ты во мне, будто гибель. Пожизненно", "Ни с кем тебя я сравнивать не буду...", "Неужели на свете нет средства, / Чтобы снова тебя полюбить?.." і інш.). Юнацкі максімалізм лірычнай гераіні М. Маліноўскай у многім абумоўлівае тую палымяную бескампраміснасць, з якой звяртаецца паэтэса да свайго чытача:

С годами становится привязью
Любая привязанность...

Імкненнем лірычнай гераіні М. Маліноўскай да асэнсавання свайго ўласнага "Я" тлумачыцца актыўны зварот паэткі да вобраза месяца, які ў агульнаеўрапейскай традыцыі цесна звязаны з вобразам люстэрка. Блізкасць дадзеных паняццяў у народным уяўленні не выпадковая і матываванa такой уласцівасцю згаданага прыроднага аб'екта, як адлюстраванне сонечнага святла. Яднаюцца вышэй адзначаныя вобразы і ў прасторавым плане, бо царыца начнога небасхілу, як і адбітак чалавечага твару на халодным шкле, заўсёды звернуты да людзей адным бокам. Менавіта таму аўтарка, здзяйсняючы пакутлівы акт самаразумення, звяртаецца да месяца як да спецыфічнага кампанента сваёй ментальнай сутнасці.

Ідучы за традыцыйнай трактоўкай вобраза Селены, М. Маліноўская цесна звязвае месяц з інтымнай тэматыкай, робячы яго, такім чынам, важным элементам сумнай гісторыі кахання:

До встречи, милый.
Ждать осталось мало, ведь Господь,
Вложив перо и кисть
вложил и пульс мне в руку, —
Молчишь... В молочно-голубой реке
дробится трость
Стареющей луны.
Как хлеб, крошатся звуки...

На няспынным шляху ад стыхійна-эмацыянальнага да рэфлексійнага асэнсавання свайго ўнутранага свету і навакольля паэтка нярэдка звяртаецца да своеасаблівага вербальнага эксперыменту, быццам выпрабоўваючы слова на трываласць, здольнасць перадаваць думкі, пачуцці, настроі:

Вечерний воз —
дух (в краску, но не в кровь)
Уже не сладкий, но ещё не сладостный.
Как от — звук, вз—мах,
вдоль собственных шагов
Иду с твоей улыбкой —
с недосказанной...

Эмацыянальнасць — выразная прыкмета дадзенага паэтычнага зборніка, што ў значнай ступені абумоўлена ўзростам яго аўтаркі. Бо менавіта юнацкасць з характэрнымі ёй пераменай настрояў, трывожнасцю, максімалізмам і неўраўнаважанасцю пачуццяў здольная на самую высокую ступень экспрэсіі:

В перчатки? — Нет! —
В тень поцелуя пальцы.
*Как связываю, так и рву — **сама.***
Таким, как я, — сходить,
но не с дистанций.
А с ума.

Але нягледзячы на выразную арыентацыю маладой паэткі на даследаванне і рэпрэзентацыю пачуццёвага аспекту свойго ўнутрана "Я", у кнізе прысутнічаюць і філасофскія роздумы. Кантраснасць гэтага сусвету, памежнае існаванне ў ім шчырасці і фальшы, дабра і зла, прыгажосці і пачварнасці, абыякавасць людзей да любых праяў высокага, светлага пачатку у іх жыцці выклікаюць у душы паэткі глыбокае расчараванне ў вялікай місіі чалавека быць вяршыняй Боскага тварэння, гаспадаром Зямлі:

В одном кабаке под скрипучим столом
Заметил мой дух,
замерев над планетой,
Пьянчугу с уродливо-Вашим лицом,
С глазами уродливо-Вашего цвета.

О тонкости Вашей закончился миф.
Ударился дух мой о чёрствую землю.
Упал и погиб,
так нелепо прожив
Под самым большим
из людских заблуждений.

Безумоўна, лірыка М. Маліноўскай шмат у чым ператкоўская. Творы яе прасякнуты шчырымі спробамі аўтаркі знайсці свой уласны шлях да паэтычнага майстэрства. У цэлым жа імкненне маладой паэткі да пошуку новых формаў лірычнага самавыяўлення — шматлікія гульні са структурай вершаванага твора, пошук гука-колераваў гамы слова — разам са зместавай глыбінёй і кранальным юнацкім абсалютызмам вартыя самай пільнай чытацкай увагі.

Марына ШКРЭБЛІК

У несмяротнай песні

Любоў да сваёй Радзімы, да Бацькаўшчыны — неўміручая ў душы сапраўднага творцы. Гэтую ісціну пацвярджае ўся сусветная літаратура. І калі родны край змушаны трываць горкія выпрабаванні — ліра паэта не застаецца ўбаку, а наадварот — кліча і плача, услаўляе герояў і ганьбіць захопнікаў. Так было і ў сівую даўніну, і ў векапомныя гады Вялікай Айчыннай... Чытаючы творы айчынных паэтаў, прысвечаныя роднаму краю, упэўніваешся яшчэ ў адным: слова, вымаўленае на незвычайным уздыме чалавечай душы, робіцца вечным і спраўджваецца ўвесь час, застаючыся блізкім і зразумелым далёкім нашчадкам. Менавіта таму і малітоўныя радкі, напісаныя Янкам Купалам стагоддзе таму, і шчымлівае "Маці спаткаеце, — ёй не кажыце" Міколы Сурначова, і элегічна-ўзнёслыя вершы Пысіна і Караткевіча, і строгая філасофія Куляшова так кладуцца на душу і сэрца нам, жыхарам XXI стагоддзя, нагадваючы пра святы абавязак "жыць і помніць", не забываць пра найвялікшую трагедыю, што 65 гадоў таму скаланула родную зямлю. І не забываць таксама вялікіх сыноў Беларусі, якія паклалі на алтар Радзімы свае жыцці дзеля яе вызвалення.

Янка КУПАЛА

Мая малітва

Я буду маліцца і сэрцам і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

Я буду маліцца да яснага сонейка,
Няшчасных зімой саграваць сірацін,
Прыветна па збожных гуляючы гонейках,
Часцей заглядаці да цёмных хацін.

Я буду маліцца да хмараў з грымотамі,
Што дзіка над намі гуляюць не раз,
Каб жаль над гаротнымі
мелі бяднотамі,
Градоў, перуноў не ссылалі падчас.

Я буду маліцца да зорак і жаліцца,
Што гасяць сябе надта часта яны,
Бо чуў, як якая з неба з іх зваліцца,
З жыцця хтось сыходзе на вечныя сны.

Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю,
Каб лепшаю ўродай плаціла за труд,
Збагаціла сельскую хату пахілую,
Надзеі збытымі убачыў наш люд.

Я буду маліцца і сэрцам і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Не вылі над роднай зямлёй, нада мной.

Мікола СУРНАЧОЎ

У стоптаным жыце

Ніколі не ехаць
Хлапцу маладому
Да блізкага гаю,
Да роднага дому.

Над ім асыпаюцца
Слуцкія краскі,
Абсмалены колас
Схіліўся да каскі.

Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце, —
Маці спаткаеце, —
Ёй не кажыце.

Пятрусь БРОЎКА

Родны край

Беларусь!
Смольны бор,
Над імхамі духмяністы верас,
Вераснёвы прастор,
Што праменнямі сонца звініць.
Беларусь!
Хто любоў да цябе можа змераць?
Акіяны не маюць такой глыбіні.

Беларусь!
Родны край!
Ты жывеш! Маці стрэлася з сынам.
Ён спяшаўся ісці.
Многа сцежак прайшоў франтавых.
І чырвона-чырвона
Цвітуць арабіны
Па шляхах, па гаях,
Па шырокіх палетках тваіх.

Беларусь!
Сінь азёр!
Кружыць, кружыць асенняе лісце...
Як ты дорага нам,
Як нішто і ніколі ў жыцці.
Беларусь, дай напіцца
З празрыстай крыніцы,
Бо ісці нам з баямі,
Далёка-далёка ісці.

Беларусь!
Твой мурог,
Можа, з радасці слёзамі росны;
Ты з палону ўстаеш,
Паглядзі, як праходзяць сыны.
І шумяць і завуць
Іх бярозы, яліны і сосны,
Кліча Буг, горды Нёман
І хвалі шырокай Дзвіны.

Пімен ПАНЧАНКА

Краіна мая

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях
Сынава сэрца рыдае.

Ты часта прыходзіш ка мне, як сон.
Хмараю праплываеш,
Птушкай садзішся на ціхі клён,
Звонкім дажджом ападаеш.

Тады ўспамінаецца ўсё да драбніц,
Што звязана з родным краем, —
Як жыта шуміць,
як агонь зарніц
На дне азёр дагарае.

Як летам спякотным за днямі дні
Ішлі па іржышчы калючым...
Мы ранілі ногі аб камяні,
І нам не было балюча.

І не было нічога ярчэй
За сонца на родным небе,
І не было нічога смачней
Матчынага хлеба.

Вада з прыдарожнага ручая
Была саладзей за мёд нам...
Краіна мая,
маці мая,
Лёс твой цяжкі і гаротны!

Топча, катуе тваю зямлю
Вылюдак ашалелы.
Я кроў да апошняе кроплі пралью,
Каб толькі табе палягчэла.

Ні славы, ні скарбаў я не хачу,
Мне б толькі прыйсці непрыкметна,
Зямлю сваю пад нагамі адчуць,
Надыхацца родным паветрам.

Максім ТАНК

Беларусь

Я разгадаць не раз хацеў
Твой дзіўны вобраз, і заўсёды
У час асенняй непагоды
Мне засланяла хмараў цень.
Калі ж прадвеснем залатым
У рысы твару я ўглядаўся, —
Як сонца, прамянела ты.
Зноў неразгаданым тады
Твой вобраз для мяне застаўся.

Я чуў у песнях голас твой
І бачыў харастваубору
У простых матчыных узорах,
У вобліку зямлі маёй.
Жывую хроніку вякоў,
Што Нёманам,
Дняпром шумела,
Чытаў з граніту гарадоў
І з безыменных курганоў,
Што азарыў агнём Гастэла.

У сказах-думах песняроў
Была ты часам сірацінай,
Была гаручаю калінай,
Што ў полі расцвіла зарой;
Была слязой, ў якой мігцяць
Расстання і сустрэчы зоры,
Была, як сонца ўзняты сцяг,
Была дарогаю жыцця,
Без краю кінутай ў прасторы.
Але такой, як сёння ты

З'явілася, ніхто не бачыў.
Гарэлі полымем гарачым
Асін пажоўклыя лісты.
А з пералескаў і дуброў
Плылі вячэрнія туманы.
У змрочнай засені лясоў
Каля распаленых агнёў
Адпачывалі партызаны.

А цішыня з усіх старон.
Адно чуваць, як у азёры
Са звонам ападаюць зоры
І ціхі раненага стогн.
У ноч такую не да сну:
Ўсё бачыш родныя дарогі,
Сінь Нарачы, Беразіну,
Абвугленую старану.
У сэрцы кожнага трывога...

І вось тады, ў паўночны час,
Па цёмных нетрах і палянках
Ты падыходзіш, партызанка,
Хадою ціхаю да нас.
Каму гаючы сон дасі,
У будучыню шлях пакажаш,
Каму паможаш пагасіць,
Развеяць сум на верасы
І чула раны перавяжаш;

Надзеяй асяніш жывых,
Над раненымі схіліш постаць,
Як маці, і на жвір пагосту,
Сабраўшы з нетраў баравых,
І з сенажацяў, і з палёў
І краскі лепшыя, і збожжа,
Зарніцы майскіх вечароў
Ты, як вянок, ля ног байцоў,
Расой асыпаны, паложыш.

І пойдзеш зноў шляхамі ты
Нязведанымі, баравымі,
І толькі ўсюды тваё імя
Мне шэпчуць травы і лісты,
Гудуць свабодныя вятры,
Вандруючыя ў паднябессі.
І там, дзе яркія кастры
Гараць, як полымя зары,
Звініш у несмяротнай песні.

Аркадзь КУЛЯШОЎ

* * *

Я хаце абавязаны прапіскаю —
Калыскаю, падвешанай пад столь.
Я маці абавязан кожнай рыскаю,
Драўлянай лыжкаю,
глінянай міскаю —
Усім, чым працы абавязан стол.

Я — матчын спеў,
я — матчыны трывогі,
Я — матчын гнеў, які ўставаў на ногі,
Гнаў смерць на Захад —
у нару з нары —
Трацілаваю пугай перамогі.
Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры.

Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я,
каб дым і пыл
Зямлю ператварылі ў бамбасховішча,
Мільярд прапісак —
у маўклівы прысак,
Мільярд калысак — у мільярд магіл.

Аляксей ПЫСІН

* * *

Палім мы маршанскую махорку,
Бачым мы Дняпроўскую граду.
Будзе сёння бой. На тым узгорку,
Можа, я таксама упаду.

Будуць травы над курганам. Будуць
Адлятаць у вырай жураўлі.
Нас, напэўна, ў свеце не забудуць,
Ўспомняць, што на свеце мы жылі.

...Я гляджу на даўняе курганне,
На траву, на рыжых мурашоў.
Ведайце: калі мяне не стане —
Я ў сваю дывізію пайшоў.

Адам РУСАК

Лясная песня

О, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры,
Ой, шумлівы ты, лес малады,
Толькі сэрцам пачую
Тваю песню лясную
Ды успомню былыя гады.

Ды успомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных снягоў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў.

Край любімы, мой родны,
Ты на свеце свабодны,
За цябе я на бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб заўсёды у шчасці ты жыў.

Адышлі тыя годы,
Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.
Ой, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры,
Вас ніколі ў жыцці не забыць.

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

* * *

У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую зямлю, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць.
Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха — быццам зніклі людзі ўсе.
Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму...
Ляцяць на ветры косы рыжай восені,
І кліча лісцяў жоўты сум зіму.
На вуснах стыне горкі сум рабіны,
Цалую іх, халодныя як лёд.
О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край і далеч,
І жоўты ліст на восені травы,
Што ў векавечнай бацькаўшчыне клёны
Тысячагоддзі будуць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць,
Што нездарма яна з асінак рудых,
Калі ідзеш увосень па зямлі,
Раняе золата пад ногі людзям,
Каб мы яе любілі й бераглі.

Мікола КУПРЭЕЎ

Вечнае

Сівенькая маці блукае
сотні гадоў ля ракі,
сына Івана гукае
на ўсе чатыры бакі.

З боку Расіі — ціха,
з Нямеччыны — немата,
з Украіны — ні слыху,
з Магілёва — вада.

Над галавою — аблокі,
пад нагамі — пясок...
Зноў адышла ў глыбокі
пад крыжамі лясок.

Анатоль СЫС

Каля твайго парога

Вясёлка над Белай Руссю —
гэта мая мара,
ляцяць пад вясёлку гусі,
нібы пад вянец, па парах.

Туманы над Белай Руссю —
гэта мая самота,
да белай зямлі тулюся,
аб ёй мой найпершы клопат.

Завеі над Белай Руссю —
гэта мае трывогі
па песнях знябытых гусляў
каля твайго парога.

Старонкі з дакументальнай аповесці

Восенню 1943 года ў акупіраваны Мінск па татальнай мабілізацыі трапіў Ганс Кулас — муляр з нямецкага горада Гале. Яго бацька — Франц Кулас — падчас Першай сусветнай быў у рускім палоне і пасябраваў з такімі ж рабочымі, як і сам. Таму перад адпраўкай сына на ўсходні фронт ён даў наказ перайсці на бок Чырвонай Арміі, каб не страляць у яго былых сяброў. Сын выканаў наказ бацькі...

Юліян ВЫСОЦКІ

Таварыш Ганс

Сустрэча ў Мінску праз 37 гадоў — былы партызан Анатоль Клюйко, нямецкі антыфашыст Ганс Кулас, ягоны сын Аляксандр, былы камандзір партызанскага атрада імя Калініна Анатоль Алейнік і былы піянер-партызан Пётр Каліноўскі.

Фота з архіва аўтара, 1981 год

На невялікай пляцоўцы ля вёскі Каладзіно, амаль ушчыльную акружанай густымі лясамі, узвышаецца пастаўленая яшчэ да вайны трыангуляцыйная вышка. Тут — партызанскі назіральны пункт спецбрыгады імя Калініна. Той, хто некалі выбраў месца для вышкі, нібы прадбачыў, што партызанскім назіральнікам трэба будзе сачыць за ўсімі навакольнымі ляснымі дарогамі і самім заставацца незаўважанымі. З усходняга боку да вышкі ўшчыльную падступаў даволі высокі ельнік, што дазваляў непрыкметна мяняць пасты. З вышыні, як на далоні, вымалёўваліся лясныя дарогі, сцяжынкі, і нават асцярожнае прасоўванне па іх аднаго чалавека было бачна здалёку. Цяпер жа, калі з прыдарожных бяроз і асін абляцела долу апошняя лістота, нават заяц не мог прабрацца незаўважаным.

Шэрым асеннім досвіткам на назіральны пункт заступілі Антон Канапчук і Міхаіл Заяш. Яны праверылі тэлефонную сувязь са штабам брыгады, якая была праведзена яшчэ летам, і, ямчэй уладкаваўшыся на добра абсталяваных месцах, кожны заняў свой сектар агляду. У цэйсаўскіх палявых біноклях выразна праступала кожнае дрэва, кожны кусцік. Калі скупое восеньскае сонца выглядала з-за нізкіх хмар, зямля, усланая лісцем, успыхвала рознакаляровымі пералівамі стракатых дываноў. Удалечыні вымалёўваліся стрэхі хат вёскі Распуцце.

Дзяжурства ішло спакойна. Назіральнікам здавалася, што ніякіх надзвычайных здарэнняў у гэты дзень не будзе. Але гадзін каля дванаццаці на лясной дарозе з боку шасейкі Мінск — Слуцк паказаліся дзве аўтамашыны. Антон Канапчук адразу ж пазваніў у штаб.

— З боку шашы Мінск — Слуцк бачу дзве аўтамашыны! — далажыў Канапчук дзяжурнаму.

— Немцаў многа? — запытаў Пак.

— Адгэтуль не відаць, колькі ў кабінах, а ў кузавах нікога няма.

— Працягваць назіранне! Высылаю дзяжурны ўзвод.

Хвілін праз дзесяць узвод, узняты па трывозе, патайной сцяжынай праз балота выйшаў насустрач невядомым падарожнікам. За балотам, ля развілкі дзвюх лясных наезджаных дарог, партызаны занялі пазіцыі, замаскіраваліся. Яны выдатна бачылі дзве аўтамашыны, што павольна рухаліся, перавальваючыся з боку на бок, па выбітай лясной дарозе. Якраз на развілцы яны спыніліся. У кузавах і сапраўды не аказалася нікога. З кабін выйшлі пяць чалавек. Трое былі ў цывільным адзенні без зброі. Чацвёртым аказаўся высокі нямецкі салдат, узброены двума аўтаматамі — нямецкім і рускім. Следам за ім ішоў другі гітлераверец.

Невядомыя заспрачаліся. Цывільныя даводзілі, што трэба павярнуць у лес і самім шукаць партызан, а высокі немец, не згаджаючыся і паказваючы ў бок вёскі, нешта горача гаварыў па-свойму.

— Стой! Кідай зброю! Рукі ўгору! — прагучала раптам каманда, і прыдарожныя кусты ашчэрыліся дуламі аўтаматаў і вінтовак. Высокі салдат усміхнуўся, ахвотна аддаў абодва аўтаматы партызанам, што выскачылі на дарогу, і даволі спакойна прамовіў:

— Я — не фашыст! Я — ваш друг!

Другі немец аўтамат здаў неахвотна і пры гэтым баязліва азіраўся. У цывільных — гэта былі нашы ваеннапалонныя — зброі, вядома, не аказалася. Яны радасна віталі партызан, тлумачылі, што шукаць партызанскія месцы іх запрасіў высокі салдат Ганс, які даўно заводзіў з імі размову на гэтую тэму. Ён не тое, што іншыя гітлераўцы: абыходзіўся з ваеннапалоннымі па-людску, не крыўдзіў іх, не здзекаваўся, дапамагаў пілаваць і секчы лес, стараўся падкарміць іх са свайго салдацкага пайка.

Усё гэта яны паўтарылі ў штабе брыгады, куды іх выклікалі па адным. Камбрыг Леанід Сарока высвятляў, дзе гэтыя трое трапілі ў палон, што рабілі, чаму раней не ўцяклі ў лес. Пасля ў штабную зямлянку прывялі Ганса Куласа, запрасілі перакладчыка. Паказанні ён даваў ахвотна, расказаў усё, што ведаў аб аэрадромнай ахове, гаварыў, што даўно ненавідзіць фашызм, успомніў свайго бацьку — вялікага прыяцеля рускіх — і выклаў на стол усе пісьмы ад яго. Кулас перасцярог камандзіра наконт другога немца Курта Вернера, сказаў, што той звязаны з гестапа і, напэўна, не па сваёй волі столькі часу віжаваў за Гансам.

Сарока ўважліва прачытаў усе пісьмы, выслухаў Ганса і загадаў вывесці яго.

— Ну, што будзем рабіць з імі? — падняў ночы на камісара брыгады Пятра Сачка і забарабаніў пальцамі па стале. — Здаецца, добры хлопец, шчыры, можна паверыць яму, — разважыў услых, не дачакаўшыся адказу.

Пётр Сачок глядзеў за акно, дзе згушчаліся шэрыя раннія прыцемкі, буяла зелень ялін і кавалак неба моршчыўся нізкімі воблачкамі.

— Хто яго ведае, — нарэшце падаў голас камісар. — З ваеннапалоннымі ўсё амаль зразумела. А з гэтымі... — ён памаўчаў. — Нешта я не асабліва веру ў фашысцкую шчырасць. Гестапаўцы на ўсе рукі майстры, могуць і не такі спектакль разыграць.

— А я чамусьці веру гэтаму хлопцу. Рабочы ўсё-такі. А што немец... Ці ж няма сярод немцаў антыфашыстаў. Успомні Франца Петэра.

— Ах Франц, Франц, — уздыхнуў камісар.

І перад імі, як наяву, паўстала ладная фігура чалавека з прыемным поўным тварам, з добрай сарамлівай усмешкай і лагодным мяккім позіркам.

...З'явіўся Франц у партызанскім лагеры майскай ноччу: яго і старшага лейтэнанта Булычова выкінулі на парашутах на партызанскія кастры. Байцы і цяпер са смехам успамінаюць прыгоду з Аркадзем Сачком — аднафамільцам камісара, якога таксама прызначылі ў групу па прыёме грузу, аб чым паведамілі ў чарговай радыёграме з Вялікай зямлі. Аркадзь быў аматарам пажывіцца тытунём ці біклажкай спірту, якія прысылаліся народным мсціўцам сярод іншых, таксама патрэбных, рэчаў. Вось і цяпер, як толькі над палянай, асветленай полымем пяці кастроў, пачуўся моцны гул авіяцыйных маторaў, і ў начным небе распусціліся парашуты, Аркадзь кінуўся за адным з іх у кусты. Хапіўся за груз, што павольна апускаўся на зямлю, каб развязаць цюк і знайсці жаданы для сябе трафей. Але, на яго вялікі жах, рукі зачапіліся за чалавека, які нешта грозна крыкнуў па-нямецку. Аркадзь аслупянеў. У наступнае імгненне ён стрымгалоў нёсся да камандзіра з шалёным ровам:

— На парашутах немцы!

Партызаны заляскалі затворамі, але ў гэты момант да іх, адшпіліўшы парашут, падбег Барыс Булычоў, які вазіў у Маскву важныя разведданыя і зноў вярнуўся ў брыгаду. Ён адчайна замахаў рукамі і закрычаў:

— Не страляць! Немец — партызан!

Усе з цікавасцю разглядалі афіцэрскія пагоны, якія ззялі маленькімі зорачкамі на плячах Булычова — такую форму бачылі ўпершыню... Партызаны кінуліся на пошукі немца і хутка падвялі яго да вогнішча. Ён быў у нямецкай ваеннай форме з афіцэрскімі сярэбранымі пагонамі, добра размаўляў па-рускі і прасіў адшукаць цюк, у якім былі яго асабістыя рэчы — усё неабходнае для выканання важнага разведзадання ў Мінску. Але нават агульнымі намаганнямі зрабіць гэта не ўдалося: патрэбны груз як у прорву ўцягнула.

Барыс Булычоў распавёў гісторыю з'яўлення Франца Петэра ў радах разведчыкаў Чырвонай Арміі. Мабілізаваны перад самай вайной з Савецкім Саюзам у рады вермахта, Франц трапіў на Усходні фронт у маі 1942 года і праз два дні ў раёне Смаленска добраахвотна перайшоў на наш бок. Пасля пяцімесячнай падрыхтоўкі ў саставе разведгрупы быў закінуты за лінію фронту, дзе добрасумленна выконваў ролю перакладчыка, удзельнічаў у захопе "языкоў", быў паранены ў схватцы з фашысцкім вартавым. За ўзорнае выкананне заданняў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, атрымаў воінскае званне лейтэнанта Чырвонай Арміі.

...Неабходныя для паходу ў Мінск дакументы прапалі той ноччу і трэба было рыхтаваць новыя, падбіраць або шыць новую афіцэрскую форму. Вырашылі паслаць Франца ў Мінск пад выглядам інтэнданта. Пакуль вялася неабходная падрыхтоўка, Петэр не сядзеў без справы: пісаў лістоўкі да нямецкіх салдат з заклікам здавацца ў палон партызанам.

У Мінску разведчык спыніўся ў афіцэрскай гасцініцы на рагу цяперашніх вуліц Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай. Праз нейкі час у брыгадзе атрымалі звесткі: "Інтэндант" (клічка Франца Петэра) пачаў дзейнічаць. Ён знайшоў сувязь з гаспадарамі некалькіх явачных кватэр і хутка паведаміў важныя разведданыя аб прыбыцці варожай ваеннай тэхнікі, дыслакацыі войск.

Ціхім вераснёўскім надвячоркам Франц Петэр выйшаў з гасцініцы і накіраваўся ў сталовую. Узброены аўтаматам, ён нетаропка крочыў па вуліцы, адказваў на прывітанні сустрэчных салдат, з журбой прыкмячаў першыя жоўтыя лісты на цудам ацалелых дрэвах уздоўж тратуараў, з болем у сэрцы заўважаў разбітыя дамы, нянавісць у вачах рэдкіх прахожых у цывільным, якія таропка праходзілі міма, спяшаючыся да пачатку камендацкай гадзіны вярнуцца дадому. Сцены стракацелі грознымі загадамі, якія заканчваліся бязлітасным нямецкім словам "tod" — смерць. Насустрач Францу ішоў камендацкі патруль. Ён спыніў Петэра і запатрабаваў дакументы. Тыя былі ў поўным парадку. Але, убачыўшы за плячом афіцэра аўтамат, старшы патруля прапанаваў Францу прайсці ў камендатуру. Аказалася, што наш разведчык парушыў сакрэтны загад каменданта, які забараняў афіцэрам насіць з сабою зброю, акрамя кабурнай. Партызанская разведка не змагла своечасова даведацца пра такі загад. Прыйшлося падпарадкоўвацца. Па дарозе ў камендатуру разведчык спрабаваў ущчыў праз разбураны дом па Інтэрнацыянальнай, але аўтаматная чарга скасіла яго. Так недарэчна загінуў мужны сын нямецкага народа, лейтэнант разведупраўлення Чырвонай Арміі кавалер ордэна Чырвонай Зоркі Франц Іяган Петэр.

...Пра яго цяпер кожны па-свойму думаў у штабной зямлянцы. Сарока, які не мог дараваць сабе гэтай непапраўнай памылкі, бадай, наўмысна завёў размову пра Петэра, каб хоць пры дапамозе такіх, няхай і нялёгкіх успамінаў, пераканаць камісара.

— Ну, што ж, — нарэшце прамовіў Сачок, — можа, і не падводзіць цябе інтуіцыя. Урэшце, ты — камандзір, і перад разведупраўленнем сам будзеш рабіць справаздачу.

— Не забывай, Пётр Аляксандравіч, што людскія душы і сэрцы якраз твая спецыяльнасць, — пажартаваў Сарока. Потым ён выклікаў начальніка сакрэтнага аддзела і камандзіра агентурнай разведкі Андрэя Мілюціна і загадаў:

— Праверце ўсіх па нашых каналах. Вернера пакуль трымаць пад вартай, а Куласа — у гаспадарчы ўзвод. Там паглядзім...

Амаль праз месяц — 6 лістапада 1943 года — пасля бою, у якім Ганс выратаваў камісара партызанскай брыгады, Кулас стаў байцом разведвальна-дыверсійнага ўзвода. Ён удзельнічаў у многіх баявых аперацыях, хадзіў у разведку, пасля вызвалення Мінска прымаў удзел у партызанскім парадзе, узнагароджаны медалём "Партызану Вялікай Айчыннай вайны" II ступені.

Аднак, нягледзячы на ўсё гэта, "пільныя" савецкія органы бяспекі выслалі Ганса Куласа ў Іркуцкую вобласць. Таму яго баявыя пабрацімы згубілі след свайго баявога таварыша. І толькі ў 1981 годзе былыя партызаны атрада імя Калініна знайшлі яго ў горадзе Чарамхова Іркуцкай вобласці, і ён разам з сынам Аляксандрам прыехаў у Мінск.

Пра гераізм і няпросты лёс немца-антыфашыста — дакументальная аповесць Юліяна Высоцкага "Таварыш Ганс", якая будзе друкавацца ў сёлетнім ***ліпеньскім*** *нумары часопіса "Полымя".*

Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача паставіў гераіка-фантастычную драму "Бліндаж" паводле п'есы Алены Паповай. Рэжысёр Наталля Башава, мастак-пастаноўшчык Вольга Мацкевіч. Спектакль адметны тым, што распавядае пра Вялікую Айчынную вайну ненавязліва, праз модны сёння прыём напластавання часоў.



Містэрыя на тэму

Бестурботныя, але рамантычныя маладзёны Паша і Марына з камп'ютэрнымі мянушкамі Падрэ і Мара, знячэўку апынуўшыся ў іншай рэальнасці, сутыкаюцца з суровымі прадстаўнікамі ваеннага пакалення, што, застыглыя ў часе, вядуць вечнае змаганне за ўтрыманне сваёй метафізічнай Вышыні. П'еса А. Паповай цікавая тым, што, як твор постмадэрновай парадыгмы, пакідае за чытачом права трактоўкі адлюстраваных падзей. Рэжысёр Н. Башава дала ім сваю інтэрпрэтацыю — і ў выніку твор займеў больш традыцыйную развязку з пэўным хрысціянскім падтэкстам.

Спектакль "Бліндаж" стаўся своеасаблівай тэатральнай містэрыяй на тэму Вялікай Айчыннай вайны. Ён выклікае самыя розныя, нават процілеглыя меркаванні, але, бясспрэчна, прымушае гледача задумацца і вяртае цікавасць да "заезджанай" ваеннай тэматыкі. Дык што прымусіла ТЮГ звярнуцца менавіта да гэтага драматургічнага матэрыялу? Што тэатр знайшоў у ім актуальнага і вартага, каб быць данесеным да сённяшняй моладзі? Над гэтымі пытаннямі разважаюць самі стваральнікі спектакля.

Наталля Башава, рэжысёр-пастаноўшчык:

— Я лічу, што даты, звязаныя з падзеямі вайны, ніяк нельга абмінаць. Падабаецца нам гэта ці не, але гэта самая элементарная повязь пакаленняў. Як маладым людзям, якіх захапляюць тату і пірсінгам, растлумачыць, распавесці пра тую вайну, сведкаў якой з кожным днём застаецца ўсё меней? І наогул, ці варта гэта рабіць? Мне здаецца, што ў п'есе Алены Паповай утрымліваюцца адказы на гэтыя пытанні. Я ўгледзела ў гэтым матэрыяле вельмі слушную думку — што вайна ёсць заўжды. Бо як тады кваліфікаваць усе гэтыя паведамленні ў зводцы навін пра высокую смяротнасць у выніку злачынстваў, суіцыду, наркаманіі? А героі п'есы — звычайная сучасная моладзь, якая курыць, выпівае, марыць атрымаць дыплом і зарабіць шмат грошай... Не ведаю, ці было закладзена гэта драматургам, але ў фінале нашага спектакля прасочваецца хрысціянская ідэя. Прадстаўнікі розных пакаленняў — ваеннага і сучаснай моладзі — даруюць адно аднаму грахі. Але вайна не заканчваецца. Барацьба паміж дабром і злом ідзе заўжды, кожную хвіліну, кожную секунду. І хочам гэтага ці не, мы знаходзімся на тым ці на іншым баку.

Алена Папова, аўтар п'есы:

— Тэма вайны і актуальная, і вечная. Калі задумваешся пра гісторыю чалавецтва, узнімаешся над маленькімі местачковымі інтарэсамі да праблем глабальных, дык разумееш, што гэта адна з галоўных тэм чалавечых узаемаадносін — як у агрэсіі, так і ў супрацоўніцтве. Паглядзіце, колькі ў свеце агнявых кропак! Заплюшчваць вочы на гэтую з'яву — мяшчанская пазіцыя: "Абы ціха. Дзесьці абвешчана пандэмія, але нас гэта не датычыць". Мінулая вайна была сапраўды найскладанейшым і найстрашнейшым выпрабаваннем для чалавецтва, забывацца на гэта проста ніяк нельга. Вайна працягваецца ў розных кутках свету, і нават ёсць перадумовы для яе разгортвання ў глабальным маштабе, бо растуць запасы зброі на планеце і г. д. Безумоўна, гэтая праблема вартая ўвагі юнага гледача: нельга, каб моладзь расла непадрыхтаванай, неабароненай. Тэатр надаў п'есе крыху іншае гучанне, чым было ў тэксце першапачаткова. У мяне больш жорсткі фінал: палкоўнік Каламіец не сыходзіць разам са сваімі байцамі ў нябыт, а загадвае ім і надалей стаяць, адстойваючы сваю Вышыню.

Васіль Ніцко, выканаўца ролі Сяржанта:

— Заўсёды будзе актуальнай тэма Вялікай Айчыннай вайны: гэта наша гісторыя, наша мінуўшчына, на яе не варта забывацца, бо без мінулага няма і будучыні. Над спектаклем "Бліндаж" працаваць было цікава, бо тут прапаноўваюцца новыя нестандартныя вырашэнні знаёмай тэмы. На адным з яго апошніх паказаў у сталічным Палацы культуры імя Шарко ў глядзельнай зале сабралася такая моладзь "адвязаная" — з прафтэхвучэльняў, з рабочых раёнаў. Напачатку ўсе шумелі, гучна каменціравалі дзеянне, але паступова сцішыліся і ўважліва слухалі. Нам, акцёрам, было надзвычай прыемна, што нават такі глядач, які прыйшоў павесяліцца, падурэць, паштурхаць нагой крэслы перад сабой, раптам задумаўся — гэта ўжо само за сябе гаворыць.

Алесь СУХАДОЛАЎ

На здымках: артысты Т. Ражаўская (Марына), А. Зелянко (Паша), А. Кілеса (лейтэнант Прохараў), Іван Шрубейка (палкоўнік Каламіец) у сцэнах са спектакля "Бліндаж".

Фота Аляксандра Дзмітрыева

Як падарунак ветэранам

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр двойчы ўключыў у афішу гэтага месяца прэм'еру спектакля "Нябесны ціхаход", упершыню паказанага 8 мая, напярэдадні свята Перамогі, і прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі. "Нябесны ціхаход" напісаны ў 1995 годзе паводле аднайменнай савецкай кінакамедыі расійскім кампазітарам Маркам Самойлавым (з выкарыстаннем папулярных песень Васіля Салаўёва-Сядога "Потому, что мы пилоты", "Пора в путь-дорогу") і аўтарамі лібрэта Аляксеем Якаўлевым ды Вячаславам Вярбініным. На мінскай сцэне музычную камедыю паставілі рэжысёр Любоў Дзяменцева, мастак Іван Саўлачкоў, балетмайстар Аляксандр Бяскоў (усе трое былі запрошаны з Расіі), а таксама галоўны дырыжор тэатра Анатоль Лапуноў ды хормайстар Святлана Пятрова. У ролях — вядучыя артысты тэатра. Запланаваны два паказы новага спектакля напярэдадні Дня вызвалення, і на першы, які адбудзецца ў дзённы час, тэатр запросіць ветэранаў мінулай вайны.

С. ВЕТКА

На здымку: сцэна са спектакля "Нябесны ціхаход".

Фота Ігара Кузняцова

Квіток... на мільён!

Галіна Лазарчык, выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, стала пераможцай адкрытага конкурсу дызайну ўваходнага білета, што пяты год запар ладзілі Нацыянальны мастацкі музей Беларусі ды яго генеральны партнёр "Брытыш-Амерыкан Табака Трэйдынг Компані". Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала 44 работы трыццаці чатырох, пераважна маладых, аўтараў. Галоўны прыз, які атрымала пераможца Галіна Лазарчык, складае 1 мільён беларускіх рублёў. А яе работа праз нейкі час будзе распаўсюджвацца сярод мільёнаў наведнікаў Нацыянальнага мастацкага музея: уваходны білет новага дызайну (гл. фота) з'явіцца тут з пачаткам 2010 года.





Я. КАРЛІМА

Чэрвень запомніцца тым, што...

●●● у Беларускай дзяржаўнай філармоніі прайшла прэс-канферэнцыя, прысвечаная закрыццю сімфанічнага сезона. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь Аляксандр Анісімаў падсумаваў вынікі сёлетняй канцэртна-гастрольнай дзейнасці калектыву і распавёў пра планы. Яны пачалі ўжо спраўджвацца. Так, 11 чэрвеня ў Вялікай зале БДФ адбыўся заключны сімфанічны канцэрт сезона: аркестр пад кіраўніцтвам А. Анісімава ўключыў у праграму "хіты" сусветнай класікі — Пятую сімфонію С. Пракоф'ева і Другі фартэпіянны канцэрт С. Рахманінава. Партыю саліста выканаў знаны беларускі піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў Андрэй Сікорскі. Цяпер А. Анісімаў рыхтуе маштабную музычную акцыю да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкага ярма: 5 ліпеня ў Палацы Рэспублікі пад кіраўніцтвам маэстра прагучаць Сёмая сімфонія Д. Шастаковіча і "Балеро" М. Равеля. На вялікай сцэне будзе зводны калектыў 250 лепшых музыкантаў краіны — Акадэмічны сімфанічны аркестр, сімфанічны аркестр НАВТ оперы і балета Беларусі і сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі. А 9 ліпеня ў сталічнай філармоніі адбудзецца сцэнічна-канцэртнае выкананне оперы Д. Пучыні "Тоска". Да ўдзелу ў гэтым праекце А. Анісімаў запрасіў сусветна вядомых салістаў з Італіі, Расіі, Японіі.

●●● на 98-м годзе жыцця спыніўся зямны шлях сусветна вядомага рэжысёра музычнага тэатра, народнага артыста СССР Барыса Пакроўскага. У розныя гады ён быў мастацкім кіраўніком Горкаўскага тэатра оперы і балета, галоўным рэжысёрам Вялікага тэатра СССР, працаваў у Маскоўскім камерным музычным тэатры. Яго 4 разы ганаравалі Сталінскай прэміяй і двойчы — ордэнам Леніна. А яшчэ Б. Пакроўскі атрымаў званне народнага артыста БССР за значны ўнёсак у беларускае музычна-сцэнічнае мастацтва: у 1944 г. паставіў у вызваленым Мінску оперу Я. Цікоцкага "Алеся", праз год — "Кармэн" Ж. Бізэ.

●●● выстаўку палотнаў Юдаля Пэна, якога знаўцы называюць жывапісцам "яўрэйскага рэнесансу" ў беларускім мастацтве пачатку XX стагоддзя, наладзіў філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея — Мастацкі музей. Тут, дарэчы, захоўваецца самая вялікая ў Беларусі калекцыя жывапісных і графічных твораў гэтага майстра, вучня І.Рэпіна і настаўніка М. Шагала: 183 работы. Частка іх, у тым ліку не вядомых шырокай публіцы, разам з унікальнымі дакументамі склала экспазіцыю, якая пасля Віцебска будзе дэманстравацца ў сталіцы. Выстаўка прымяркоўваецца да 155-годдзя з дня нараджэння Ю. Пэна.

●●● прэм'ера праграмы "Нам нельга не выканаць волі герояў" прагучыць у выкананні Дзяржаўнага камернага хору Беларусі пад кіраўніцтвам Наталлі Міхайлавай. Па яе ініцыятыве кампазітар Алена Атрашкевіч і паэт Васіль Жуковіч напісалі да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад гітлераўскай навалы цыкл харавых песень пра вайну — "Дзень вызвалення", які складае аснову новай праграмы. Выступленне хору адбудзецца 30 чэрвеня ў Малой зале БДФ. Апроч гэтых сучасных песень пра вайну прагучаць і незабыўныя мелодыі ваенных гадоў.

Лана ІВАНОВА

На здымках: маэстра А. Анісімаў; фотарэпрадукцыя адной з работ Ю. Пэна.

Фота аўтара

Палемічнае выступленне ў "ЛіМе" дацэнта кафедры філасофіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Наталлі Сцепанцовай (гл. артыкул "Ад еўрапейскіх «тусовак» да любаснай правінцыі" ў нумары за 19.09.08 г.) спарадзіла серыю надзённых публікацый на тэмы культурных прырытэтаў нашага грамадства, эстэтычнага выхавання новых пакаленняў беларусаў, музычнага асветніцтва і адукацыі. Летась мы друкавалі развагі вядомага музыказнаўцы, асветніка, лектара Беларускай дзяржаўнай філармоніі Анатоля Парэцкага ("Нельга пакідаць дзяцей ва ўладзе цемры!", гл. "ЛіМ" за 17.10.08 г.), меркаванне нашай чытачкі з Жыткавічаў Аксаны Сулкоўскай ("Каб талент не знік", 19.12.08 г.). Тэму падтрымаў сёлетні артыкул Рыгора Карпілава — спецыяліста, які шмат гадоў папрацаваў на ніве музычнай адукацыі ("Музыканты з канвеера?", 15.05.09 г.). Сённяшняя публікацыя — погляд яшчэ аднаго неабыякавага, дасведчанага і гранічна шчырага чалавека на ўсё тыя ж набалелыя праблемы.

Усё пачынаецца з сям'і

Працяг тэмы

Прыгадваю выступленне ў "ЛіМе" музыказнаўцы Анатоля Парэцкага, які з горыччу адзначыў, што сёння ў сферы эстэтычнай адукацыі дамінуе тэндэнцыя забаўляльнасці. Выкладчыкі і педагогі-арганізатары нібыта баяцца, што дзеці атрымаюць нешта большае, чым проста казку. Сапраўды, адміністратарам філармоніі даводзіцца часам чуць такое ад тых, хто павінен вучыць і выхоўваць дзяцей! Неяк філарманічны калектыў прыехаў у адзін з гомельскіх дзіцячых садкоў, дык гасцей сустрэла аб'ява на дзвярах: "Артыстам філармоніі і карабейнікам уваход у садок забаронены!" Але гэта яшчэ палова бяды: да старэйшых класаў школы філарманічныя маршруты не даходзяць зусім, а вывучэнне класікі пад прымусам не спрыяе ні захапленню ёю, ні выхаванню музычнага густу.

Тым часам масавая культура не дрэмле. Слухаючы поп- і рок-музыку і назіраючы разбэшчанасць большасці яе выканаўцаў, нашы дзеці ўсё далей і далей адыходзяць ад сапраўднага мастацтва і, што асабліва насцярожвае, страчваюць здольнасць адрозніваць добрае ад дрэннага. І ўтвараецца замкнёнае кола... Таму, як чалавек, які нямала разважаў на гэтую тэму, і як маці дваіх дзяцей, я вырашыла падзяліцца сваімі думкамі з чытачамі.

Яшчэ Антуан дэ Сэнт-Экзюперы, параўноўваючы выхаванне і адукацыю, першае месца адводзіў усё ж такі менавіта выхаванню. І нездарма. Можна быць геніем ад Бога, але, не маючы сэрца, не толькі не прынесці людзям аніякай карысці, але нават і нашкодзіць.

♫

Пасля таго, як у нашых школах было ўзаконена скарачэнне гадзін на выкладанне такіх дысцыплін, як музыка, выяўленчае мастацтва і замежныя мовы, праблемы "выхавання душы" яшчэ больш абвастрыліся. Вядомы беларускі кампазітар Алег Залётнеў мяркуе так: "Я шмат адпрацаваў на радыё, вёў перадачы, браў інтэрв'ю, гутарыў з людзьмі розных прафесій, і таму магу з упэўненасцю казаць, што сённяшняя сітуацыя ў агульнаадукацыйнай школе вядзе да збяднення душы. Матэматыка ці фізіка пры ўсіх сваіх плюсах не робяць чалавека чалавекам, на што здатнае толькі мастацтва. У школе мы вывучалі валентнасць: спачатку я яе і не разумеў, потым растлумачылі. Толькі — паверце! — я з гэтай валентнасцю ніколі ў сваім жыцці не сустрэўся, хаця мне ўжо шмат гадоў. Ні ў якім разе не хачу сказаць, што дакладныя навукі для паўнавартаснага выхавання непатрэбныя! Аднак выхаванне душы — асабліва важная і сур'ёзная справа! Хімія можа існаваць і без чалавека, а мастацтва — не. Яно нарадзілася ад чалавека! А маленькаму чалавечку, дзіцяці, заўсёды важна сустрэцца з асобай. Таму і выкладаць у школе павінны не проста настаўнікі, а асобы! І не важна, шмат ведаў яны дадуць ці не. Ад іх патрабуецца іншае: захапіць, заразіць. А ці можна заразіць формуламі? І якую радасць нясе валентнасць? На маю думку, толькі мастацтва здатнае выхоўваць чалавека рознабакова!"

Выдатны дыктар Ілья Курган, які ў свае 83 гады выкладае ў БДУКіМ і ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, з болем адзначае, што першакурснікі зусім не ўспрымаюць ні літаратуру, ні музыку: "Мне здаецца, што маладыя людзі не разумеюць Купалу, Пушкіна, Рахманінава таму, што не падрыхтаваныя для таго, каб іх зразумець. Гэта ж вымагае душэўных затрат, а не кожны на іх здатны".

Аднак у гэтай вялікай праблемы ёсць карані...

Калі пачынаецца музычнае выхаванне дзяцей? У лепшым выпадку, у дзіцячых садках. Але, па-першае, часу на музычныя заняткі адводзіцца няшмат. А, па-другое, якасць і мастацкая каштоўнасць твораў, якія слухаюць дзеці, невялікія. Калі ж у сям'і малога бацькі не валодаюць элементарнай музычнай культурай, калі ў ёй пануе шараговая безгустоўшчына і ў доме ўвесь час гучыць "какафонія", дык усе намаганні выхавацеляў і музычных кіраўнікоў знікнуць, як кропля ў моры. Ды і дзіцячы садок — кароткі перыяд у жыцці маленькага чалавечка. А што потым? Мы звыкла ківаем на школу: маўляў, яна павінна выхоўваць душы нашых дзяцей. Мабыць, і павінна. Аднак цяпер, пасля скарачэння праграм эстэтычнага развіцця школьнікаў, такое малаверагодна. Але ж хто нас, бацькоў, пазбаўляў такога абавязку? Тым болей, што школьнае выхаванне, я лічу, — запозненае выхаванне, калі самы каштоўны для гэтага час можа быць ужо страчаны.

Пачынаць выхаванне трэба нават не з нараджэння, а яшчэ раней: ад моманту, калі пад сэрцам у жанчыны з'явілася новая жывая клетачка. І не ў тым справа, што дзіця будзе добра разумець музыку. Тут гаворка пра большае: у развіцці розуму і здольнасцей не толькі да гуманітарных, але і да дакладных навук сапраўдная музыка адыгрывае далёка не апошнюю ролю. А, згодна з даследаваннямі вучоных, творы Моцарта (менавіта яго!) павышаюць разумовы каэфіцыент кожнага чалавека, тым больш — дзіцяці.

♫

Спашлюся на ўласны досвед. Сваім абаім дзецям я пачала граць і ставіць класічную музыку яшчэ да нараджэння. Такім чынам яны, разам са мной, слухалі не толькі Моцарта, але і Чайкоўскага, Вівальдзі, нават Бетховена (але толькі "лірыку", бо я заўважыла, што дзеці, якія яшчэ не нарадзіліся, не вельмі любяць творы "буры і націску", аддаюць перавагу ласкавай і меладычнай музыцы). І што цікава: дачка ў такт рухалася, а сын заціхаў. Асабліва калі пачынала гучаць Моцартава 40-я сімфонія. Апрача гэтага, я спявала сваім будучым дзецям песні, якія мне больш за ўсё падабаліся, размаўляла з імі, для іх чытала ўголас дзіцячыя кнігі, вершы лепшых паэтаў і нават урыўкі з Евангелляў.

У выніку мая нованароджаная дачка Настасся мела такі разумны позірк, што нават дактары здзіўляліся. Яна пачала гаварыць у пяць месяцаў, а ў два гады ведала ўсе літары і выразна дэкламавала з дзясятак лірычных вершаў Пушкіна (не толькі казкі!) на памяць. Малая была здольная вельмі разборліва слухаць музыку, беспамылкова адрозніваючы яе не тое што ад рок-грукату, але і ад той, што не вызначалася запамінальнай мелодыяй. Аднак больш уразіў сын. Яшчэ да нараджэння ён вельмі палохаўся моцных гукаў: хтосьці грукне дзвярыма, а мой жывот хадуном ходзіць. Пасля нараджэння немаўля пацвердзіла сваю агіду да ўсяго грымлівага і непрыемнага на слых. Затое як ён слухаў Моцарта — нават не варушыўся! А цяпер Моцарт — самы ўлюбёны яго кампазітар. "Граць музыку Моцарта з памылкамі — злачынства!" Гэта "выдаў" мой чатырохгадовы хлопчык!

Хуткасць яго развіцця бянтэжыла ўсіх знаёмых: загаварыў ён яшчэ раней за сваю сястру і адразу чыста, вымаўляючы ўсе гукі, нават складанае для дзяцей "р". У год ведаў літары і лічбы. У два — пісаў. У тры — вылічваў квадратныя карані, рашаў прыклады і задачы з падручніка сваёй старэйшай сястры. А ў чатыры... Калі шасцігадовая Настасся паступіла ў музычную школу, пачалася штодзённая руплівая праца. Але як толькі яна сядала за піяніна, брацік адразу бег у пакой, дзе гучаў інструмент, і як мы не намагаліся "выставіць" яго, каб не перашкаджаў, — ён нават плакаў, але не ішоў.. А калі сястра заканчвала заняткі, крадком падыходзіў да клавіятуры і, уважліва прыслухоўваючыся, націскаў, шукаючы гарманічных гукавых спалучэнняў. На гэта ніхто не звяртаў увагу — трохгадовае дзіця! Аднак паступова ён, толькі назіраючы за практыкаваннямі сястры, пачаў граць "Маленькую ёлочку". Я "паставіла" яму ручку, паказала, як граць рознымі пальцамі. І праз некалькі тыдняў ён выконваў песеньку абедзвюма рукамі. Адначасова з гэтым вывучыў гаму до мажор на адну актаву (таксама дзвюма рукамі). І... пачатак 40-й сімфоніі Моцарта — той самай, якую слухаў, яшчэ не нарадзіўшыся!

У музычнай школе, дзе вучылася Настасся, толькі развялі рукамі: "Здольнасці ў хлопчыка вялікія, але мы прымаем толькі з шасці гадоў! У нас нават і груп для такіх малых няма..." Я звярнулася ў Рэспубліканскую гімназію-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, і педагог па фартэпіяна Таццяна Глушакова адразу пагадзілася займацца з маім сынам. І вось праз чатыры месяцы ён не толькі сапраўды зайграў, прычым даволі складаныя творы (напрыклад, прэлюдыі Баха з "Добра тэмперыраванага клавіра"), не толькі пачаў на слых вызначаць любыя ноты, інтэрвалы і нават акорды і з лёгкасцю "падбіраць" на слых музыку Моцарта і Бетховена, але і засвоіў праграму па сальфеджыо за ўвесь курс навучання ў музычнай школе.

♫

Калі мяне папракаюць, што я зашмат займаюся з дзецьмі і "пазбаўляю іх дзяцінства", мне застаецца толькі ўсміхацца ў адказ. Аніякіх спецыяльных заняткаў няма! Проста яны жывуць тым, чым жыву я. Праўда, адна настаўніца музыкі паспрачалася са мной: "Калі мая сястра чакала дзіця, я кожны дзень грала класіку — рыхтавалася да кансерваторскіх экзаменаў, у выніку мой пляменнік і слухаць не можа класічную музыку". Тады я спытала: "А ці падабалася тая класіка вашай сястры?" — "Не", — прызналася мая суразмоўца. І пасля гэтага міжволі прыгадаеш словы Гайдна, сказаныя пра Моцарта: "Наўрад ці з'явіўся б на свет такі кампазітар, як Вольфганг, калі б у яго не было такога бацькі, як Леапольд!"

Сапраўды, усё пачынаецца з сям'і! Менавіта ў ёй закладаецца музычны (і не толькі) густ дзіцяці і менавіта ў ёй даецца "вакцына" супраць усялякага псеўдамастацтва. Пачуцці падмануць нельга. Таму выхаванне, у тым ліку і музычнае, трэба пачынаць з сябе!

Алена МІНЧУКОВА

Вечар натхнення

Сольны канцэрт вядучай салісткі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Алены Шведавай быў прымеркаваны да юбілею знанага канцэртмайстра Ларысы Талкачовай. Прыгожая, маладжавая спявачка і таленавіты канцэртмайстар уразілі сваёй выканальніцкай культурай інтэлігентную публіку — цудоўных неабыякавых людзей, якія стварылі ў зале асаблівую атмасферу любові да музычнага мастацтва.

Ларыса Талкачова, дачка народнага артыста БССР, незабыўнага галоўнага канцэртмайстра Беларускай оперы Сямёна Талкачова, прыйшла ў оперны тэатр адразу пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Яшчэ студэнткай яна стала лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў. Ларысу не вабіла сольная кар'ера — абрала прафесію бацькі. Яе цудоўнае "вакальнае вуха" дапамагае выхоўваць маладых оперных спевакоў. Ёй пашанцавала працаваць з выдатнымі майстрамі — В. Чарнабаевым, А. Сухіным, Л. Колас, С. Данілюк, А. Шведавай, з яркай моладдзю — А. Масквіной, А. Волкавай, Э. Мартынюком...

Разам са спевакамі Л. Талкачова аб'ездзіла з канцэртамі ўвесь Савецкі Саюз. Яна выконвала абавязкі адказнага канцэртмайстра ў час пастановак оперных спектакляў "Заручыны ў манастыры", "Багема", "Тоска", "Пікавая дама", "Вяселле Фігара", "Кавалер руж" і шмат іншых.

"Яе абаяльнасць захоплівае, з ёй хочацца

спяваць, і голас сам па сабе пачынае гучаць натхнёна. Яна мякка вядзе вакаліста за сабой", — гаворыць Алена Шведава, якая ўжо 20 гадоў займаецца з Ларысай Сямёнаўнай. У той вечар яна прадэманстравала сапраўдны прафесіяналізм, найвышэйшую вакальную школу. Выконваліся цудоўныя творы Д. Качыні, В. А. Моцарта, Г. Даніцэці, Д. Вердзі... У канцэрце ўдзельнічалі таксама М. Аксёнцава і С. Франкоўскі. Як і А. Шведава, яны выглядалі святочна, шыкоўна, спявалі з вялікім натхненнем. Сваё выступленне яны прысвяцілі канцэртмайстру-юбіляру. У выкананні А. Шведавай і С. Франкоўскага ярка прагучалі сцэны і дуэты з опер "Рыгалета" Д. Вердзі і "Шукальнікі жэмчугу" Ж. Бізе. Слухачоў парадавала сваім прыгожым мецца-сапрана М. Аксёнцава ў дуэце з А. Шведавай (фрагменты з "Пікавай дамы" П. Чайкоўскага і оперы В. А. Моцарта "Вяселле Фігара")...

Завяршыўся канцэрт творамі Ё. Штраўса, а куплеты Адэлі з аперэты "Лятучая мыш" прагучалі на "біс".

Вера КРОЗ

На здымку: заслужаная артыстка Беларусі Л. Талкачова.

№ 24 26 чэрвеня 2009 г. Лім



Ёсць у Рэчыцкім раёне лясная вёсачка Шоўкавічы. Магу заверыць, што такая назва паселішча — адзіная на ўсю Беларусь. А сама вёска — лепшая ў свеце.

Шоўкаўскі дуб — вартаўнік Памяці

Кажуць, на нашых палетках, адваяваных некалі ад лесу ды хмызоў, вельмі радзіў лён. Як цвіў, здаецца, сінія азярыны гайдаліся хвалямі ледзь не да сялянскіх хат. Нібыта Шоўкавічы тады пазіралі ў сусвет вялізнымі блакітнымі вачыма. І ўсе, хто гойсаў той парой па Млечным Шляху, а шоўкаўцы, як і ўсе на зямлі, не ведалі яшчэ пра касманаўтаў, верылі толькі ўладару неба і яго святым служкам, дык і спадзяваліся, што Бог і анёлы бачаць іх адкрытыя і добрыя вочы. Мо таму з асаблівай пяшчотай даглядалі льняныя палеткі. Пасля шчыравалі, каб давесці да ладу ўраджай.

Магчыма, было так: прабіліся нашы льнаробы праз царства туманоў на нейкі рынак, каб абмяняць лён на соль, свечкі, цвікі, а там сустрэўся шчыры гандляр, не стрымаў свайго захаплення: "Ды ў вас жа не лён — шоўк!" І закупіў увесь тавар. А пасля чутка пайшла пра майстроў, пачалі цікавіцца: "Дзе тыя шоўкаўцы?.. Калі зноў прывязуць свой шоўкавы лён?.."

Вось і нарадзілася назва паселішча — Шоўкавічы.

Так было ці не, ужо ні ў кога не перапытаеш. Амаль усе нашы аднавяскоўцы перасяліліся на пагост. Ляжыць там бібліятэка непрачытаных кніг, неразгаданых лёсаў. Ведаю адно, мае шоўкаўцы вельмі ж працавітымі былі, сумленнымі, верылі сваёй зямельцы і сваім сем'ям. А яшчэ ведаю, што над Шоўкавічамі — самыя высокія зоры. Там — самыя галасістыя салаўі і жабы.

Навакольныя лясы — самыя грыбныя і ягадныя. Перад уваходам у гэту вёску мне хочацца зняць чаравікі, як перад храмам ці унікальным музеем, ціха ступаць па пясчанай вуліцы.

Калі вы яшчэ не здагадаліся, чым адметны Шоўкавічы, дык ведайце: яны — мая малая радзіма. Тут я ўпершыню ўбачыў узыход сонца. Тут прайшло маё басаногае дзяцінства. Адсюль пайшоў у людзі, пабываў багата ў якіх краінах свету. А цяпер, жывучы ў Мінску, прашу воблакі, каб занеслі мяне ў мае Шоўкавічы, малю лёс, каб падараваў новую сустрэчу з роднымі мясцінамі. Такое памятнае спатканне нядаўна дапамаглі наладзіць работнікі дзяржаўнай лесагаспадарчай установы "Васілевіцкі лясгас".

Усё пачалося з таго, што па просьбе газеты "Советская

Белоруссия" я выступіў на яе старонках з артыкулам пад рубрыкай "Што ні край, то звычай". Нечакана для сябе самога і для чытачоў, я адкрыў у сваіх Шоўкавічах сем цудаў свету. Сярод іх — векавы дуб-волат, з якога пачынаецца Шоўкаўская дуброва, — помнік прыроды на 73,9 гектарах. Той дуб стаіць якраз пасярод вёскі, на дварышчы, дзе калісьці стаялі нашы, Ліпскіх, хаты: і даваенная, якую спалілі фашысты, і пасляваенная, якая займела прапіску ў суседняй вёсцы Баравікі, як мае бацькі адышлі на неба.

З нашага дуба, адразу за агародам, пачынаецца векавая дуброва. Па ёй мы хадзілі па веды ў Вузнажскую школу. Пяць кіламетраў туды, столькі ж — назад, у снежныя завеі, вясновае бездарожжа, пад восеньскія дажджы. З дубровы мы кашамі насілі крамяныя грыбы. Сярод дубоў, у арэшніку, мяхамі збіралі арэхі-лузанчыкі. У дуброве, як у філармоніі, слухалі канцэрты лясных птушак. І ніхто з нас, ні старыя, ні малыя, не ведалі, што жывём побач з дубровай, якая аб'яўлена помнікам прыроды.

Наша вёска Шоўкавічы вядома з XVIII стагоддзя. Яе росквіт прыпаў на час стварэння ў ёй калгаса. У 1930 годзе тут было 38 хат, 208 жыхароў. Цяпер лічаныя старажылы жывуць у паміраючай вёсцы. І толькі дуб у тры абхваты, як і раней, велічна ўзвышаецца над паселішчам, нагадвае ўсім, хто сюды завітае, што тут жылі, спраўлялі хрэсьбіны, гулялі вяселлі, святкавалі святую Сёмуху шчырыя, адвечныя земляробы, мудрыя і духоўна багатыя сяляне. Пра іх мае кніжкі — "Адпяванне жывых", "Лаўрэнавы працадні", "Мама. Малітва сына", "Бацька. Пісьмы на неба".

З дапамогай спагадлівых і добрых людзей з Васілевіцкага лясгаса ў Год роднай зямлі каля дуба ўзнік арыгінальны мемарыял. Адразу хачу з удзячнасцю назваць людзей, якія бескарыслівa садзейнічалі добрай справе. Гэта — дырэктар лясгаса Сяргей Шаўгеня, яго намеснік Сяргей Гурскі і галоўны ляснік Ігар Дзягцярык. Яны зразумелі, што вясковы дуб не проста прадстаўнік дубровы, а жывы помнік і вёсцы, і радаводным сем'ям, якія тут жылі.

Дуб абгарадзілі акуратным штыкетнікам, на ім вывешана шыльда з інфармацыяй пра Шоўкаўскую дуброву, якая ахоўваецца дзяржавай. Пад шатамі дрэва збудавана альтанка са столікам і седаламі. Ад вуліцы з'явілася новая агароджа з масіўнай дубовай лавай.

Свой унёсак у незвычайны мемарыял зрабілі вучні Камсамольскай сярэдняй школы Яўген Верабей, Раман Шапірэнка, Міхаіл Курныш, Кірыл Доўбуш, Аляксандр Волкаў, Юрый Грыб, Уладзімір Апанасюк, Міхаіл Паўлючкоў, Яўген Махонька. Разам з настаўнікам па працы Дзмітрыем Уладзіміравічам Коцурам яны высадзілі ліпавую алею ад дуба да вуліцы. Па словах маладога, энергічнага дырэктара школы Васіля Абібака, сярод вучняў быў наладжаны сапраўдны конкурс, каму ехаць у Шоўкавічы на пасадку дрэваў. Так у вёсцы з'явілася Алея памяці. На шыльдзе каля брамкі пазначана 26 шоўкаўскіх радаводных сем'яў, пачынальнікі якіх спачываюць на мясцовых могілках, а іх дзеці, унукі і праўнукі рассяліліся ці не па ўсёй Беларусі.

Пра шоўкаўскую ініцыятыву гаварыў на ўрадавай нарадзе акадэмік, ганаровы дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Віктар Парфёнаў. Пра незвычайны мемарыял у Шоўкавічах я давёў старшыні Рэчыцкага райвыканкама Пятру Шостаку і яго намесніку Віталю Атаманчуку. Добры пачын ухвалены. Ішла размова пра тое, каб на месцах зніклых вёсак устанавіць свае памятныя знакі. Гэта можа быць валун з пэўным надпісам, груша на старым дворышчы, лава для адпачынку, сціплы абеліск з вазай для кветак, крыж з саматканым ручніком, старыя калёсы, на якіх можна прысесці і прыгадаць людзей, якія тут некалі жылі. Толькі ў Рэчыцкім раёне налічваецца звыш шасцідзесяці вёсак, якіх ужо няма на картах і ў пэўных геаграфічных кропках. Сярод іх — вёска Адверніца, Анісаўка, Грабянёў, Дубіна, Капцы, Колава Рука, Пагарэльцы, Чорная зямля, Ясная Паляна...

Званю ў Шоўкавічы Мікалаю і Надзеі Трацэўскім, якія жывуць каля дуба-помніка, цікаўлюся:

— Ці прыняліся ліпкі, як адчуваюць яны сябе ў Шоўкаўскай алеі?

— Прыняліся!.. Растуць!.. — радуюцца Трацэўскія і паведамляюць. — Прыязджалі наведваць магілы сваіх бацькоў гарадскія іх дзеці. Адпачывалі ў альтанцы каля дуба.

Значыць, новае жыццё пачынаецца ў Шоўкаўскага дуба. Цяпер ён не проста прадстаўнік дубровы, якая ахоўваецца дзяржавай, ён — вартаўнік Памяці пра ўсіх шоўкаўцаў, якія загінулі ў гады вайны, падчас рэпрэсій, хто пакінуў гэты свет па старасці. А Памяць і ёсць тая духоўнасць, якая не дае памерці, згінуць усяму добраму. Колькі жыве Памяць, столькі жывуць чалавек, і яго імя, і яго справы. Хай жа вечнымі будуць на Зямлі нашы продкі, сучаснікі і нашчадкі. Хай ніколі не абрываецца жывая повязь пакаленняў. Моцна задумаемся пра гэта ў Год роднай зямлі.

Уладзімір ЛІПСКІ,
пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка"

Акорды душы курсанта

"Кузня творчых кадраў". Па стэрэатыпе адразу ж прылічваеш да такіх некалькі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, БДУ, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў... Але мяне прыемна здзівіла творчая актыўнасць курсантаў, калі трапіў у Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь на конкурс аўтарскай песні. Ініцыятарам правядзення конкурсу "Акорды курсанцкай душы" стала кафедра беларускай і замежных моў, і непасрэдна — маёр міліцыі Таццяна Катцова. Загадчык кафедры Святлана Дзянісава так растлумачыла мэту арганізацыі падобнага конкурсу: "Восенню праводзіцца рэспубліканскі конкурс "Гімн альма матэр". Але, магчыма, не ўсе парывы курсанцкай душы абмежаваныя такой вузкай тэматыкай. Таму і вырашылі мінулай вясною, паколькі песень было напісана шмат, правесці конкурс, які змяшчаў бы ў сабе цэлую гаму пачуццяў: і кахання, і адносіны да жыцця, і філасофскі роздум, і патрыятызм. Не толькі гімн навуковай установе, але ўсе магчымыя душэўныя зрухі".

Курсанты паставіліся да правядзення конкурсу сур'ёзна і па-вайсковаму адказна. На сцэне разыгралася касцюміраванае тэатральнае дзейства, персанажы якога — тры мушкецёры: Атос, Партос, і Араміс, кароль Гарох, царэўна Несмяяна ды іншыя, у вершаванай, часам іранічнай форме прадстаўлялі журы конкурсу і саміх удзельнікаў. Каля трыццаці курсантаў акадэміі сышліся ў творчым спаборніцтве, каб "рассмяшыць і суцешыць Несмяяну". На суд журы былі прадстаўлены песні розных жанраў, ад лірычных замалёвак да філасофскай лірыкі, ад патрыятычных песень грамадзянскага гучання да сацыяльнай лірыкі ў стылі рэп. Шырока выкарыстоўваліся сучасныя мультымедыйныя сродкі. Прыемна, што сярод мноства была і песня на роднай мове, якая заняла другое месца.

Памочнік начальніка акадэміі падпалкоўнік Юры Кур'янавіч (вядомы пісьменнік, мастак і фотамастак) сказаў, што заўсёды рады бачыць у гасцях беларускіх пісьменнікаў, якія здольны зрабіць курсантам прышчэпку ад бездухоўнасці. "Пройдзе пяць гадоў, і курсанты раз'едуцца па ўсёй Беларусі, што ўкладзём у іх душы за час вучобы, тое яны і панясуць па жыцці. Такой і будзе міліцыя, якая нас беражэ. Такім будзе і наша грамадства".

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Гадоў дзесяць таму ў адзін са светлых майскіх дзён, калі ля сваіх шпакоўняў радасна перасвісталіся шпакі, з Гомеля мне ў вёску на Лоеўшчыне, дзе я тады быў, унук прывёз загорнуты ў цэлафан знак "Ветэран вайны 1941—1945 гг.". У пасведчанні, падпісаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, пацвярджалася, што знак уручаецца ў гонар 55-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Уяўляе ён сабой і ордэн Айчыннай вайны і Чырвонай зоркі. У цэнтры — адбітак сусветна вядомай скульптуры савецкага воіна-вызваліцеля, што ўзвышаецца ў берлінскім Трэптаў-парку.

А многія ж з тых, хто са зброяй у руках адстойваў незалежнасць нашай Айчыны, хто вызваляў беларускую зямлю, не дажылі да таго дня, каб быць удастоенымі гэтай ветэранскай узнагароды. Я хачу расказаць пра іх — ураджэнцаў Гомельшчыны — якіх ведаў, са многімі з якімі сябраваў, сустракаўся. На кніжных паліцах стаяць кнігі гэтых людзей з цёплымі, светлымі надпісамі.

Вызвалялі не толькі беларускую зямлю...

У 1982 годзе памёр вядомы драматург, народны пісьменнік Андрэй Макаёнак. Родам ён з вёскі Борхаў Рагачоўскага раёна. Тыя, хто ўдзельнічаў некалі ва ўрачыстасцях у Журавічах, прысвечаных 80-годдзю пісьменніка, ведаюць, што Андрэй Макаёнак быў прызваны ў армію ў 1939 годзе. Гэта быў час, калі па вобразным выказванні аднаго з літаратараў, у паветры адчувальна пахла порахам. У час Вялікай Айчыннай вайны А. Макаёнак удзельнічаў у цяжкіх баях на Крымскім фронце. Быў паранены. Гэта аб ім пісаў Васіль Быкаў: "Апрача непаўторнага мастакоўскага таленту ён меў яшчэ і ўпартую волю салдата, сапраўдны характар байца, які толькі гартаваўся ў нягодах жыцця, стаў больш чалавечны і мудры. Ён быў сапраўдны баец яшчэ задоўга да таго, як стаў палітруком стралковай роты на Крымскім фронце, дзе быў цяжкапаранены, і гэта раненне ледзьве не каштавала яму жыцця".

Ва ўспамінах "Трохі згадак і думак" другі народны пісьменнік — мой зямляк з Гомельшчыны — Іван Мележ піша: "Вайна заспела нас каля самай граніцы, незадоўга да той пары, калі мы марылі зноў вярнуцца ў інстытуты. Хоць нас загадзя папярэджвалі, што вайна непазбежна, хоць мы і самі ў думках рыхтавалі сябе да яе — яна аказалася ўсё ж нечаканай, незвычайнай, непараўнанай ні з чым страшнай бядою... Былі ўпартыя баі пад Уманню, дзе мы ўпершыню ўбачылі, як немцы кідаюць зброю і ранцы. Былі потым баі ў акружэннях, адным, другім, трэцім. Месяц стаялі на Дняпры, пад Сінельнікавам, адбівалі немцаў, што спрабавалі прарвацца цераз Дняпро на ўсходні бераг. Халоднай восенню мы вызвалялі Растоў, зімой бралі Лазавую і Барвенкава...

На ўсё жыццё І. Мележ застаўся ўдзячны растоўскаму хірургу Антонаву, які рабіў аперацыю маладому палітработніку і выратаваў яму правую руку. (Той рукой, пасля змяніўшы аўтамат на пяро, пісьменнік напіша сваю "Палескую хроніку", раман "Мінскі напрамак" ды іншыя выдатныя творы).

У Мурманску ў зенітна-артылерыйскай часці сустрэў вайну Іван Шамякін. Як ён прызнаваўся, першыя месяцы службы былі для яго страшэнна цяжкімі. "Нягледзячы на тое, што вырас у лесе, — успамінаў пісьменнік, — я быў нейкі слабы і непрыстасаваны да надзвычай цяжкіх фізічных выпрабаванняў: мяне прыгнятала суровая паўночная прырода, лютая зіма, абражала грубасць малодшых камандзіраў... Але вайну я сустрэў ужо даволі загартаваным і ваяваў добра. Часць наша два гады стаяла на абароне Мурманска, які немцы бамбілі бязлітасна". Аб тым, якія страшныя былі варожыя авіяцыйныя налёты, Іван Шамякін потым раскажа, як літаральна за некалькі метраў ад яго кулямі з буйнакалібернага кулямёта перасекла баннік, якім салдаты прачышчалі ствалы гармат. Дзяржак банніка быў умомант перарэзаны...

Мінуць гады, і перажытае, і ўбачанае некалі на нялёгкіх франтавых дарогах ляжа ў аснову шматлікіх мастацкіх твораў народнага пісьменніка. Варта назваць яго пенталогію "Непаўторная вясна", "Начныя зарніцы", "Агонь і снег", "Пошукі сустрэчы", "Мост", аб'яднаных адной назвай — "Трывожнае шчасце". Альбо яго раман пра зенітчыкаў "Зеніт".

— Айчынная вайна, якая супала з маім юнацтвам, бадай, стала для мяне пачаткам актыўнага жыцця, — успамінаў Іван Навуменка, які нарадзіўся ў Васілевічах. — Недзе ў канцы восені сорак першага года з ліку вучняў старэйшых класаў у мястэчку стваралася невялікая падпольная група, у якую ўваходзіў і я. Збіралі зброю, слухалі радыё, распаўсюджвалі савецкія лістоўкі і газеты, шукалі сувязі з партызанамі. Група ўцалела, хоць у сорак другім годзе фашысты і расстралялі нашага кіраўніка.

У партызанскіх атрадах, а пасля з рэчавым мяшком за плячыма і аўтаматам у руках нялёгкімі ваеннымі дарогамі прайшлі пісьменнікі-землякі Аляксандр Капусцін і Уладзімір Федасеенка. Аляксандр Капусцін (пасля — ганаровы грамадзянін Жлобіна) у чэрвені 1942 года арганізаваў у роднай вёсцы Старая Рудня маладзёжную падпольную групу. З красавіка 1943 года быў у партызанах, а пасля — на фронце, быў кантужаны і тройчы паранены.

Цікавы факт: у час Вялікай Айчыннай вайны І. Навуменка вызваляў родныя Васілевічы. А пасля ўдзельнічаў у баях на Ленінградскім і І-м Украінскім франтах. Аб апаленым полымем вайны юнацтве пісьменнік пасля раскажа ў сваіх раманах "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах", "Сорак трэці", "Смутак белых начэй"...

З вёскі Слабада, што ў Рагачоўскім раёне, пайшоў у вялікі жыццёвы шлях паэт Мікола Сурначоў. Гэта яму належаць напісаныя на Заходнім фронце ў 1941 годзе радкі пра савецкага воіна:

Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце.
Маці спаткаеце —
Ёй не кажыце...

Верш некалі быў перакладзены на рускую мову Аляксандрам Твардоўскім.

Некалі бацькам М. Сурначова прыйшла "пахаванка": "Ваш сын гвардыі лейтэнант Сурначоў Мікола Мікалаевіч, верны воінскай прысязе, праявіўшы гераізм і мужнасць, паў смерцю храбрых 20 красавіка 1945 года. Пахаваны ў пасёлку Фрайдэнберг (Германія)". Паэт не дачакаўся светлых дзён Вялікай Перамогі. Ён загінуў у адным з баёў недалёка ад варожай сталіцы, да якой ішла наша армія столькі нялёгкіх гадоў.

Затое радасна ведаць, што другі паэт — мой зямляк Паўлюк Прануза "не экскурсантам, а салдатам, абпаленым агнём баёў з гранатамі ды аўтаматам на дах рэйхстага ўзышоў". У тыя векапомныя дні, калі Перамога шырокімі крокамі ішла па зямлі, П. Прануза пісаў:

Паў Берлін.
Хоць чорны, а бялее,
З вокнаў — хусткі,
Просціны, сцягі,
Нібы сталінградская завея
Тут прайшла,
пакінуўшы снягі.

Суровымі франтавымі дарогамі да таго, як штыкі змянілі на пяро, прайшлі пісьменнікі Дзмітрый Кавалёў, Раман Сабаленка, Мікола Ракітны, Алесь Астапенка.

У партызанскіх атрадах, а пасля з рэчавым мяшком за плячыма і аўтаматам у руках нялёгкімі ваеннымі дарогамі прайшлі пісьменнікі-землякі Аляксандр Капусцін і Уладзімір Федасеенка. Аляксандр Капусцін (пасля —ганаровы грамадзянін Жлобіна) у чэрвені 1942 года арганізаваў у роднай вёсцы Старая Рудня маладзёжную падпольную групу. З красавіка 1943 года быў у партызанах, а пасля — на фронце, быў кантужаны і тройчы паранены. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалём "За адвагу" і іншымі медалямі.

Нялёгкія баявыя дарогі і ва Уладзіміра Федасеенкі (дай, Божа, яму яшчэ доўгага жыцця!). Яго ратныя подзвігі адзначаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай зоркі і медалямі.

Яны вызвалялі не толькі беларускую зямлю. Злажылі галовы ў нас на Беларусі і паэты іншых нацыянальнасцей. Тут пахаваны вядомы грузінскі паэт Мірза Гелавані, якому пасмяротна ў 1975 годзе была прысуджана Дзяржаўная прэмія Грузінскай ССР імя Ш. Руставелі.

На маёй роднай Лоеўшчыне, у вёсцы Казярогі (непадалёку ад месца, дзе была школа, у якой пасля вайны я колькі гадоў працаваў) знаходзіцца магіла ўзбекскага паэта Султана Джуры. (Яго вершы на рускую мову перакладаў Дзмітрый Кавалёў). Нібы прадчуваючы, якія вялікія выпрабаванні чакаюць яго пакаленне, С. Джура пісаў: "Калі патрэбна толькі будзе, за родны край памру ў змаганні. Калі патрэбна толькі будзе, вінтоўкай карандаш мой стане". Султан Джура (Джураеў) служыў у корпусе генерала В. Крукава, ён наступаў у напрамку Рэчыцы. Куля звалiла паэта літаральна за якіх пяць кіламетраў ад Дняпра; бацьку-Дняпро так нялёгка было фарсіраваць у раёне Лоева... І вядомы беларускі паэт Васіль Вітка (яго медаль вісіць у мяне на пачэсным месцы ў кніжнай шафе) некалі напісаў:

У вёску Казярогі,
На Палессе,
Прыйшла з далёкае дарогі
Песня.
З Ферганскае даліны,
З Андыжана,
І на лістку каліны
Задрыжала...

Шчымліва ўспамінаецца, як некалі з Анатолем Грачанікавым (ён тады працаваў сакратаром Гомельскага гаркама камсамола) мы ў мяшэчку везлі з Казярогаў зямлю з магілы Джуры, каб наша дэлегацыя, што прымала ўдзел у Днях літаратуры і мастацтва ва Узбекістане, перадала яго родным у Ташкенце...

...На памятным Знаку, што ўручаўся ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, пяціканцовая пунсовая зорка ў абрамленні залацістых промняў. Ліпеньскі ветрык мілуе пялёсткі кветак на магілах Султана Джуры, Мірзы Гелавані, Міколы Сурначова. І на магілах маіх сяброў Дзмітрыя Кавалёва, Паўлюка Пранузы, Аляксандра Капусціна...

Міхась ДАНІЛЕНКА

Віншуем

з **75**-годдзем **Карамазава** Віктара Філімонавіча, беларускага празаіка, сцэнарыста.

з **75**-годдзем **Яскевіча** Алеся (Аляксандра Сямёнавіча), беларускага літаратуразнаўца, крытыка.

з **70**-годдзем **Памазана** Арнольда Кандратавіча, беларускага акцёра.

з **70**-годдзем **Раеўскага** Валерыя Мікалаевіча, беларускага тэатральнага рэжысёра.

з **70**-годдзем **Скарынкіна** Уладзіміра Максімавіча, беларускага паэта, перакладчыка.

з **70**-годдзем **Чапегу** Уладзіміра Пятровіча, беларускага перакладчыка.

з **60**-годдзем **Бірчанку** Таццяну Яфімаўну, беларускую паэтэсу.

Юбілейны каляндар

175 гадоў **Ельскаму** Аляксандру Карлавічу, беларускаму гісторыку, этнографу, краязнаўцу, пісьменніку.

145 гадоў **Сержпутоўскаму** Аляксандру Казіміравічу, беларускаму этнографу, фальклярысту, мовазнаўцу.

100 гадоў **Знаёмаму** (Клопаву) Сяргею Дзмітрыевічу, беларускаму празаіку.

95 гадоў **Савіцкаму** Уладзіміру Іларыёнавічу, беларускаму пісьменніку.

90 гадоў **Дзеружынскаму** Авяр'яну Сафонавічу, беларускаму паэту.

90 гадоў **Сіняўскаму** Івану Іванавічу, беларускаму празаіку.

85 гадоў **Быкаву** Васілю Уладзіміравічу, беларускаму пісьменніку, грамадскаму дзеячу.

85 гадоў **Шутэнку** Гаўрыілу Карнеевічу, беларускаму паэту.

75 гадоў **Хаўратовічу** Віктару Кандратавічу, беларускаму паэту.

70 гадоў **Бечыку** Варлену Леанідавічу, беларускаму крытыку, літаратуразнаўцу.

70 гадоў **Чэрню** Хведару (Фёдару Мікалаевічу), беларускаму паэту.

Такі народ — непераможны

Першыя парасткі мастацкай творчасці беларускіх партызан з'явіліся яшчэ ў 1941 годзе. Амаль у кожным атрадзе былі партызаны, у мінулым звязаныя з мастацтвам: артысты, выкладчыкі музыкі, студэнты мастацка-творчых навучальных устаноў, удзельнікі самадзейных мастацкіх калектываў. Яны звычайна і станавіліся арганізатарамі партызанскай мастацкай самадзейнасці. У вольны час гэтыя людзі збіраліся на лясной паляне, каля вогнішча, у зямлянцы і ладзілі імправізаваныя «канцэрты». Першапачаткова мастацкая работа гэтых груп не планавалася, развівалася стыхійна. Канцэрты адбываліся з дазволу партызанскага камандавання.

У населеныя пункты, дзе выступала партызанская мастацкая самадзейнасць, па даносе фашысцкіх шпіёнаў нярэдка накіроўваліся ўзмоцненыя нарады немцаў і паліцаяў. Аднак населеныя пункты, у якіх арганізоўваліся канцэрты, надзейна ахоўваліся партызанамі, ды і самі артысты ўмелі не толькі спяваць і танцаваць... Так, падчас канцэрта ансамбля песні і танца партызанскай брыгады «Няўлоўныя» ў вёсцы Гліснаўка разведка данесла, што з нямецкага гарнізона Белае, рухаецца атрад фашыстаў для расправы з жыхарамі вёскі і «бандыцкімі музыкантамі». Разам з байцамі атрада Меркуля ў засаду пайшлі і ўдзельнікі ансамбля. Партызаны далі гітлераўцам такі «канцэрт», што яны хутка пабеглі назад, а многія назаўжды засталіся ахвярамі партызанскага «мастацтва».

З цягам часу выступленні мастацкай самадзейнасці партызан набываюць сістэматычны, планамерны характар. Па прапанове К. Т. Мазурава, для арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці сярод партызан і насельніцтва было вырашана стварыць мастацкую агітбрыгаду пры Галоўным штабе Мінскага партызанскага злучэння. Аснову агітбрыгады склалі былыя прафесійныя артысты. Агітбрыгада выступала ў партызанскіх атрадах і населеных пунктах Палескай і шэрага паўднёвых раёнаў Мінскай вобласці.

У ліку першых партызанскіх мастацкіх калектываў быў і ансамбль песні і танца брыгады «Няўлоўныя». Ідэя яго стварэння належала камісару брыгады Б. Глезіну, які да вайны працаваў дырэктарам клуба ў Магілёве. У ансамбль уваходзіла 14 чалавек. Пра выступленні ансамбля даведалася камандаванне суседніх партызанскіх атрадаў і брыгад. "Артысты" сталі атрымліваць запрашэнні выступіць у суседзяў. Пачаліся «гастролі». За верасень-кастрычнік 1942 года ўдзельнікі ансамбля прайшлі многія дарогі Полацкага, Расонскага, Дрысенскага (цяпер Верхнядзвінскага) і Асвейскага раёнаў Віцебскай вобласці. За гэты час было дадзена больш як 100 канцэртаў для партызан і мясцовага насельніцтва. Часам прыходзілася даваць два-тры канцэрты ў дзень.

Узнікненне партызанскіх мастацкіх калектываў на тэрыторыі Беларусі ў 1942-1944 гг. стала паўсюднай з'явай. У пачатку 1944 года для арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці сярод партызан і насельніцтва Баранавіцкай вобласці была створана Лідская агітацыйная група з мастацкай самадзейнасцю. У яе склад увайшло 19 чалавек. Рэжысёрам стаў былы артыст Беларускага тэатра імя Янкі Купалы М. Счансновіч.

Асабліва вялікая работа вялася ў сувязі з падрыхтоўкай да святаў. Напрыклад, перад Лідскай агіттрупай была пастаўлена задача падрыхтаваць канцэрт да 1 Мая 1944 года. Для святочнага канцэрта не хапала тэматычных твораў, і ўдзельнікі самадзейнасці самі стваралі канцэртныя нумары. Партызаны раздабылі два акардэоны, скрыпку ды іншыя музычныя інструменты, нямецкае абмундзіраванне для персанажаў п'ес. Для танцавальнай групы зрабілі беларускія нацыянальныя касцюмы і матроскі, у якіх партызанскія артысты выконвалі танцы. Пакуль ішлі рэпетыцыі калектыву, партызаны пабудавалі спецыяльны «тэатр» — крыты павільён са сцэнай. Сцэну задрапіравалі парашутнай тканінай. На задніку намалявалі герб СССР, а па краях павесілі партрэты правадыроў. Іх упрыгожылі кветкамі, сцяжкамі і зоркамі. Пад партрэтамі вывесілі лозунг «Няхай жыве 1-е Мая!» Дах «тэатра» замаскіравалі зялёнымі галінкамі, каб яго не маглі разглядзець зверху нямецкія лётчыкі. «Памяшканне тэатра» было разлічана на 150 чалавек, а іх аказалася больш як 300. З вялікім захапленнем партызаны глядзелі праграму, у якой расказвалася пра баявыя справы злучэння. Калі ў «жывой газеце» называліся прозвішчы лепшых байцоў і камандзіраў, прысутныя сустракалі іх громам апладысментаў. Амаль усе нумары па просьбе гледачоў прыйшлося паўтараць. Было вырашана арганізаваць «гастролі» па суседніх партызанскіх брыгадах. За час свайго існавання з лютага па ліпень 1944 года агіттэатр вырас з 19 да 38 чалавек. Ён атрымаў шырокую вядомасць у Лідскім, Іў'еўскім, Карэліцскім, Любчанскім і Юраціškаўскім раёнах Баранавіцкай вобласці. На прадстаўленнях агіттэатра пабывала больш як 10 тысяч партызан і мясцовага насельніцтва.

У гады Вялікай Айчыннай вайны з'явіўся зусім новы від мастацкага калектыву — агітацыйна-мастацкі атрад. Такі атрад быў створаны ў пачатку 1944 года ў Вілейскай вобласці. Былі распрацаваны асноўныя патрабаванні да зместу канцэртных праграм агітатрада: партызанскі ансамбль у сваіх выступленнях і дзеяннях павінен умацоўваць упэўненасць партызан і насельніцтва Беларусі ў перамозе над нямецкімі акупантамі; высмейваць нямецкіх акупантаў і іх прыспешнікаў — паліцаяў, стараст і інш.; праз выкананне класічных твораў несці культуру партызанам і мясцоваму насельніцтву. Акрамя агітацыйна-мастацкай работы агітатрад павінен быць гатовым да баявой дзейнасці. На выпадак баявых дзеянняў ён дзяліўся на аддзяленні і ўзводы. Усе ўдзельнікі павінны былі захоўваць воінскі парадак і дысцыпліну. Выступленні ансамбля залічваліся ў якасці баявой дзейнасці. Створанаму агітатраду далі імя Горкага. Агітатрад з'яўляўся самастойнай партызанскай адзінкай. Ён складаўся з ансамбля песні і пляскі, баявога і гаспадарчага ўзводаў, меў свой штаб. У ансамбль уваходзілі агітатары, хор, аркестр, танцавальная і вакальная групы. Удзельнікі ансамбля вывучалі нотную грамату, падбіралі і складалі рэпертуар, праводзілі рэпетыцыі. Яны рэгулярна займаліся страявой і фізічнай падрыхтоўкай, неслі вартавую службу. За перыяд сваёй дзейнасці ў тыле ворага агітатрад даў 150 канцэртаў, на якіх пабывала 80 тысяч чалавек. У адрозненне ад астатніх партызанскіх самадзейных калектываў удзельнікі агітатрада імя Горкага былі перш за ўсё агітатарамі, а толькі потым байцамі. Яны таксама мелі зброю, удзельнічалі ў баявых аперацыях, аднак асноўнай іх дзейнасцю лічылася агітацыйна-мастацкая работа. Агітатрад быў самым вялікім калектывам партызанскай мастацкай самадзейнасці — яго склад даходзіў да 70 чалавек. Выступленні яго ўдзельнікаў вызначаліся высокім майстэрствам выканання. Калектыў адыграў вялікую ролю ў прапагандзе партызанскай творчасці і ў пасляваенны перыяд. Ён удзельнічаў у абласных, рэспубліканскіх і Усесаюзным аглядах самадзейнай мастацкай творчасці. Пасля вызвалення Беларусі быў рэарганізаваны ў прафесійны калектыў — Маладзечанскі абласны ансамбль песні і танца.

Часам гурткі мастацкай самадзейнасці ствараліся сумеснымі намаганнямі партызан і мясцовага насельніцтва. Калі ў канцы 1942 года партызанская брыгада імя Варашылава (Віцебская вобласць) вызваліла ад фашыстаў вёску Гомель Полацкага раёна, моладзь вёскі звярнулася да камандавання брыгады з просьбай даць сумесны з партызанамі канцэрт для жыхароў сяла. Першы канцэрт, арганізаваны партызанамі і моладдзю Гомеля, стаў днём нараджэння ансамбля партызанскай самадзейнасці. Ансамбль выступаў у многіх партызанскіх брыгадах і вёсках Ветрынскага раёна і карыстаўся ў гледачоў вялікім поспехам. У Лагойскім раёне ў вёсцы Карпілаўка ў гады вайны размяшчалася партызанская брыгада «Штурмавая». Сельская моладзь і партызаны збіраліся вечарамі ў каго-небудзь дома, спявалі песні, частушкі, танцавалі, чыталі вершы. На гэта звярнула ўвагу настаўніца М. Васілевіч, якая захапілася тэатрам. Яна напісала п'есу «Шпіён» і прапанавала моладзі ажыццявіць яе пастаноўку. Быў створаны драматычны гурток, пачаліся рэпетыцыі. На прэм'еру спектакля сабралася столькі гледачоў, што памяшканне аказалася перапоўненым і многім прыйшлося глядзець праз адчыненыя вокны.

Дарэчы, размеркаванне роляў у спектаклях ішло своеасабліва. Многія партызанскія артысты не хацелі выконваць ролі фашыстаў і прыходзілася прыбягаць да жараб'ёўкі. Звычайна выканаўцаў гэтых роляў апраналі ў камічныя касцюмы. Тыя, хто выконваў ролю нямецкіх вартавых выходзілі на сцэну ў вялізных саламяных лапцях, абутых на валенкі, з галовамі захутанымі жаночымі хусткамі. Хадзілі яны па сцэне дрыжучы ад страху і холаду. Іх з'яўленне сустракалася свістам, вострымі словамі...

У некаторых атрадах і брыгадах ствараліся самадзейныя партызанскія аркестры. Іх склад у многім залежаў ад наяўнасці музычных інструментаў, якія час ад часу ўдавалася раздабыць у час баёў з немцамі.

Больш за ўсё партызанскія мастацкія калектывы ствараліся ў цэнтральных і ўсходніх рэгіёнах Беларусі. У заходніх абласцях рэспублікі, дзе савецкая ўлада ўсталявалася толькі перад вайной, мастацкіх калектываў было менш. Але тут таксама меліся самадзейныя калектывы Пінскай партызанскай брыгады і брыгады імя Леніна Пінскай вобласці; брыгады імя Панамарэнкі, партызанскага атрада імя Калініна Брэсцкай вобласці; брыгад імя Жукава і імя Чапаева Беластоцкай вобласці; партызанскай брыгады 225 Палескай вобласці...

Кожны партызанскі артыст перш за ўсё лічыўся байцом. Усе ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці мелі асноўную вайсковую прафесію. Так, у Лідскім агіттэатры самадзейныя артысты Н. Пахомова і Н. Юдзінцава былі радысткамі, 16-гадовая Лёдзя Карповіч — баявой партызанкай, З. Лапідаў — падрыўніком, Ю. Мусаткін, К. Карповіч і Ю. Піліпаў — байцамі каменданцкага ўзвода, некалькі ўдзельніц былі медыцынскімі сёстрамі, Разанаў і Кізнер — супрацоўнікамі падпольнай друкарні.

У населеныя пункты, дзе выступала партызанская мастацкая самадзейнасць, па даносе фашысцкіх шпіёнаў нярэдка накіроўваліся ўзмоцненыя нарады немцаў і паліцаяў. Аднак населеныя пункты, у якіх арганізоўваліся канцэрты, надзейна ахоўваліся партызанамі, ды і самі артысты ўмелі не толькі спяваць і танцаваць... Так, падчас канцэрта ансамбля песні і танца партызанскай брыгады «Няўлоўныя» ў вёсцы Гліснаўка разведка данесла, што з нямецкага гарнізона Белае, рухаецца атрад фашыстаў для расправы з жыхарамі вёскі і «бандыцкімі музыкантамі». Разам з байцамі атрада Меркуля ў засаду пайшлі і ўдзельнікі ансамбля. Партызаны далі гітлераўцам такі «канцэрт», што яны хутка пабеглі назад, а многія назаўжды засталіся ахвярамі партызанскага «мастацтва».

Такім чынам, мастацкая самадзейная творчасць у гады вайны з'яўлялася ідэйнай зброяй у барацьбе з акупантамі, служыла яднанню партызан і насельніцтва рэспублікі, садзейнічала арганізацыі іх вольнага часу, падымала баявы дух народных мсціўцаў. Пра яе трывалае месца ў партызанскім жыцці красамоўна сведчаць таксама і своеасаблівыя абменныя канцэрты і сумесныя вечары самадзейнасці беларускіх партызан з украінскімі. Шмат хто і сёння з беларусаў-удзельнікаў партызанскага руху памятае выступленні мастацкіх калектываў украінскіх партызан са злучэнняў С. Каўпака, А. Фёдарава і П. Вяршыгары.

Аляксандр ПАЦЫЕНКА,
Святлана ПАЦЫЕНКА

На здымках: запрашальны білет на святочны спектакль Лідскага агіттэатра; канцэртная афіша ансамбля 760-га партызанскага палка; старонка з дзённіка мастацкага кіраўніка агітатрада імя М. Горкага А. Мікалаева.

Пайшоў з жыцця вядомы фатограф і журналіст Аляксандр Дзітлаў. Ён не дажыў да 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ўсяго адзінаццаць дзён. Гэта чалавек, які прайшоў вайну ад пачатку да канца з аўтаматам Калашнікава і фотаапаратам "ФЭД" на грудзях... Вызваляў Беларусь, салютаваў перамогу ў Берліне. Пасля вайны вярнуўся ў Мінск. Працаваў у БелТА. Быў адным з заснавальнікаў часопіса "Маладосць". Аляксандр Сяргеевіч — аўтар цэлага шэрага дакументальных кінастужак. Наогул быў па жыцці няўрымслівым і бескарыслівым. У свой час вёў на БТ такія папулярныя тэлеперадачы, як "Вецер вандраванняў" і "Клуб "Спектр". Агулам пра яго захапленні можна распавядаць доўга. А па натуры ён быў чалавекам з прыроджанай інтэлігентнасцю, сціплым і працалюбівым. Аляксандр Дзітлаў пражыў 97 гадоў і пакінуў пасля сябе не адну сотню фотаздымкаў і артыкулаў, кінафільмы і тэлеперадачы. "Самы здымаючы сярод пішучых. І самы пішучы сярод здымаючых", — казалі пра яго калегі-журналісты. З прэсай ён супрацоўнічаў — цяжка паверыць — да 1995 года. Такі быў Чалавек. Такім ён у нашай памяці і застанецца.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае свае спачуванні родным і блізкім Аляксандра Дзітлава. Светлая памяць пра яго застанецца з намі назаўсёды.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырае спачуванне дырэктару "Выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" Таццяне Бяловай у сувязі са смерцю брата — УЛАДЗІМІРА.

Выклік, агонь і задор

Глеба ў вёсцы не вызначалася асаблівай урадлівасцю, дзернавая, дзёрн, адсюль і назва вёскі — Дзернавая, а проста ў размове называлі яе Дзярнавухай. Сям'я Трафіма і Ефрасінні Бядуліных была вялікая — пяцёра дзяцей: Лізавета, Фёдар, Алена, Пятрусь і Марыя. Прозвішча Бядулін паходзіць ад слова "бяда, бядуля", што гаворыць аб гаротным стане роду. Працавалі і на сябе, і на пані Мядзведскую ў вёсцы Дубраўка, дзе парабчанкай была маці. Сын Пятрусь нарадзіўся ў сям'і Бядуліных у 1912 годзе. Хлопчык быў гарэзлівым, дапытлівым, закончыў пачатковую школу ў вёсцы Горы. У сям'і і ў школе звярнулі ўвагу, што Пятрусь неяк лёгка і складна, прыгожа ў рыфму гаворыць, атрымліваецца смешна і весела.

20-я і 30-я бурлівыя гады XX стагоддзя — гады пабудовы новага грамадства, новага жыцця, новага свету — абудзілі мільёны людзей. Ліквідацыя непісьменнасці, камсамол, калектывізацыя, селькараўскі рух. Усё кіпела, бурліла, мянялася. У гэтым віры расцвіла творчая, таленавітая, самабытная паэзія Петруся Бядуліна. Яго вершы друкуюцца ў раённай, абласной і рэспубліканскіх газетах, нават у школьных падручніках.

Аб яго вершах цёпла адгукаліся Янка Купала, іншыя вядомыя ў той час паэты. Калі Петрусю споўнілася 20 гадоў, у 1932 годзе, першы рэдактар раённай газеты "Чырвоны сцяг" Пётр Васілеўскі запрашае яго на працу ў рэдакцыю. У "Чырвоным сцягу" № 1 ад 12 сакавіка 1932 года змешчаны верш Петруся Бядуліна "Маладая вёска". Вершы "Наша Верка-піянерка" і "Ідуць масы ў калгасы" былі змешчаны ў чытанках для вучняў пачатковай школы. Верш "Наша Верка-піянерка" быў прысвечаны канкрэтнай асобе — Веры Сарвілінай, якая пасля стала настаўніцай, жыла і працавала ў Мінску, а яе брат Рыгор Сарвілін да Вялікай Айчыннай вайны працаваў у рэдакцыі райгазеты. Ды і Пятрусь быў не раўнадушны да Веры, але штосьці ў іх не склалася. Асобныя радкі верша і сёння помняць у Дзернавой:

Яе вочкі-вугалёчкі
Як зараначкі гараць.
Яна любіць громка ў клубе
Цёткам лемантар чытаць.
Цёткі, добрыя суседкі,
Знімуць хусткі з галавы:
— Наша Верка, піянерка,
Як вучоная з Масквы!

Нельга ўстрымацца, каб не працытаваць вельмі адметныя ўспаміны Аляксея Пысіна ("Магілёўская праўда", 1977 год, 16 ліпеня): "Хрэстаматыйныя вершы Купалы і Коласа, Міхася Чарота і Андрэя Александровіча, Кандрата Крапівы і Паўлюка Труса...Гэтых паэтаў я ніяк не мог уявіць жывымі людзьмі, яны былі авеяны нейкая таямнічасцю і нават недасягальнасцю. Здавалася, такіх людзей можна бачыць толькі ў кніжцы, на партрэце. І раптам новае для мяне імя — Пятрусь Бядулін. І — незвычайнае адкрыццё: паэт з нашага Краснапольскага раёна, а дакладней — з вёскі Дзернавая. І жыве ён не ў Мінску, а ў Краснаполлі, працуе ў раённай газеце. А вось вершы яго друкуюцца ў Мінску, у раённай газеце, кажуць, былі нават у школьнай чытанцы. І мне на той час здавалася, што ніколькі яны не горшыя тых, хрэстаматыйных: простыя, зразумелыя, адразу запамінаюцца; галоўнае — вершы аб тым, чым жыве наша вёска, з усімі яе турботамі і трывогамі, з марай аб лепшай будучыні.

Петруся Бядуліна я ўжо мог уявіць. Вядома, ён камсамолец, баявы, бадзёры, смелы. Часта бывае ў вёсцы, праводзіць сходы моладзі. Добра выступае. А ноччу, калі ўсе спяць, ён піша, бо днём няма ў яго на гэта часу. І ў чымсьці ён, відаць, падобны на Паўлюка Труса. Бо вершы яго таксама хвалююць, заклікаюць, вядуць уперад. І хочацца зрабіць нешта важнае, можа, нават гераічнае. У самым пачатку калектывізацыі вясковая моладзь, якая была ў першых радах барацьбітоў за новае жыццё, падхапіла як заклік, як прысягу радкі Петруся Бядуліна:

Ідуць масы ў калгасы
Грамадою.
Час расстацца,
Развітацца
Нам з бядою.
Усё старое
Ды гнілое
Мы зруйнуем.
Маладое, агнявое
Пабудуем.

Гэтае "маладое, агнявое" прабівала сабе дарогу ў будучыню. Складваліся новыя адносіны паміж людзьмі. Учарашнія непісьменныя сялянкі, у якіх вякамі была дарога "ад печы да парога", ахвотна наведвалі лікпункт, які расшыфроўваўся як пункт ліквідацыі непісьменнасці. Станавіліся яны ўдарніцамі 1-ай пяцігодкі і за гэта ім была ўсеагульная пашана. І новая сацыялістычная ява паўставала ў яркім паэтычным адлюстраванні Петруся Бядуліна.

Аднойчы і я панёс у рэдакцыю свой верш. Прысвячаўся ён падзеям у Іспаніі, дзе ішла вайна супраць іспанскага і міжнароднага фашызму. Пераступіў парог драўлянага памяшкання рэдакцыі, прывітаўся. І прызнаўся, што напісаў верш. "Гэта да цябе, Пятрусь!" — гукнуў нехта з супрацоўнікаў рэдакцыі. Пятрусь Бядулін узняўся з-за стала і пайшоў мне насустрач. Узяў верш і прачытаў стоячы. Быў ён сярэдняга росту, хударлявы і, як здалося мне, занадта сур'ёзны. Перш за ўсё не спадабаўся яму рытм вершаванага радка — класічны ямб. "Там гінуць людзі, — сказаў ён, — а ў цябе такая музыка, што хоць у скокі пускайся". І яшчэ былі заўвагі. Верш быў адхілены. Ды я не пакрыўдзіўся. Што я, вучань вясковай сямігодкі, мог ведаць тады пра Іспанію, пра тое, што там адбываецца. Гэта было маё першае знаёмства з Петрусём Бядуліным і, на жаль, адзіная сустрэча з ім, 17-гадовым юнаком паехаў я ў Мінск вучыцца на журналіста. Прыязджаючы на канікулы, даведаўся, што Пятрусь Бядулін працуе сакратаром рэдакцыі ў Чэрыкаве".

У 1936 годзе Пятрусь Бядулін служыў у Чырвонай Арміі ў Віцебску. Сувязей з рэдакцыямі газет не перапыняў. Так, да прыкладу, 21 ліпеня 1936 года ён дасылае ў газету "Чырвоная змена" адметны матэрыял "Мне крыўдна за вас, таварышы". Допісам у "Чырвоную змену" Пятрусь заклікаў камсамольцаў Краснапольшчыны актыўна ўмешвацца ў жыццё. Ён як былы член Краснапольскай камсамольскай арганізацыі папракаў іх за неарганізаванасць, за дрэнную працу з несаюзнай моладдзю, за слабае ўкараненне стаханаўскіх метадаў работы, за невыкананне норм выпрацоўкі...

У арміі П. Бядулін узначаліў камсамольскую арганізацыю роты, 75 працэнтаў якой былі камсамольцы, меў выдатныя паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. З Віцебска Пятрусь Бядулін вярнуўся летам 1937 года і пачаў працаваць у Крычаўскай раённай газеце. Ён многа ездзіў па раёне, прымаў удзел у розных мерапрыемствах.

У 1939 годзе Пятрусь працуе ў Чэрыкаўскай раённай газеце, жэніцца. Але праз паўгода яго прызываюць у армію. Удзельнічае ў вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь. Высылае здымак бацькам. На фота — трое вяскоўцаў. Пятрусь Бядулін пасярэдзіне ў гімнасцёрцы з чыстымі пятліцамі, радавы, на нагах чаравікі з абмоткамі. На адвароце фота надпіс: "На памяць бацьку і маці ад сына Пятра Бядуліна. Беларускі фронт. Станцыя Стоўбцы, 1.XII.1939 г.".

Пасля вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь Пятрусь Бядулін накіраваны на фінскі фронт. 10 сакавіка 1940 года быў цяжкапаранены і адпраўлены ў шпіталь горада Пскова, дзе і памёр ад ран. Пра гэта паведаміў яго баявы таварыш.

Так згасла жыццё нашага краснапольскага таленавітага паэта. На жаль, яго спадчына, рукапісы, допісы, вершы загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Памяць пра яго жыве ва ўзгадках А. Пысіна, С. Церахава, С. Сямёнава, М. Карпечанкі, А. Ярохін — былых супрацоўнікаў рэдакцыі газеты "Чырвоны сцяг". Ды мемарыяльная дошка на будынку рэдакцыі — дань памяці журналістам, якія загінулі ў гады вайны.

Хочацца верыць, што на Краснапольшчыне знойдзецца рупліўца і па архівах раённых газет Краснаполля, Чэрыкава, Крычава, рэспубліканскай "Чырвонай змены" адшукае паэтычныя і публіцыстычныя творы Петруся Бядуліна. Вельмі годна было б, каб да 100-годдзя з дня нараджэння таленавітага краснапольца пабачыў свет зборнік ягоных твораў.

Аляксандр МАРЗАЛЮК,
Фёдар ГАНЧАРОЎ

Без Алега Лойкі ў Слоніме сумна

Першамай Алег Лойка любіў сустракаць у Слоніме. З вялікіх вандровак і гарадоў на Першамай ён спяшаўся дамоў, у родны Слонім — спрадвечны, як паэт казаў, горад над Шчарай. "Мае першыя святло, прастор і любоў — Слонім", — пісаў Алег Антонавіч. Найпрыгажэйшы для Алега Лойкі Слонім быў менавіта на Першамай, можа з-за таго, што ён нарадзіўся тут 1 мая. І сёлета яму было б 78. І мы зноў сустрэліся б за святочным сталом, і зноў віншавалі б яго з днём нараджэння, жадаючы плёну, здароўя і натхнення. Але гэты Першамай за апошнія дзесяцігоддзі ў Слоніме быў без нашага дарагога і шаноўнага Алега Антонавіча...

Першамай у Слоніме — ды без Алега Лойкі... Гэта ўжо не Першамай... Гэта зусім іншае свята, без настрою і без квецені.

Ён марыў вярнуцца ў Слонім. І калі такая нагода надарылася, ён прыехаў на радзіму, прыехаў, каб застацца тут назаўсёды. Ён цяжка хварэў. Але боль мужна цярпеў, працаваў да апошніх дзён свайго жыцця, шмат пісаў, друкаваўся. У Слонімскай друкарні мы паспелі выдаць яго цудоўныя і вельмі важныя кнігі: зборнік вершаў "Неўміручасць", кнігу паэзіі "Ушанаванне", кнігу лёсаў "Галгофа", кнігу аднаго лёсу "Дрэва жыцця" і іншыя. Нават у назвах ягоных кніг адчувалася шчымлівае развітанне з гэтым светам, з людзьмі, якія яго ведалі, з бацькоўскай зямлёй. Але мы будзем доўга памятаць пра Алега Лойку, бо пасаджанае ім дрэва жыцця ў Беларусі будзе расці і расці стагоддзямі.

Калі Алег Лойка жыў у Слоніме ў цешчынай хаце на Віленскай вуліцы,

я там часта бываў. Гутаркі з ім — мой другі універсітэт. Мы разам агледзелі па-новаму ўсю гісторыю Беларусі, літаратуры, культуры, абмеркавалі грамадска-палітычнае развіццё нашай Бацькаўшчыны. Але найбольш Алег Антонавіч любіў распавядаць пра Францыска Скарыну, Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Пра іх ён ведаў амаль усё. У 1982 годзе ў Маскве ў серыі "ЖЗЛ" выйшла яго кніга пра Янку Купалу. Я быў тады студэнтам і добра памятаю, які рэзананс у Беларусі выклікала гэта кніга. Да яго нікому з беларусаў не ўдавалася ў вядомай рускай серыі "Жизнь замечательных людей", заснаванай Максімам Горкім ажно ў 1933 годзе, выдаць кнігу пра беларуса. Беларусу — пра беларуса. Алегу Лойку ўдалося. Пра гэта выданне напісалі ўсе газеты і часопісы Беларусі, адбыліся навуковыя канферэнцыі, прэзентацыі, сустрэчы з чытачамі. Кнігу немагчыма было нідзе купіць, чытачы пыталіся ў аўтара, званілі яму, пісалі.

Янка Купала ніколі не прыносіў сам вершаў у рэдакцыі газет і часопісаў. І ніколі сам не браў ганарараў. Пра гэта я таксама даведаўся ад Алега Лойкі. Усё за паэта рабіла Уладзіслава Францаўна. У рэдакцыі ён заходзіў проста пагутарыць, пасядзець, распытаць у літаратараў і журналістаў пра жыццё-быццё. Вакол Купалы адразу збіраўся гурт хлопцаў і дзяўчат. Тады ён казаў ім: "То, можа, сходзім ды хоць па куфлю піва вып'ем? А то вы нешта тут вельмі зашчыраваліся...".

Янка Купала і Якуб Колас былі сябрамі. Хаця паміж імі здаралася рознае. Жонка Якуба Коласа Марыя Дзмітрыеўна была даволі багатай жанчынай, ідэальнай, інтэлігентнай мяшчанкай, вельмі выхаванай, хатняй, адданай мужу. Яна кахала Якуба Коласа. І Якуб Колас яе кахаў. Але падчас вайны, калі пясняр апынуўся ў Ташкенце, ён моцна закахаўся ў перакладчыцу Сомаву з Санкт-Пецярбурга. Колас прысвяціў ёй цэлы цыкл вершаў "Ташкенцкая торба". Гэты цыкл не апублікаваны да сённяшніх дзён; толькі пара вершаў трапіла ў друк...

Такіх прыкладаў і аповедаў, пачутых ад Алега Лойкі, я магу прыгадаць шмат. Ды і кніг пры жыцці ён напісаў і выдаў больш як сотню. І кнігі гэтыя самыя розныя: паэзія, крытыка, пераклады, літаратуразнаўчыя даследаванні, падручнікі. Божа мой, калі ж ён паспяваў усё рабіць, дзе знаходзіў час і сілы?!

Яго не стала летась у лістападзе. Не стала самага знакамітага слонімца пачатку XXI стагоддзя. З ім развіталася Беларусь і родны Слонім:

О, Слоніме, — душы маёй імша,

Тут, нарадзіўшыся пяе мая душа,
Ну, а калі мае суцішацца далоні,
Прашу, прымі іх слонімскае ўлонне!..

Слонімскае ўлонне прыняло Алега Лойку. Але сам Слонім без яго апусцеў, ачарсцвеў, асірацеў. Без Алега Лойкі ў Слоніме стала сумна, сумна без яго было і на Першамай, які ён любіў, як само жыццё і сваю Беларусь.

Сяргей ЧЫГРЫН

На здымку: Алег Лойка на беразе Шчары.

Фота аўтара

І мастацтва ваявала

Беларускія мастакі паспелі эвакуіравацца ў савецкі тыл і працягвалі там змагацца з ворагам сваёй зброяй. У выяўленчым мастацтве перыяду Вялікай Айчыннай вайны найбольш папулярным быў плакат. У жанрах плаката, а таксама карыкатуры, сатырычнага малюнка працавалі мастакі І. Ахрэмчык, П. Гаўрыленка, Я. Зайцаў ды іншыя. З першых дзён вайны пачалі выходзіць газета-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну» і сатырычнае выданне «Партызанская дубінка». Беларускія мастакі бралі ўдзел у выставах, якія арганізоўваліся творчымі саюзамі брацкіх рэспублік. Так, у 1941 годзе яны ўдзельнічалі ў выставе «Мастакі Куйбышава ў дні Вялікай Айчыннай вайны», у 1942 годзе — у выставах «Мастакі Сібіры» і «Мастакі Свярдлоўска», у 1943 годзе — у выставе «Тыл і фронт» у Траццякоўскай галерэі (Масква) і іншых.

Партызаны-мастакі М. Абрыньба і М. Гуціеў.

На акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Беларусі прафесійных мастакоў не засталося. Іх ролю выконвалі аматары. У выяўленчым мастацтве тут найбольш распаўсюджанымі формамі сталі лозунгі, плакаты, заклікі, карыкатуры, ілюстрацыі ў падпольных газетах і рукапісных часопісах.

Лозунгі з'яўляліся аператыўным відам агітацыі, якія ў лаканічнай форме ўтрымлівалі заклікі, адрасаваныя дзяржавай партызанам і насельніцтву акупіраванай тэрыторыі. Звычайна іх вывешвалі ў дні дзяржаўных свят і знамянальных дат. Так, партызаны гомельскага атрада «Балышавік», даведаўшыся, што 7 лістапада 1941 года ў Маскве адбыўся вайсковы парад, надрукавалі і распаўсюдзілі ў навакольных населеных пунктах лістоўкі, а на чарнігаўскай шашы вывесілі лозунг «Смерць нямецкім акупантам!». Узрушвае і, напрыклад, наступны факт. Восенню 1942 года група партызан атрада імя С.Кірава (Брэсцкая вобласць) захапіла ў фашыстаў цягнік з нарабаваным дабром. Партызаны прымацавалі да вагонаў чырвоныя лозунгі з тэкстамі: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», «Раздавім фашысцкую гадзіну!». Над паравозам умацавалі чырвоны сцяг. Некалькі гадзін працягваўся гэты рэйд у тыле ворага. На паўстанках партызаны спыняліся, праводзілі мітынгі, заклікалі насельніцтва ўступаць у партызаны, раздавалі сялянам мяшкі з зернем.

Напісаныя на тканіне, паперы ці дошчачках, лозунгі часта вывешваліся на скрыжаваннях дарог або ў населеных пунктах, якія знаходзіліся ў партызанскіх краях і зонах. Тэксты былі лаканічнымі, выразнымі: «Стой! Што ты зрабіў для хутчэйшага разгрому фашыстаў?», «Што ты зрабіў для сваёй Радзімы?», «Чаму ты яшчэ не ў партызанах?» і інш. Антыфашысцкія лозунгі рэгулярна распаўсюджваліся нават у многіх населеных пунктах, у якіх размяшчаліся варожыя гарнізоны.

У культурна-дасугавай рабоце партызаны выкарыстоўвалі і перасоўную наглядную агітацыю. Пасля разгрому фашысцкіх войск пад Сталінградам удзельнікі агітацыйна-мастацкай брыгады штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці зрабілі чучала Гітлера і вазілі яго па вёсках. За гэтым гітлерам хадзіла шмат народу. Людзі смяяліся, трымаючыся за жываты. Агітпавозкі з чучалам Гітлера выкарыстоўвалі партызаны Акцябрскага, Асіповіцкага і іншых раёнаў.

Вялікай папулярнасцю сярод партызан і насельніцтва рэспублікі карысталіся плакаты. Тэмамі для плакатаў нярэдка служылі мясцовыя факты. Так, летам 1943 года фашысты арганізавалі карную экспедыцыю супраць партызан Лепельскай зоны. Пасля зняцця блакады, у сваім друку і па радыё яны выхваляліся поўным знішчэннем народных мсціўцаў. У адказ на хлусню ворага партызаны вырашылі ўзмацніць баявыя дзеянні. У ноч на 25 ліпеня 1943 года шэсць брыгад партызанскай зоны нанеслі адначасовы ўдар па ворагу, у выніку якога разгрымелі некалькі варожых гарнізонаў, узарвалі 3 масты, вялікую колькасць чыгуначных рэльсаў, знішчыўшы пры гэтым каля сотні ворагаў. З нагоды гэтай аперацыі партызанскі мастак М. Гуціеў намаляваў плакат, на якім была выява партызана з аўтаматам на фоне разгромленых фашысцкіх гарнізонаў. Надпіс на плакаце папярэджваў: "Білі, б'ём і будзем біць!"



У ноч на 25 ліпеня 1943 года шэсць брыгад Лепельскай партызанскай зоны нанеслі адначасовы ўдар па ворагу, у выніку якога разгрымелі некалькі варожых гарнізонаў, узарвалі 3 масты, вялікую колькасць чыгуначных рэльсаў, знішчыўшы пры гэтым каля сотні ворагаў. З нагоды гэтай аперацыі партызанскі мастак М. Гуціеў намаляваў плакат, на якім была выява партызана з аўтаматам на фоне разгромленых фашысцкіх гарнізонаў, узарвалі 3 масты, вялікую колькасць чыгуначных рэльсаў, знішчыўшы пры гэтым каля сотні ворагаў. З нагоды гэтай аперацыі партызанскі мастак М. Гуціеў намаляваў плакат, на якім была выява партызана з аўтаматам на фоне разгромленых фашысцкіх гарнізонаў. Надпіс на плакаце папярэджваў: "Білі, б'ём і будзем біць!"

Шырокае распаўсюджванне атрымалі сатырычныя плакаты, на вастрыё якіх траплялі верхаводы гітлераўскай Германіі, «непераможныя» фашысцкія ваякі і іх саўдзельнікі. Шмат такіх плакатаў выканаў сакратар Вілейскага абкама камсамола В. Шымановіч. З дапамогай падпольшчыкаў яго плакаты траплялі ў Вілейку, Маладзечна, Мядзел і іншыя населеныя пункты, дзе размяшчаліся варожыя гарнізоны.

Былы студэнт Маскоўскага паліграфічнага інстытута, партызан брыгады «Дубава» М. Гуціеў за гады вайны зрабіў каля 300 плакатаў. Лязом брытвы ён выразаў на гумне клішэ гравюр і перадаваў іх у рэдакцыю Лепельскай падпольнай раённай газеты «Калгасная праўда». З дапамогай ручнога станка супрацоўнікі друкарні выпускалі плакаты тыражом да 300 экземпляраў.

Сатырычныя плакаты малявалі партызаны А. Козел і У. Юдчыц з атрада імя С. Кірава Брэсцкага злучэння, падпольшчыкі У. Ясюковіч і С. Татун з вёскі Крывое Вілейскай вобласці. Каб плакаты віселі больш працяглы час, партызаны часам мініравалі іх.

Прафесійныя і самадзейныя партызанскія мастакі стварылі цэлыя летапісы гераічных спраў народных мсціўцаў. У партызанскіх рукапісных часопісах, насценных газетах, на лістах паперы, кавалках бяросты яны малявалі карціны баявых дзеянняў і побыту партызан, злачынствы фашысцкіх акупантаў на беларускай зямлі, партрэты лепшых партызан. У атрадах і злучэннях народных мсціўцаў права быць намаляваным на карціне лічылася высокай узнагародай. Яе атрымлівалі толькі байцы, якія вызначыліся ў баях з акупантамі. Так, напрыклад, было ў партызан Полацка-Лепельскай зоны. Мастак брыгады «Дубава» М. Абрыньба напісаў карціну «Выезд партызанскай брыгады на заданне», на якой было намалявана 50 лепшых байцоў і камандзіраў брыгады. Паказальна, што партызаны гэтай брыгады для работ М. Абрыньбы і М. Гуціева зрабілі спецыяльную зямлянку, якую назвалі «карціннай галерэяй». У ёй знаходзіліся плакаты і карціны. Сярод іх «На задание», «Первый подвиг», «После ухода немцев», «Партизанская засада», «Фашисты прошли» і інш. Паглядзець выставу прыходзілі партызаны не толькі сваёй брыгады, але і суседніх.

У Гомельскай вобласці летам 1944 года 8-я Рагачоўская партызанская брыгада адзначала свой двухгадовы юбілей. Да гэтай падзеі выставу сваіх работ арганізаваў партызанскі мастак С.Раманаў. Аб памяшканні нельга было і думаць, заказаць стэнд таксама не было магчымасці. Шукаючы выйсце, мастак нарэзаў лазовых пруткоў, расшчапіў іх, устанавіў у расшчэліны малюнкі і развесіў іх на дрэвах. Ад лёгкага ветрыка ўся кампазіцыя калыхалася, а вакол — узброеныя людзі ўважліва ўглядаліся ў малюнкі. Гэта была першая «персанальная» выстава маладога мастака.

Пры адсутнасці ў партызан фота- і кінааапаратуры замалёўкі і накіды, зробленыя з натуры партызанскімі мастакамі, з'явіліся своеасаблівымі дакументамі, якія адлюстравалі дзейнасць народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Святлана ВАСІЛЕЎСКАЯ

Спектакль па аповесці

Згадваю сваё дзяцінства. У мяне было наіўнае ўяўленне пра Вялікую Айчынную вайну. Мы, вясковыя хлапчукі, гулялі ў вайну, выраблялі драўляную зброю, дзяліліся на атрады ўмоўна рускіх і немцаў і за вёскай у лесе ўвасаблялі баявую дзею, пры гэтым стараліся напоўніць сябе ваяўнічым духам і выглядам. Але сапраўдны жахлівы твар вайны мы, дзеці-падлеткі, не ўяўлялі. Жыццёвыя жахлівапакутныя гады вайны зведалі мае родныя. Тата — Фёдар Макарцоў крочыў франтавымі шляхамі праз усю вайну, дайшоў да Берліна, вярнуўся з ордэнам, медалямі і з куляй у руцэ. Мама — Яўгенія Макарцова з малымі дзецьмі, маімі старэйшымі братамі і сястрой, вынесла найцяжэйшыя выпрабаванні фашысцкай акупацыі.

Трагічны лёс напаткаў вёску Уюн, што на Быхаўшчыне. Паводле расказаў маёй маці, вёска ледзь не раздзяліла лёс вогненных вёсак Быхаўшчыны, якія цалкам згарэлі разам са сваімі людзьмі. І толькі своечасовае папярэджанне аднаго з партызан паспрыяла таму, што мае аднавяскоўцы выратаваліся. Калі паказаліся захопнікі з боку Быхава і пачалася страляніна, уюноўцы пакідалі хаты і пабеглі ў лес, прыхопліваючы з сабою харчаванне, жыўнасць, адзенне. Перабегшы рачулку Уюнок, аднавяскоўцы стаялі на ўзлеску і нема глядзелі, як гарэлі іх хаты, падворкі, гарэла ўся вёска. Яны плакалі, на іх вачах знішчалася вогнішчам усё нажытае. Гарэў іх родны кут.

Зведалі ўюноўцы нямала гора за працяглы тэрмін жыцця ў лясных буданах. Але мінула ліхалецце, яны вярнуліся на свае папялішчы, адбудоўваліся, хаця вайна яшчэ доўга страляла ў іх сэрцы і душы. Дзеці-падлеткі ўзрываліся на мінах, калечыліся. Аднак ішлі гады, вёска залечвала раны. Нараджаліся дзеці.

Выбраўшы творчую пуцявіну ў сваім жыцці і пачуўшы матулін аповед пра сваю вёску, я ўзяўся за пастаноўку спектакля паводле дакументальнай аповесці А. Адамовіча, Я. Брыля, Ул. Калесніка "Я з вогненнай вескі..." Мною як рэжысёрам спектакль быў увасоблены ў Гомелі, з часу прэм'еры прайшло амаль трыццаць год. Спектакль вялікае ўздзеянне аказваў на гледача, бо ў ім была занята не толькі вялікая колькасць выканаўцаў, але і непасрэдных сведкаў жудасных злачынстваў нямецкіх акупантаў.

Пастаўлены мною спектакль паводле дакументальнай аповесці "Я з вогненнай вёскі..." ухвалілі аўтары, якіх ужо, на жаль, няма сярод нас. Іван Антонавіч Брыль раіў "пракатаць" спектакль па ўсёй Беларусі. Каб ніколі, ніколі ў віхуры вайны і пажараў жыццё не ўмірала. Але жаданне аўтараў выканаць было складана, бо спектакль быў насычаны вялікай колькасцю выканаўцаў, таму быў "невыязным".

Няхай жа заўсёды над Беларуссю небасхіл застаецца блакітным і цёмныя хмары вайны ніколі не засцілаюць нашы вёскі і гарады.

Мікола МАКАРЦОЎ,
рэжысёр

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3339
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 24.06.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3325

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686